ARCHE Зьмест № 6’2000 СКАРЫНА

1. Зьмест / Уводзіны
2. Ежы Гедройц. ARCHE 6(11)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Адышоў у вечнасьць мянчук, ліцьвін, паводле нараджэньня і пранесеных праз усё жыцьцё сымпатыяў. Будучы цэнтральнай фігурай польскай інтэлектуальнай сцэны XX стагодзьдзя, Гедройц стаўся сымбалем культурнага супраціву агрэсіі звонку. Ён паказаў, што і як трэба рабіць, калі ратунку, здаецца, ужо няма..."
3. Найноўшая гісторыя яцвягаў. Андрэй Дынько у ARCHE 6(11)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Спроба стварыць літаратурную заходнепалескую мову на аснове гаворак Берасцейшчыны й Піншчыны, а таксама дабіцца прызнання насельніцтва гэтых рэгіёнаў асобным народам была зробленая ў 1985-1996 гадах Міколам Шэляговічам і групай маладой інтэлігенцыі - выхадцамі з паўднёвага захаду Беларусі..."
4. Поўны не акадэмічны. Анатоль Сідарэвіч у ARCHE 6(11)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Поўны збор Купалавых твораў, спатрэбілася чакаць 50 гадоў пасля панамарэнкаўскае пастановы. Да гэтага часу такіх выданняў — поўных збораў твораў каго-небудзь з беларускіх пісьменнікаў — у нас не было..."
5. Як я не сустрэлася з Асланам Масхадавым. Тацяна Снітко ў ARCHE 6(11)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...— Лукашэнка не дасць за мяне і капейкі выкупу… Мае спадарожнікі ў машыне маўчаць, але, як відаць у люстэрку, яны злёгку па-крыўджаныя жартам..."
6. Інтэграцыйная стратэгія Лукашэнкі. Жан-Шарль Ляльман у ARCHE 6(11)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...У красавіку 1999 году, калі NATO ўмяшалася ў югаслаўскія падзеі, плян ператварэньня „саюзу дзьвюх“ у „саюз трох“ выношвалі

маскоўскія палітыкі (прэзыдэнт Ельцын, мэр Масквы Лужкоў, камуністы і Ўладзімер Жырыноўскі). Праект далучэньня Сэрбіі-Югаславіі быў амаль аднадушна падтрыманы расійскай Думай, беларускай палатай прадстаўнікоў, а таксама югаслаўскімі дэпутатамі ў бамбардаваным Бялградзе..."

7. Крэалізаваны прадукт. Генадзь Цыхун у ARCHE 6(11)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Першасны сэнс слова „трасянка“ многія забыліся, яно ўжо патрабуе разгорнутых тлумачэнняў, як, напрыклад, у каментары да „Трасянка–беларуска–рускага слоўніка“, што пачала друкаваць..."
8. Паляваньне на клясыкаў. Андрэй Хадановіч у ARCHE 6(11)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Калі гэты тэкст толькі пісаўся, аўтару вельмі хацелася назваць яго „Бляск ды мізэрнасьць беларускага перакладу“. Алюзія на бальзакаўскае „Бляск ды мізэрнасьць куртызанак“ падавалася яму слушнаю, бо праца перакладчыка напраўду мае шмат супольнага з найстаражытнейшай у сьвеце прафэсіяй..."
9. Чырвоны казуркаед. Андрэй Скурко ў ARCHE 6(11)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Найгалоўнай татэмнай жывёлінай беларускага сьмехавага дыскурсу, безумоўна, зьяўляецца „Вожык“. Ён у(ва)ліўся ў стройныя шэрагі іншых гэткага ж кшталту „Кракадзілаў“ ды „Пэрцаў“ напрыканцы вайны і, трэба сказаць, дробным драпежнікам атраду казуркаедаў стаўся не адразу..."
10. Дубавец і Ластоўскі. Павал Абрамовіч у ARCHE 6(11)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Са старонак газеты дыскусія перакінулася на іншыя выданні. Удзел у ёй узялі Мечыслаў Бабровіч, Максім Багдановіч, Змітрок Бядуля, Максім Гарэцкі. Асоба ж першага апанента Ластоўскага, які схаваўся пад псеўданімам „Адзін з парнаснікаў“, не выяўлена. Гэта мог быць або Янка Купала, або..."
11. Анталёгія з прыкметамі мафіёзнасьці. Віктар Мухін у ARCHE 6(11)-2000. ARCHE-Skaryna: Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі. "...Калі я думаю пра Беларусь, дык думаю пра яе, як пра зямлю - ад Вільні да Пінску, ад

Беластоку да Смаленску (няхай Дзяржаўны камітэт у справах друку не падкопваецца), калі я думаю пра Рэспубліку Беларусь, дык думаю пра недаразьвітую форму нацыянальнае дзяржаўнасьці, гэткі гот-дог - маскоўскую сасіску ў беларускай булачцы..."

Андрэй Дынько

[image]

Найноўшая гісторыя яцвягаў

A R C H E Skarynа № 6 (11) – 2000

„…Спроба стварыць літаратурную заходнепалескую мову на аснове гаворак Берасцейшчыны й Піншчыны, а таксама дабіцца прызнання насельніцтва гэтых рэгіёнаў асобным народам была зробленая ў 1985–1996 гадах Міколам Шэлягові чам і групай маладой інтэлігенцыі — выхадцамі з паўднёвага захаду Беларусі…“

[image] [image] [image] [image] [image] [image]

Анатоль Сідарэвіч

Поўны не акадэмічны

[image] [image] [image]

Зьмест

Сідарэвіч • Сідарэвіч • 2000
аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

„…Поўны збор Купалавых твораў, спатрэбілася чакаць 50 гадоў пасля панамарэнкаўскае пастановы. Да гэтага часу такіх выданняў — поўных збораў твораў каго-небудзь з беларускіх пісьменнікаў — у нас не было…“

Тацяна Сьнітко

Як я не сустрэлася з Асланам Масхадавым

„…— Лукашэнка не дасць за мяне і капейкі выкупу… Мае спадарожнікі ў машыне маўчаць, але, як відаць у люстэрку, яны злёгку па-крыўджаныя жартам…“

Жан-Шарль Ляльман

Інтэграцыйная стратэгія Лукашэнкі

„…У красавіку 1999 году, калі NATO ўмяшалася ў югаслаўскія падзеі, плян ператварэньня „саюзу дзьвюх“ у „саюз трох“ выношвалі маскоўскія палітыкі (прэзыдэнт Ельцын, мэр Масквы Лужкоў, камуністы і Ўладзімер Жырыноўскі). Праект далучэньня Сэрбіі-Югаславіі быў амаль аднадушна падтрыманы расійскай Думай, беларускай палатай прадстаўнікоў, а таксама югаслаўскімі дэпутатамі ў бамбардаваным Бялградзе…“

Генадзь Цыхун

Крэалізаваны прадукт

„…Першасны сэнс слова „трасянка“ многія забыліся, яно ўжо патрабуе разгорнутых тлумачэнняў, як, напрыклад, у каментары да „Трасянка–беларуска–рускага слоўніка“, што пачала друкаваць…“

Андрэй Хадановіч

Паляваньне на клясыкаў

„Калі гэты тэкст толькі пісаўся, аўтару вельмі хацелася назваць яго „Бляск ды мізэрнасьць беларускага перакладу“. Алюзія на бальзакаўскае „Бляск ды мізэрнасьць куртызанак“ падавалася

яму слушнаю, бо праца перакладчыка напраўду мае шмат супольнага з найстаражытнейшай у сьвеце прафэсіяй…“

Андрэй Скурко

Чырвоны казуркаед

„Найгалоўнай татэмнай жывёлінай беларускага сьмехавага дыскурсу, безумоўна, зьяўляецца „Вожык“. Ён у(ва)ліўся ў стройныя шэрагі іншых гэткага ж кшталту „Кракадзілаў“ ды „Пэрцаў“ напрыканцы вайны і, трэба сказаць, дробным драпежнікам атраду казуркаедаў стаўся не адразу…“

Павал Абрамовіч

Дубавец і Ластоўскі

„…Са старонак газеты дыскусія перакінулася на іншыя выданні. Удзел у ёй узялі Мечыслаў Бабровіч, Максім Багдановіч, Змітрок Бядуля, Максім Гарэцкі. Асоба ж першага апанента Ластоўскага, які схаваўся пад псеўданімам „Адзін з парнаснікаў“, не выяўлена. Гэта мог быць або Янка Купала, або…“

Кнігі — Рэакцыі — Лісты ў рэдакцыю

Віктар Мухін **Анталёгія з прыкметамі мафіёзнасьці**

[image]
[image]

№ 6 (11) – 2000

Рэдакцыя: **anality ka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 23-03-2001
[image]

Ежы Гедройц (1905–2000)

Сьмерць Гедройца рэзкім болем згукнулася ў сэрцах беларускай інтэлігенцыі. Адышоў у вечнасьць мянчук, ліцьвін, паводле нараджэньня і пранесеных праз усё жыцьцё сымпатыяў. Будучы цэнтральнай фігурай польскай інтэлектуальнай сцэны XX стагодзьдзя, Гедройц стаўся сымбалем культурнага супраціву агрэсіі звонку. Ён паказаў, што і як трэба рабіць, калі ратунку, здаецца, ужо няма. Беларуская тэма прысутнічала на бачынах рэдагаванай ім „Kultury“ ад самога пачатку і да самога канца. Ня так даўно якраз ён сваім аўтарытэтам паспрыяў адкрыцьцю ў Беластоку катэдры беларускай культуры, а таксама зьяўленьню беларускага выпуску „Kultury“. У адным з інтэрвію, паказаных пасьля выхаду нумару па польскай тэлевізіі, Гедройц, памахваючы нумарам перад тэлекамэрай, казаў, што, калі такія рэчы ўдаюцца ў Менску, то трэба паспрыяць, каб іх было больш а больш.

Цяпер парыская „Kultura“ не выходзіць.

Ежы Гедройц больш не жыве.

Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Максім Капран
Апошняе абнаўленьне: **6-11-2000**
[image]

АНДРЭЙ ДЫНЬКО
перакладчык, публіцыст, дырэктар часопіса „ARCHE“.

Андрэй Дынько

Найноўшая гісторыя яцвягаў

Частка I. Стварэнне народу.
Няпоўная храналогія з каментарамі, цытатамі і замалёўкамі з натуры
1985 — першая адмысловая публікацыя на заходнепалескіх гаворках (часопіс „Беларусь“, 1985/12). Гэта была паэзія Міколы Шэляговіча, напісаная „белым вершам“, з прадмоваю да яе Івана Шамякіна („у асобе Міколы Шэляговіча мне бачыцца добры беларускі паэт, які і стаў то паэтам дзякуючы сваёй роднай гаворцы“). Надрукаваная яна была падвалам, і не менш сімвалічна, што побач на развароце другім падвалам, з прадмоваю Міхася Стральцова, былі апублікаваныя вершы будучага лідэра новай беларускай літаратуры Адама Глобуса, якія пазней увайшлі ў кнігу „Парк“. Затое зверху на абедзвюх старонках друкаваліся вершы Людмілы Пятруль і Яўгеніі Мальчэўскай. Наколькі ж неўміручае ўменне беларускіх рэдактараў тапіць самых перспектыўных творцаў!
1988 — утварэнне Грамадска-культурнага згуртавання

„Палесьсе“, першай адмысловай арганізацыі, якая прэтэндавала на выражэнне інтарэсаў усяго насельніцтва Берасцейшчыны й Піншчыны і ставіла на мэце аўтаномнае нацыянальна-культурнае будаўніцтва.
Міколу Шэляговічу, супрацоўніку ачольванага аграрыем Іванам Чыгрынавым Беларускага Фонду Культуры, гэтага фантасмагарычнага прытулку ціхіх нацыяналістаў, удалося калі не заангажаваць, дык прынамсі заінтрыгаваць вялізную частку менскай і берасцейскай інтэлігенцыі, прычым не толькі выхадцаў з Берасцейшчыны й Піншчыны. Перакладчык Васіль Сёмуха ўдзельнічаў ва ўстаноўчых паседжаннях „Палесься“, галоўны рэдактар выдавецтва „Мастацкая літаратура“ Міхал Дубянецкі паспеў паспрыяць узнікненню „Палесься“. Будучага дырэктара Беларускай службы Радыё Свабода, а тады журналіста „Звязды“ Аляксандра Лукашука выклікалі ў ЦК КПБ, патрабуючы з „Палесься“ выйсці. Празаік Аляксандр Трушко (Алесь Наварыч), цяперашні карэспандэнт *France Presse* Валер Каліноўскі і літаратарка „нашаніўскага прызыву“ Наталля Бабіна працавалі рэдактарамі газеты „Збудінне“, крытык „Мыхалко Тычына“ ахвяраваў на ягонае выданне 10 рублёў і вітаў узнікненне заходнепалескай літаратуры на Заходнепалескай (Яцвяжскай) навукова-практычнай канферэнцыі. Картограф Леў Казлоў і мовазнавец Хведар Клімчук бралі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы гэтай канфэрэнцыі. Філолаг Іван Лучыц-Федарэц і філосаф Георгі Антанюк падпісвалі звароты да ўраду за стварэнне сістэмы адукацыі на заходнепалескай мове. Культуролаг Енё Сінчук друкаваў свае філасофскія зацемкі, гарадзенскі гісторык Едрусь Мазько — вершы. Педагог-тэарэтык Сафрон Жлоба развіваў на старонках „Збудіння“ палескую тэорыю выхавання дзяцей, а педагог-практык Мікола Мынзар — вёў мілую дзіцячую старонку, у якасці ілюстрацый да якой друкаваліся здымкі дачок Шэляговіча.
Аформілася і супрацьлежная партыя. Лідэры Таварыства Беларускай Мовы Ніл Гілевіч, Яўген Цумараў і Алег Трусаў (вось дзе гняздо беларускага фундаменталізму) узначалілі фронт змагання супраць „яцвяжскага сепаратызму“ на старонках „ЛіМу“, „Нашага Слова“ і ў Вярхоўным Савеце, і „Збудінне“ кляйміла іх выступы як „провокашыны лытвынських шовыныстив“. Паэт Мікола Федзюкевіч усхвалявана выкрываў,

што ягоныя дарагічынскія дзядзькі яцвяжскай мовы не разумеюць і што „асаблівую насцярожанасць выклікалі ў палескіх хлебаробаў наступныя радкі:

А то бачыш ты,
пановыч:
„Нырозуме,
ныпрывык...“
Почытај, шо
Шыляговыч
Пышэ про
роднылj язык!..“
—

Гаворка ішла пра надрукаваны на палескай старонцы „Чырвонай змены“ патрыятычны верш „Дідова наука“ дырэктара вясковай школы з вёскі Чухава Пінскага раёну Валера Саланевіча.

Грошы, вялікія грошы, давалі дырэктар менскае „моторовыровыробныцi“ Канстанцін Устымчук і міністар „водогосподаркі“ Аляксей Шахновіч, дырэктар берасцейскае „летрыко-тыхныцькијі выробныцы“ Рыгор Шкурдай, дырэктар Бярозаўскае аграфірмы Іван Данілевіч, прэзыдэнт “лытвынсько-гамэрыцько-полецького супилного заклада „Ankor“” Іван Анташкевіч. Чаму давалі? На гэтае пытанне не так проста даць адказ. Можа дзеля гордасці сваёй малой радзімай, а можа дзеля загаду зверху.

Малады мастацтвазнаўца Сяргей Харэўскі вітаў выданне ў „Чырвонай змене“ („яно дапаможа нам раскрыць яшчэ не вядомыя нам галінкі славяншчыны“), гісторык і авантурыст Алег Дзярновіч надрукаваў артыкул у „Збудінні“. Журналіст Анатоль Казловіч выказваў шчырую падзяку „Балесам Поліська“ і „як паляшук, і як чалавек, што сваё жыццё звязаў са Словам“.

Алесь Разанаў рыхтаваўся стаць кіраўніком Беларускага таварыства Рэрыха (доля якога, як падаецца сёння, у шмат чым нагадвае лёс „Поліська“) і ўшанаваў сваёй прысутнасцю заходнепалескую вечарыну ў Доме літаратара. На пытанне ўзрушанай палескай актывісткі ён сказаў, што з выступоўцаў вылучыў бы маладога Наварыча й берасцейскага школьніка

Дынька, у якіх моцная энергетыка, толькі ў Наварыча — цёмная, а ў Дынька — светлая.

1989 — заснаванне газеты „Збудінне“, першага рэгулярнага выдання на заходнепалескай (яцвяжскай) мове ў варыянце Міколы Шэляговіча.

„Збудінню“ папярэднічала літаратурнае выданне „Балесы Поліська“, што выходзіла спачатку на старонках „Чырвонае змены“, а пасля ў самвыдаце. Выпуск газетаў, што многім здаліся „сваімі“, зрабіла магчымым „така неждана, така чудова“ перабудова. Журналіст „Советской Белоруссии“, актывіст „Поліська“ і паэт Васіль Брыль, няйначай класік украінскага постмадэрнізму Аляксандр Ірванэць, цешыўся ў сваім вершы „Дзякуем перабудове“:

Батьку, мамо,
свето в нас,
свето!
Выйшла на
нашиjі мовы
газэта!
Шэ ны газэта
— шэ но
бочына,
Алэ зрадніты
сыба ны
прычына?

Славмо-жэ
ріднэньку
пырыбудову,
Шо отчынее
заганьбляну
мову!

„Збудінне“ было сапраўдным знакам эпохі. Радасна адкрывала яно свае палосы ўсім, хто хацеў у ім друкавацца: і сталічным філосафам, што пісалі пра „путь западных полешуков во всемирной истории“ і іх „язык, богатый первозданной лексикой“, і правінцыйным фатографам, якія публікавалі на першай паласе здымкі жабінкоўскіх топ-мадэлек з подпісамі кшталту „Такы хорошы j даровыты жывуть на Етвызі дывчета. На здымковы Ларыса Абульмамбетова“. Без каментару

перадрукавала „Збудінне“ з віленскай „Нашай Нівы“ адказ Зянона Пазняка ў апытанні пра эротыку. Карацей, гэтая газета давала народу магчымасць у розных даступных формах і дыялектах выказваць тыя пачуцці, якія яму не ўдавалася адэкватна выражаць у канвенцыйных мовах і жанрах.
У Берасці газету мала хто ведаў. Затое не перагарнуць „Збудіння“ лічылася кепскім тонам сярод маладое менскае багемы. У сталіцы Беларусі яна мела ўдвая болей чытачоў, чым у няспраўджанай „чолотвэрді Етвызі“ Пінску. Менскія наваспечаныя нацыяналісты вельмі ганарыліся, што не толькі незалежнасць заваявалі, але й займелі ўласную аўтэнтычную і аўтахтонную нацыянальную меншасць.
Дэкларацыяваны наклад газеты скакаў у 1990–91 гадах між 5 і 12 тысячамі асобнікаў, што, верагодна, не заўжды адпавядала рэчаіснасці, бо, як толькі газета перайшла на фабрыку „Чырвоная зорка“, дзе прыпісак не дазвалялі, ён упаў да 2700 паасобнікаў і вагаўся між 2700 і 3300 экземпляраў аж да 1993 году, пакуль напярэдадні выбараў 1994–1995 гадоў Мікола Шэляговіч не сказаў: „Даеш рост тыражу на 1000%“! Калі верыць рэдакцыйнаму артыкулу першага (і апошняга) нумару „Збудіння“ за 1995 год, на яго ў тым годзе падпісаліся аж 56 тысяч „пудпысувалнык э j“ і наклад мусіў бы вырасці ў 18 разоў проці чэрвеня 1993 году. На жаль, рэкорднага росту накладу зафіксаваць у кнізе Гінэса не ўдалося, бо, як паведамляў той самы нумар, „здарылоса так, шо „Збудінне“ нывыjшло, бо нызмогло рышыты всіх фынансовых пытаннюв“, і вярнула грошы ўсёй гэтай грамадзе таямнічых падпісчыкаў.
Сімвалічна і тое, што апошні нумар газеты выйшаў рэкламна-агітацыйны — за кандыдатаў у Вярхоўны Савет ад блоку яцвягаў і беспартыйных у Пінску ў складзе самога М.Шэляговіча, а таксама кіраўніка Пінскага аддзялення Ашчадбанку М.Івашэвіча і намесніка дырэктара прадпрыемства „Діло“ Г.Качаноўскага. Усе трое праляцелі.
Лагатып газеты мяняўся разам са зместам: ад псеўдарунічнага ў першых нумарах праз геаметрычна-прагматычны ў 1992–1993 гадах да ўсё большай стылізацыі пад стараславяншчыну напрыканцы. Так і існавала газета да 1995-га, да „пабеднага“ майскага нацыянальнага рэферэндуму, мяняючыся разам з пераменамі палітычных модаў.
У палескім руху адбіліся ўсе беларускія павевы й вятры, толькі

некаторыя ў гіпертрафаваным або дэфармаваным выглядзе: вершапісанне, этнаграфізм і збіранне памятак даўніны, рамантызм, гульні ў дэмакратыю і нацыяналізм, пошук балцкіх каранёў, захапленне моўнымі эксперыментамі, лацінкай і ўрэшце вяртанне да славянскага карэння.
1990 — правядзенне Заходнепалескай (яцвяжскай) навукова-практычнай канферэнцыі, што абвясціла права насельніцтва Берасцейшчыны, Піншчыны, а таксама Паўночнай Валыні й польскага Падляшша і Холмшчыны на фармаванне самастойнага этнасу.
Канферэнцыя мелася прайсці ў Пінску. Тагачасная „агурковая сталіца Беларусі“ была зусім не такой, як цяпер, яе яшчэ не абяскровіў крах лёгкай прамысловасці і рачнога флоту. Тады Пінск (разам з Наваполацкам, Магілёвам, Гомелем, Менскам і Горадняй) меў адносна „дэмакратычны“ гарсавет. Але, нягледзячы на гэта, Пінск аказаўся не гатовы прыняць канферэнцыю, і яна сабралася ў Менску.
Поспех канферэнцыі можна патлумачыць тым, што, як адзначыў Генадзь Цыхун, „у адрозненне ад некаторых адміністратараў і культурных дзеячаў, славянская лінгвістыка з прыхільнасцю сустрэла з’яўленне яшчэ адной літаратурнай мікрамовы“. Пра новую „паэтычную мову“, як яшчэ называе яе сп.Цыхун, пісалі нябожчык маскоўскі славіст Мікіта Талстой (прапраўнук Лява), Аляксандр Дулічэнка з Тарту і Алег Палякоў з Вільні, мянчук Хведар Клімчук.
Лінгвісты, аднак, унікалі контраверсійнага азначэння „яцвяжская“, аддаючы перавагу назве „заходнепалеская (літаратурная) мова (мікрамова)“, выкарыстоўваючы назвы „русінска-палеская“, „палеска-русінская“ ці проста „палеская“ або „русінская“. Апошнюю назву выкарыстаў і М.Шэляговіч у адной з першых сваіх і найбольш гучных публікацый у газеце „Голас Радзімы“ (1987). Дарэчы, перш чым спыніцца на слове „мова“, ён ужываў два іншыя словы: рэмза (параўнайце з „румзаць“) і волода (параўнайце з латышскім „valoda“).
Якраз недзе ў гэты час, калі добрая вядомасць руху дасягнула кульмінацыі, Шэляговіч перастае акцэнтаваць увагу на культурніцкай, краязнаўчай і „паляшуцкай“ сутнасці руху і пераключаецца на распрацоўку „яцвяжскай тэорыі“.

1990 — публікацыя праекту праграмы *Суйдіння*, то бо Руху,

першай парапалітычнай арганізацыі заходніх палешукоў. „Суйдінне“ на добры лад так і не стварылася. Пад канец таго ж году М.Шэляговіч ставіць пытанне аб стварэнні Яцвяжскай нацыянальнай партыі. Праз некаторы час, калі стала ясна, што назвы і Суйдіння, і ЯНП выклікаюць у палешукоў, берасцейская актывістка „Поліська“ Голэна Мазько паспрабуе стварыць Заходнепалескую краёвую партыю, але ізноў беспаспяхова.
Праз нейкі час з’явяцца на свет перадвыбарчыя аб’яднанні „Берасцейскі выбар-94“ і „Пінскі выбар-94“, гэтыя ўжо ў поўнай адпаведнасці з новымі палітычнымі рэаліямі, без палітактывістаў-дысідэнтаў, затое з удзелам дырэктараў аддзяленняў банкаў і прэзідэнтаў кампаній з кангеніяльнымі назвамі кшталту „Girstvo“ (то бо па-шэляговіцку „спадарства“), што будавалі хмарачосы на блатных пляцоўках у цэнтры Менску.
Па сканчэнні кар’еры яцвяжскага кунігаса Мікола Шэляговіч і сам стане адным з найбольш паспяховых менскіх бізнесменаў. 1994 — вылучэнне Міколы Шэляговіча ў якасці кандыдата ў прэзідэнты Беларусі.
З перадвыбарчых улётак М.Шэляговіч прадстае паэтам, граматыстам, навукоўцам, асветнікам, знаўцам шасці замежных моваў, генеральным прад’юсэрам Фестывалю заходнепалескай песні (фота: сядзіць у мажорскім гальштуку за столікам з садавінай, побач — жонка). „Не злопамятен, не мстителен, но решителен и тверд“. „Будем бдительны, выберем достойного кандидата!“ — гэтак канчалася ўлётка Шэляговіча. У ёй адзначалася таксама, што ён валодаў „незаурядными вокальными данными“, але „оперным певцом стать ему было не суждено — сорвал голос“. Карацей, Фіцкаральда палескае Амазоніі.
На час, калі Шэляговіч памкнуўся ў прэзідэнты, у складзе „Поліська“ ўжо не было першага кіраўніка ягонае пінскае „гуртыны“ і правадыра пінскіх уніятаў Каленіка Лукашавіча Удавідчыка, чалавека, што ўжо адным сваім імем сімвалізаваў экзотыку вытокаў. Не заставалася больш у руху ні рамантыкі, ні рамантыкаў.
Калі не зважаць на дэманічную постаць Шэляговіча — гэта асобная гісторыя, — палескае адраджэнне было рамантычным парываннем маладое інтэлігенцыі, што прагла — як ні пошла гэта гучыць усяго праз 10 гадоў пасля тае пары — аднаўлення

гістарычнае справядлівасці ў дачыненні да мільёну насельнікаў Берасцейшчыны й Піншчыны, хоць і не ведала дакладна, у чым гэтая гістарычная справядлівасць мусіць заключацца. Не магла ведаць, выйшаўшы з савецкае вечнае ночы на сляпучы свет вальнейшага жыцця. Украінскасць гэтых тэрыторыяў ужо не была відавочнаю. Беларускасць на іх усё яшчэ заставалася нечым чужым, фармальным, радыйна-літаратурным. Жывой з'явай, замацаванай і легітымізаванай барацьбою за захаванне незалежнасці й дэмакратыі, беларускасць стане на гэтых тэрыторыях, як і ва ўсёй Беларусі, за гады кіравання Лукашэнкі.

Парыванне было цынічна выкарыстанае амбітным геніем Міколы Шэляговіча, якім, магчыма, маніпулявалі спецслужбы. Але ці гэта помніцца з тых гадоў? Не, не вусы Шэляговіча, які набіваўся ў паплечнікі да Гайдукевіча й Лукашэнкі, устаюць у памяці. Успамінаецца іншае. Прыгадваецца, як мы з Надзяй Крышчук, Наталляй і Змітром Бабінымі ставілі ў 1989 годзе ў іх на кватэры, у панельным доме ля ўніверсаму „Рыга", „Пінскую шляхту" Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў арыгінале („Хрін тобі в гочі!"). Узгадваецца не „Збудінне" часоў ягонага змяркання, аддадзенае на водкуп пакрыўджаным філосафам-вар'ятам. Успамінаецца надрукаваны ў 1987 годзе на палескай старонцы „Голасу Радзімы" (газета друкавалася тады на рэдкай у Савецкім Саюзе бялюткай паперы, на першай старонцы быў здымак 85-гадовай бялыніцкай ткачыхі на фоне ручнікоў і гарбузоў, на апошняй — спіс пунктаў падпіскі на „Голас Радзімы", падпісацца можна было нават у Заіры і Перу) верш Мынзара:

Знов быру
былета до
Янова
На курjерський
бырыстэйський
поjізд
Відаю, шо
проводньця
словом
Знов поліським
душу мні
напоjіть...

Верш называецца „Риднэ“.
Усё астатняе называецца „законам людской памяці“. Зрэшты, можа варта пераставіць націск: „людскай памяці“.
Той рух быў палескім для большасці ягоных удзельнікаў, а яцвяжскім толькі для Шэляговіча, Трушка і яшчэ некалькіх чалавек. Ягоная гісторыя хоча застацца ў памяці не як антыбеларуская ці антыўкраінская інтрыга, а як досвед, што лучыць два народы, дзве традыцыі. Застацца спробаю настальгічнага падарожжа ў краіну мроі. Спробаю жыць — і пісаць — заплюшчыўшы вочы, у свеце, дзе ўсё — палітычнае. Заплюшчыўшы вочы, хоць тыя, хто жыве заплюшчыўшы вочы, заведама прайграюць.
Пасля, з часам, з векам, прыходзіла да рознавекавых удзельнікаў палескага руху інтэлектуальная і маральная „дарасласць“ з новым глыбейшым пачуццем сваёй „украінскасці“ й „беларускасці“ і з новым вымярэннем інтэлектуальнай і творчай адказнасці. Прыходзіла і горкае пачуцце дарослага *désillusion*.
Палессе як паняцце культурнае аказалася пахаваным пад Яцвеззю, паняццем палітычным, груба палітычным, няўдала палітычным, бяздарна палітычным, шарлатанскім. Ідэя культывавання і зберажэння рэгіянальных асаблівасцяў Берасцейшчыны й Піншчыны прыцягвала і арганізоўвала людзей. Яцвяжская тэорыя сваёй адвольнасцю і махлярствам дэзарыентавала і сапраўды нанесла вялікую шкоду беларускаму і ўкраінскаму адраджэнням у рэгіёне — калі нехта дабіваўся гэтага, дык дабіўся. Русіфікацыя зрабіла яшчэ адзін крок наперад.
Аднак русіфікацыя, як аказалася, мае непазбежным наступствам нацыянальную кансалідацыю беларусаў. Русіфікацыя была непазбежным пераходным этапам на шляху да такой кансалідацыі — непазбежным з-за пачатковай слабасці надрэгіянальнай ідэнтычнасці і відавочнай разнароднасці этнічнай масы.
1996 — апошні Фестываль заходнепалескай песні (першы быў праведзены ў 1994 годзе), неўзабаве пасля якога прападаюць апошнія знакі дзейнасці аўтанамісцкага руху.
Што засталося ад яцвягаў? Пуставаты сайт у Інтэрнэце пад назвай „*Звырок*“ (слова простае, але не ўсе беларусы адразу сцямяць, што гэта азначае проста „звярок“), з удакладненнем

„Про шляхетну лывірочку“ — http://mensk.newmail.ru. Але не спяшайцеся падлучацца да Сеціва, калекцыянеры экзотыкі: і гэны сайт апошнім часам ягоны невядомы мне гаспадар перавёў на беларускую мову.
Адклаўся яшчэ ў галаве ўбогі, мясарубачны матыў нязбытнага яцвяжскага гімну — застаўкі Тэлефестывалю заходнепалескай песні: „Етвызь! Ту-ту-ту!.. Сымбол нашиј завшыні!.. Етвызь! Ту-ту-ту!.. Память нашиј давныні!..“ Гэтае паскудства якраз і хочацца з памяці сцерці, яно начэпна вяртаецца. Мабыць, да смерці не адстане.
Етвызь — што загарадзіла дарогу да Палесся.

Частка II. Народ, што не стварыўся.
Накіды структурнага аналізу

Праграма ГКЗ „Полісьсе“ (Збудінне, 1990/4), даволі поўнае тлумачэнне якой даў Мікола Шэляговіч у сваім артыкуле „С кем идет „Полісьсе“?“ (Збудінне, 1990/8), была тыповым дакументам нацыятворчага руху на ягонай аўтанамісцкай стадыі. Яна патрабавала для заходніх палешукоў дзяржаўнасці ў форме аўтаноміі пры нязменнасці дзяржаўных межаў з наданнем Берасцейшчыне й Піншчыне статусу аўтаномнага краю, які ў перспектыве ўтварыў бы з уласна беларускай часткай краіны федэратыўнае Беларуска-Яцвяжскае гаспадарства. Яна дэкларавала прыхільнасць да шматукладнай эканомікі з акцэнтам на дасягненне самадастатковасці рэгіёну; урэшце, праграма ўяўляла сабой характарыстычны для той эпохі набор папулісцкіх лозунгаў. У сваім артыкуле „Ятвяжская национальная партия“ (Збудінне, 1990/7) Мікола Шэляговіч пісаў, што „працэс абнаўлення яцвяжскага грамадства мае патрэбу ў яцвяжскай нацыянальнай сацыял-дэмакратыі“. Акцэнт рабіўся на моўнай, культурнай і адукацыйнай палітыцы, прычым, зазначала „Збудінне“, „калі стварэння яцвяжскай навукова-метадычнай базы дабіцца не ўдасца“, дык навучанне ў сярэдніх і вышэйшых навучальных установах прапаноўвалася весці на ўкраінскай мове — паводле стратэгіі „меншага зла“.
Ідэалагічная дактрына руху імкліва мянялася ад панбалтызму да панславізму, разам з саюзнікамі, у залежнасці ад кан’юнктуры. На першых парах Менская гуртына „Полісьсе“

(якая адлюстроўвала пазіцыю М.Шэляговіча) уступіла ў БНФ, пасля выйшла стуль, гэтак і вагалася аж да ўступлення ў прамаскоўскі Народны Рух Беларусі ў 1994 годзе і выхаду з яго ў знак нязгоды з тым, што НРУ падтрымаў на выбарах кандыдатуру Кебіча, а не Лукашэнкі (здаецца, зрэшты, гэта адбылося ўжо пасля таго, як Кебіч прайграў у першым туры, так што не варта пераацэньваць палітычную інтуіцыю Шэляговіча).

Заходнепалескі рух на першым этапе сваёй дзейнасці насіў найперш філалагічны характар. Усе „новаяцвягі“, у тым ліку пратаганіст праекту Мікола Шэляговіч, пачыналі з літаратурнай творчасці. Амаль усе яны былі калі не празаікамі, дык паэтамі. Яны наследавалі шляху, які прайшлі іншыя нацыі Цэнтральна-Ўсходняй Еўропы, што пачалі фармавацца запознена і на першым этапе не мелі ўласнай нацыянальнай буржуазіі: украінцы, беларусы, славакі. Пісьменнікі, філолагі, гісторыкі былі кавалямі іх нацыянальных ідэнтычнасцяў. Таму протанацыяналістычная праграма дзеянняў ГКЗ „Палісьсе“ прадугледжвала найперш кадыфікацыю літаратурнай мовы і пашырэнне тэкстаў на ёй.

Як мовазнавец, Шэляговіч прадпрымаў тэарэтычна правільныя крокі па стварэнні літаратурнае мовы: прыняў фанетычны прынцып правапісу, канструяваў наватворы. Але ён не меў эстэтычнага дару і ігнараваў сацыякультурную рэальнасць. Ягоная мова выклікала эмацыйнае непрыняццё ў аўдыторыі.

Стратэгія

Мала сфармуляваць нацыятворчую праграму. Трэба мець яшчэ гістарычныя, этнічныя ды эканамічныя перадумовы для паўстання нацыі.

Перадумоваў на Берасцейшчыне й Піншчыне бракавала. Стратэгі, аднак, на гэта мала зважалі.

Асновай стратэгіяў прыхільнікаў стварэння „яцвяжскай“ нацыі, як і любой новай нацыі, была паступовая падмена элементаў дамінуючай культуры элементамі новастваранай культуры. Гэта мусіла адбывацца праз пашырэнне газеты, падтрымку самабытнае нацыянальнае літаратуры, заснаванне фольк-гурту „Етвызь“, спансараванне поп-выканаўцаў і тэлефестывалю заходнепалескай песні, падрыхтоўку да стварэння ўласнай адукацыйнай сістэмы праз „яцвяжскі“ цэнтр пры НДІ педагогікі, асцярожныя спробы палітычнай дзейнасці (найперш

уплывы на дзяржаўныя структуры і паступовае ўмацаванне парапалітычнай арганізацыі). Уся гэтая дзейнасць мусіла прывесці да ўтварэння трэцяга балцкага народу і чацвёртае ўсходнеславянскае мовы. Аднак такі балтаславянізм ад пачатку быў крыніцай унутранай супярэчнасці.

Мікола Шэляговіч тады паспрабаваў зняць супярэчнасць, шукаючы ці фабрыкуючы доказы таго, што слова „яцвяг“ было ў познім Сярэднявеччы не этнонімам, а азначала канфесійную прыналежнасць, што „яцвягамі“ называлася паганская супольнасць, або што этнонім „яцвягі“ абазначаў палітычнае ўтварэнне, у склад якога ўваходзілі і балцкія, і славянскія элементы. Было, аднак, ужо позна. Эпоха нацыянальна-палітычных трансфармацыяў канчалася.

Ідэалагічныя і арганізацыйныя формы нацыяналізму, а таксама мадэлі для фармавання нацыянальнае мовы Мікола Шэляговіч проста капіяваў з беларускіх і літоўскіх узораў. Інтэлігенцыя, згуртаваная вакол ягонай харызматычнай фігуры, знаходзілася пад уплывам рамантычнай канцэпцыі нацыі, перанятай савецкай навукай, паводле якой нацыя атаесамлялася з простанароднай мовай. Раз існуе асаблівая гаворка на Берасцейшчыне й Піншчыне, значыць, існуе тутака і асобная нацыя, лічылі яны. Будзіцелі народу Берасцейшчыны і Піншчыны не рабілі адрознення між этнічнай нацыяй і палітычнай нацыяй і лічылі, што нацыя, як і яе мова, — прадукт прыроды, надзелены прыроджаным правам на развіццё сябе і сваёй культуры. Пры гэтым дзяржава і дзяржаўнасць здаваліся ім, рамантыкам, нечым штучным і плынным. Не дзіва ж, калі ўлічыць, як часта розныя рэжымы ўлады змянялі адзін аднаго на лясных і балотных абшарах міжрэчча Буга і Прыпяці ў XX стагоддзі.

Адкуль прыйшлі яцвягі

Сярод умоваў затрымкі нацыянальнага развіцця берасцейцаў і пінчукоў былі моцная асіміляцыя, запозненая, непаслядоўная і палавіністая мадэрнізацыя каланіяльнага тыпу, ажыццёўленая адсталай расійскай метраполіяй, непаўната сацыяльнай структуры, замена гарадскога і вышэйшых слаёў сельскага насельніцтва з габрэйскага і польскага на расійскае ў сярэдзіне XX ст., ментальныя траўмы, прычыненыя таталітарнымі рэжымамі, адкрытае вынішчэнне адукаваных або сацыяльна ці нацыянальна актыўных грамадзянаў таталітарнымі рэжымамі ў

40–50-я гады XX ст., выключная слабасць грамадзянскае супольнасці як наступства камуністычнага кіравання. Сапраўдным бацькам „яцвяжскага“ праекту быў Іосіф Сталін. Пры правядзенні межаў УССР і БССР у 1939 годзе Берасцейшчына і Піншчына, дзе насельніцтва гаварыла на дыялектах украінскай мовы, апынуліся ў складзе Беларусі — каб прасцей было кіраваць транспартнай магістраллю Масква—Берасце. Беларусі Берасце па вялікім рахунку было непатрэбнае, яно было патрэбнае метраполіі. (Пытанне вызначэння прыналежнасці гаворак Берасцейшчыны й Піншчыны, як лакмусавая паперка, выяўляе палітызаванасць, а часам і павярхоўнасць савецкага мовазнаўства. Калі нехта з менскіх лінгвістаў дзяліў усе гаворкі на ўкраінскія й беларускія роўненька па лініі беларуска-ўкраінскай мяжы, гэта можна аднесці на палітычны рахунак, але калі карыфеі ўкраінскага мовазнаўства праводзяць мяжу між беларускімі і ўкраінскімі гаворкамі па гэтай граніцы або па поўначы Камянецкага і ўсходняй адміністрацыйнай граніцы Пружанскага і Кобрынскага раёнаў, гэта ўжо немаведама што, бо паміж гаворкамі Кобрыншчыны і Дарагічыншчыны няма зусім ніякай розніцы.)

Працэс фармавання ўкраінскай ідэнтычнасці ў асяроддзі аўтахтонаў і лініі прыцягнення да ўкраінскае нацыянальна-дзяржаўнае арбіты былі гвалтоўна перарваныя. Рэпрэсіўны апарат запрацаваў на вынішчэнне ўсяго ўкраінскага. Толькі паводле афіцыйнай савецкай статыстыкі за прыналежнасць да ўкраінскіх нацыяналістычных арганізацыяў у 1943–1953 гадах на Берасцейшчыне й Піншчыне было арыштавана 1282 чалавекі, большасць з якіх дадому не вярнулася. Драму тутэйшых сялянаў, заціснутых між рознымі няроўна ўзброенымі сіламі, цяжка апісаць. Дастаткова хіба што нагадаць звесткі, якія прывёў у сваім артыкуле, надрукаваным у часопісе „Архівы і справаводства“, супрацоўнік архіваў КГБ Ігар Валахановіч: падчас толькі адной пацыфікацыі антысавецкага падполля на Берасцейшчыне і Піншчыне, якая праводзілася з 15 студзеня да 20 лютага 1945 году, савецкія войскі і сілы МДБ атачылі 839 населеных пунктаў, абшукалі 48 479 двароў, праверылі 165 137 чалавек, прачасалі 12 тыс. кв. км лясоў і балотаў. У выніку яны разграмілі 33 узброеныя групы, забілі 98 і арыштавалі 3808 чалавек. Свабоду і жыццё

можна было страціць за адну наяўнасць у хаце твораў украінскіх класікаў, за найменшыя праявы ўкраінскіх нацыянальных пачуццяў. Сутнасна такая ж палітыка праводзілася і ў 60–80-х, толькі менш гвалтоўнымі метадамі. Затое беларуская ідэнтычнасць пачала фармавацца позна і прыцягненне да беларускага цэнтру не паспела ўмацавацца (гэта адбудзецца толькі ў 90-х). У выніку на Берасцейшчыне і Піншчыне захоўвалася этнічная група з аслабленай ідэнтычнасцю, якая пад сярэдзіну 80-х яшчэ валодала, актыўна ці пасіўна, мясцовымі дыялектамі ўкраінскай мовы. Новая „вясна народаў“, забушаваўшы ў рэгіёне, не магла не пасеяць пакутлівай збянтэжанасці ў душах няўпэўненых у сваёй нацыянальнай прыналежнасці пашпартных беларусаў Берасцейшчыны і Піншчыны. Пагатоў што за час знаходжання ў складзе Беларусі за кошт русіфікацыі і беларусізацыі ўзмацніліся адрозненні мясцовай культуры і дыялектаў ад украінскіх.

Знайсці гістарычную легітымацыю самастойнаму нацыятворчаму праекту, аднак, было не проста: сярэднявечныя Берасцейскае і Пінскае княствы ніколі не ўяўлялі самастойнай сілы. Мікола Шэляговіч вылучыў „яцвяжскую тэорыю“, хоць так і не змог пераканаць у ёй большасць сваіх паплечнікаў (як сведчаць пратаколы паседжанняў Управы ГКЗ „Полісьсе“, ягоныя сябры ўвесь час падкрэслівалі стрыманае стаўленне да яе).

Этнічны матэрыял, з якога меркавалася вырабіць чацвёрты ўсходнеславянскі або трэці балцкі народ, быў на той момант ужо моцна зрусіфікаваны (паводле Хведара Клімчука, які грунтаваўся на звестках перапісу 1989 г., расійскую мову назвалі тады роднай 22,5% карэнных жыхароў Берасцейшчыны й Піншчыны, рэальная ж лічба тых, хто карыстаўся расійскай мовай у побыце, была яшчэ вышэйшаю). Расійская мова была мовай адміністрацыі, буйнейшых гарадоў, шматлікіх вайсковых базаў. Носьбітамі загародскіх (берасцейскіх)гаворак заставаліся пераважна сялянскія і работніцкія слаі. Паколькі ўмовай сацыяльнага прасоўвання, уваходжання ў вышэйшыя слаі расійскага, польскага і савецкага грамадстваў быў пераход на мову паноўнай нацыянальнасці і прыняцце ейных культурных кодаў, толькі нязначная колькасць інтэлігенцыі працягвала атаесамляць сябе з „тутэйшай“ традыцыяй.

Апроч таго, большасць інтэлігентаў, што ўпрэгліся ў рэалізацыю заходнепалескага праекту, жыла ў Менску, а не на Берасцейшчыне і Піншчыне (іншасць лепш адчуваецца ў параўнанні). Самабытнай культуры сучаснага, урбаністычнага кшталту палешукі не мелі, ды нават горш — урбаністычная ўкраінская й беларуская культуры самі на той час былі недастаткова развітыя, не даючы адэкватнага ўзору. Прыходзілася шукаць сабе святыні ў архаіцы.

А ў краіне бушавала перабудова. Падаў Савецкі Саюз, паўставала Рэспубліка Беларусь. Логіка цэнтралізаванай эканомікі ў муках канала. Надыходзіла логіка капіталізму.

Плён працы

„Новаяцвягі“ прэтэндавалі і на ўкраінскія ды польскія землі: Роўна, Луцк, Сарны, Белую Падляскую, Бельск. Гэтыя прэтэнзіі, аднак, не падмацаваліся колькі-небудзь значнымі аргументамі. Украінскія і польскія сябры „Полісься“ (сярод іх былі, напрыклад, беластоцкая журналістка Ганна Кандрацюк і луцкі філолаг Віктар Давыдзюк) спачатку проста не разумелі, куды іх зацяглі, а калі зразумелі, пачырванелі і паразбягаліся. Дзейнасць групы Шэляговіча фактычна абмежавалася Беларусяй. Але і тутака характар дзейнасці быў пераважна філалагічны (хоць пры гэтым корпус створаных „новаяцвягамі“ тэкстаў не перавысіў некалькі соцень старонак, а газета „Збудінне“ так і не набрала больш за 400 рэальных, а не фікцыйных, падпісчыкаў, пры тым, што ў рэгіёне праз кіёскі прадаецца асобнікаў не больш, чым разыходзіцца па падпісцы). Палітычны нацыяналізм „яцвягаў“, якому супрацьстаялі расійска-савецкая, беларуская, украінская і польская нацыянальна-дзяржаўныя ідэі, быў зусім слабы і няздольны да канкуравання з іншымі нацыяналізмамі.

Крытычны момант падзення Савецкага Саюзу і цэнтралізаванай эканомікі надышоў, калі заходнепалескі аўтанамісцкі рух па сваёй вядомасці ў народзе не быў да гэтага гатовы. Мікола Шэляговіч заўсёды бачыў перспектывы ачольванага ім руху ў кантэксце абноўленага Савецкага Саюзу. Менавіта падчас апошняга ўсесаюзнага перапісу ў пералік нацыянальнасцяў і народнасцяў былі ўключаныя „пінчукі“ (з якімі амаль ніхто сябе не атаясаміў), ува ўсесаюзным Камітэце па друку было першапачаткова зарэгістраванае „Збудінне“.

Аўтанамісцкі рух аказаўся слабы на Палессі. Колькасць ягоных

актывістаў так і не перавысіла сотні, а сімпатыкаў — некалькіх тысячаў.
Але ўкраінскі рух тамака, падзелены на некалькі канкуруючых на непрынцыповай глебе арганізацыяў, аказаўся не мацнейшы, чым заходнепалескі аўтанамісцкі. Непараўнальна слабейшы, чым у 20–30-х і 40–50-х гадах, ён згуртаваў пераважна або былых палітвязняў, або мігрантаў з Вялікай Украіны. Але ні першыя сваіх унукаў, ні другія сваіх дзяцей у рух ужо прывесці не змаглі. Украінцы выдавалі газету „Берестейський край“ — нешта сярэдняе між насценным баявым лістком і раёнкай, правялі пару псеўдафальклорных песенных фестываляў, трошкі пашумелі ў медыях, спрабавалі арганізаваць выкладанне ўкраінскай мовы ў школах — няўдала. Украінскасць аказалася непрыцягальнаю перадусім дзеля жахлівай беднасці і эканамічнай адсталасці суседняй Валыні, якая і фармуе ў берасцейцаў вобраз Украіны.
Фактычна, аказалася, што савецкая дзяржава здолела за 40 гадоў вынішчыць украінскую свядомасць на Берасцейшчыне й Піншчыне. Малапрыемны факт поспеху прымусовае дэнацыяналізацыі. Яцвяжскі праект засведчыў найперш крызіс украінскай ідэнтычнасці ў рэгіёне.

Згортванне
Сканчэнне пераходнага перыяду ў грамадстве, адсутнасць чаканай рэакцыі шырокіх масаў, паступовае запаўненне ідэалагічнага вакууму, з якога імкнуліся скарыстаць палескія будзіцелі — усё гэта прымушала апошніх паступова згортваць сваю дзейнасць. Яшчэ некалькі гадоў, і іхны рух цалкам знік з культурнай і палітычнай мапы Беларусі.
У 1994 годзе Мікола Шэляговіч далучае „Палессе“ да рэваншысцка-савецкага Народнага Руху Беларусі, удзельнічае разам з кіраўніком кампаніі „Лада-ОМС“ Ваганавым і адыёзным журналістам Гукоўскім у стварэнні Партыі ўсебеларускага адзінства і згоды, едзе ў Маскву дзеля падпісання пратаколу аб намерах сумесных дзеянняў з партыяй ПРЕС (з расійскага боку паперу падпісаў цяперашні палітэмігрант Сяргей Станкевіч), спрабуе вылучыць сваю кандыдатуру ў прэзідэнты краіны, але набірае толькі 3700 — пры патрэбе 100 тысячаў — подпісаў у сваю падтрымку (пытанне, колькі з іх было зроблена адною рукою, не

высвятлялася). Праз год ён яшчэ балатуецца ў парламент, але прайграе ў Пінскай акрузе, не прайшоўшы нават у другі тур, саступаючы і кандыдату ад „партыі ўлады“, і камуністу, і прадстаўніку БНФ. Такі самы вынік напаткаў іншых актывістаў руху ў Янове і Кобрыні. Старыя паплечнікі Шэляговіча з шэрагаў дэмакратычнай інтэлігенцыі цураюцца „Полісься“, абураныя ягонымі гешэфтамі з чырвона-зялёнымі, Аляксандр Лукашэнка тым часам умацоўвае свой рэжым асабістай улады. І так, нібы заданне ягонае выкананае, Шэляговіч-паэт, Шэляговіч-палітык, Шэляговіч-лінгвіст, Шэляговіч-выдавец раптоўна знікаюць, толькі Шэляговіч-бізнесовец працягвае раз’язджаць па Менску то на сваім шэрым „Мерседэсе“, то на зялёным „БМВ“.

Параўноўваючы з схемай Гроха

Паводле чэшскага гісторыка М.Гроха, класічная схема разгортвання нацыятворчых рухаў бездзяржаўных народаў Цэнтральна-Ўсходняй Еўропы складалася звычайна з трох этапаў. Першая фаза характарызуецца актыўнасцю малога кола, складзенага збольшага з інтэлігенцыі, якая не абавязкова нават гаворыць на нацыянальнай мове. Гэтая невялікая група дакументуе традыцыйную народную культуру і спрабуе акрэсліць агульныя ўяўленні пра свой народ. Падчас другой фазы бездзяржаўны народ адраджае сваю мову, якая раней лічылася простанароднай гаворкай, усё больш выкарыстоўвае яе ў адукацыі, літаратуры, культуры, на гэтай мове ўзнікае прэса. На трэцяй фазе ствараюцца арганізацыі нацыянальнага тыпу, узнікаюць палітычныя партыі і адбываецца палітычная мабілізацыя — апошняя фаза доўжыцца аж да ўтварэння нацыянальнае дзяржавы. Калі ісці за гэтай схемай, дык заходнія палешукі прайшлі (моваznаўцы Клімчук, Лучыц-Федарэц, археолаг Кухарэнка, філолаг Шэляговіч і інш.) першую стадыю, распачалі другую (газета „Збудінне“, пісьменнік Трушко, тэлефестываль „Етвызь“, уключэнне Міністэрствам адукацыі Беларусі заходнепалескай мовы ў спіс моваў, на якіх можа весціся навучанне і г.д.), але рэалізацыя гэтых этапаў была хутчэй прыватным інтарэсам адзіночак, а не арганізаванага кола, прычым адзіночак, для якіх гэтая справа часцяком была проста кепскім кампрамісам, легальным заменнікам цалкам нелегальнага ўкраінафільства. І „Полісьсе“ так і не стала арганізацыяй у поўным сэнсе гэтага слова.

Стратэгіі заходнепалескага „адраджэння“, імпульсы да рэалізацыі якіх паступалі звонку, не выклікалі зменаў у масавай свядомасці і псіхалогіі людзей, за выняткам вузкага, у пару дзесяткаў чалавек, кола актывістаў, культурны даробак не пакінуў следу ў свядомасці тутэйшага насельніцтва. Цікавасць да мясцовага фальклору, дыялектаў, гісторыі, тэрытарыяльны патрыятызм не знайшлі пунктаў счаплення з палітычным праектам.

Сярод прычынаў адсутнасці такой зваротнай сувязі можна назваць і няўдала выбраны этнонім „яцвягі“, і ўжыванне надмернай колькасці вузкараённых словаў, уласцівых адным паўднёваянаўскім гаворкам, і залішак архаізмаў і не заўсёды ўдалых неалагізмаў у мове, усіх гэтых словаў, незразумелых нават адукаванаму чытачу, і складаны алфавіт мовы („самая аддаленая берасцейска-пінская гаворка нам бліжэйшая, чымся той варыянт заходнепалескае літаратурнае мікрамовы Шэляговіча“, — такое характэрнае выказванне мясцовай інтэлігенцыі цытуе Х.Клімчук), і спрэчны выбар протанацыянальнага цэнтру — не ўніверсітэцкае і прамысловае Берасце (што праўда, моцна зрусіфікаванае), а раённы Пінск, і палітычны апартунізм лідэра, і слабасць сувязі з мясцовымі палітычнымі і эканамічнымі элітамі (стаўленнем уладаў, як цэнтральных, так і мясцовых, было хутчэй ігнараванне), і брак натуральных межаў, адасобленага рынку і гістарычнае традыцыі, і няпэўнасць сімвалічнай легітымацыі, тых падставаў для „гордасці малой радзімай“, дзякуючы якім паступова пераадольваюцца сувязь і ідэнтыфікацыя з „вялікай радзімай“, вялікай нацыяй, і адбываецца змена ідэнтыфікацыі, якая заключаецца не столькі ў перамене мовы, колькі ў перамене культурных кодаў, сістэмы нацыянальных сімвалаў і міфаў. „Яцвяжскі“ міф a priori пазбаўляе іх: не было ў мінуўшчыне магутнай яцвяжскай дзяржавы, не было нацыянальных герояў ці прарокаў.

Падазрэнні

Таму некаторыя лічаць, што „яцвяжскі“ праект ад самага пачатку быў скіраваны не на шырокія масы — праз розныя сродкі камунікацыі ад царкоўных казаняў да электронных медыяў, бо толькі так магчыма закласці падмурак нацыі — а на вузкую, уразлівую на сепаратысцкі дыскурс і папярэдне падрыхтаваную культурна-краязнаўчым рухам групу

інтэлігенцыі. І меў на мэце гэты праект, лічаць яны, не падрыхтаваць удзельнікаў руху да шырокай асветніцкай, а ў перспектыве і палітычнай працы, а наадварот, адвярнуць іх ад далучэння да якога-кольвек руху нацыянальнай эмансіпацыі, скіраваўшы на заведама тупіковую каляіну.
Рух „новаяцвягаў“ сапраўды можна разглядаць як спробу рэалізацыі нацыятворчага праекту, а можна — як маштабную палітычную інтрыгу ці ўмелую правакацыю КДБ супраць беларускага і ўкраінскага нацыянальна-вызвольных рухаў. Маўляў, як Малдове стварылі Прыднястроўе, так тутака хацелі стварыць Яцвязь.
Застаецца без вычарпальнага адказу пытанне, што найбольш рухала нядаўнім выкладчыкам беларускай мовы й літаратуры ў Менскай школе КДБ і супрацоўнікам наскрозь кадэбісцкай газеты „Голас Радзімы“ М.Шэляговічам: жаданне закласці падмуркі новай нацыянальнай тоеснасці або, наадварот, заданне знішчыць перадумовы да гэтага, здыскрэдытаваўшы рух у зародку.
Як толькі Шэляговіч адмахнуўся ад сваіх, як ён цяпер кажа, „юнацкіх аблудаў“, і ягоныя „яцвягі“ зніклі, „акі обры“. Зрэшты, хто можа гарантаваць, што некалі яны не выйдуць з пушчы зноў? Разрывы паміж „адраджэннямі“ не ўспрымаліся і не ўспрымаюцца як нешта незвычайнае ў Цэнтральна-Ўсходняй Еўропе, рэгіёне з драматычнай гісторыяй.
Праўда, якой можа быць у будучыні легітымацыя адроджанага руху ўва ўмовах, калі імкліва і, усё выдае на тое, незваротна знікаюць украінскія дыялекты Берасцейшчыны й Піншчыны? Параза „яцвяжскага праекту“ засведчыла яшчэ раз, што развіццё нацыяналізму з’яўляецца найперш палітычным, а не культурным пытаннем. Нацыятворчы праект аказваецца паспяховы тады, калі ён абапіраецца на гістарычную традыцыю і супадае з шчаслівай палітычнай кан’юнктурай. Толькі тады „супольнасць“ аказваецца здольнаю „ўявіць сябе“ супольнасцю і рэалізаваць сваё адзінства.
А ў заходнепалескім адраджэнні 80–90-х усё цяпер здаецца сном постмадэрніста: адзінаю кнігай, што выйшла на „заходнепалескай мове“, была кніга па шахматнай кампазіцыі цудоўнага кобрынскага трэнера Стэпана Давыдзюка, а адзінай граматыкай заходнепалескай мовы, што так і не выйшла друкам, была граматыка, складзеная ў якасці дыпломнай

працы студэнта філфаку Міколы Шэляговіча. „Кубыла ысторији“ (няхай Юзё Дынысюк даруе мне крадзеж назвы ягонага верша) панесла гэты сон у вечнасць.

З падзякай за каштоўныя парады
ссп. Алегу Латышонку,
Аляксандру Рыбалку
і Хведару Клімчуку.

[image]
[image]

№ 6 (11) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Вадзім Каранковіч
Апошняе абнаўленьне: **6-11-2000**
[image]

Анатоль Сідарэвіч

Поўны не акадэмічны 3 нагоды першых шасці тамоў поўнага збору твораў Янкі Купалы і каментароў да іх

АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ філёзаф, літаратуразнаўца, ідэоляг адроджанай беларускай сацыял-дэмакратыі. Яго ная апошняя публікацыя - артыкул „Луцкевічы і Луцэвіч" („Крыніца", 1999).

У 1945 г. урад БССР і ЦК КП(б)Б прынялі пастанову аб увекавечанні памяці Янкі Купалы. У дакуменце было прадугледжана, што да пятае гадавіны з дня смерці песняра будзе падрыхтавана акадэмічнае выданне ягоных твораў. Панцеляймон Панамарэнка, падпісваючы тую пастанову, або крывадушнічаў, або не разумеў, што акадэмічнае выданне немагчымае без публікацыі ўсіх вядомых твораў таго ці іншага аўтара, іх варыянтаў і рэдакцый. Каб выпусціць Поўны збор Купалавых твораў, спатрэбілася чакаць 50 гадоў пасля панамарэнкаўскае пастановы. Да гэтага часу такіх выданняў —

поўных збораў твораў каго-небудзь з беларускіх пісьменнікаў — у нас не было.
Адчуваю, што мяне зараз папракнуць: а Збор твораў Максіма Багдановіча ў трох тамах хіба не поўны? На гэта я адкажу: на вальеры з вярблюдам можна напісаць „слон“, але хобат у вярблюда не вырасце і горб не знікне. Мелася магчымасць надрукаваць усё вядомае, што выйшла з-пад пяра Максіма-кніжніка, але, мусіць, наша літаратуразнаўства (ці наша грамадства?) яшчэ не даспела, каб друкаваць інтымныя запісы беларускіх пісьменнікаў. Міф пра цнатлівасць беларусаў, які стваралі нацыяналісты пачатковай пары і перыяду нацыянал-эйфарыі, падмацаваны паказным пурытанствам познесавецкіх часоў, спрычыніўся да таго, што складальнікі Збору твораў Багдановіча не адважыліся апублікаваць у „поўным зборы твораў“ дзённік вялікага паэта. Нам пакуль што лягчэй каментаваць Генры Мілера, высвятляць падрабязнасці інтымнага жыцця Арцюра Рэмбо, смакаваць творы Івана Баркова, чым выдрукаваць Багдановічаў дзённік ці поўныя тэксты лістоў Паўлюка Труса.
Лягчэй нам з Купалам. Ягоная любоўная лірыка, вершы, звернутыя да асоб прыгожага полу, прэсныя. Іншая справа — алегорыя „Явар і каліна“ і пастараль „Яна і я“ (праўда, Люба Тарасюк залічвае „Явар і каліну“ да ўзорных твораў пейзажнае лірыкі). Што ж да Купалавага эпісталярыю, дык любоўныя лісты песняра даследчыкам невядомыя; невядомы і хоць які ягоны дзённік. І дзякуй Богу, а то давялося б нам чакаць Поўнага збору Купалавых твораў.

За пяць гадоў (1996–2000) убачылі свет шэсць тамоў[1] „палепшанай паперы нізкае якасці“ ў падбор, а не[2] спосабам, калі кожны твор друкуецца з новае старонкі, рабілася суполкаю „Загляне сонца і ў наша ваконца“ (ёй царом), Беларускім выдавецкім таварыствам (за часам) і Белдзяржвыдавецтвам (за камуністамі), надрукаваны ўсе вершы і паэмы (акрамя драматычных твораў Купалы. Змешчаны „іншыя рэдакцыі і варыянты твораў. Карацей, праведзена немалая тэксталагічная раздзеле „Dubia“ надрукаваны творы, аўтарам якіх быў Купала, даецца абгрунтаванне гэтых публікацый. Вершы надрукаваны ў храналагічным парадку. Каб чытачу лепш было

[1] Ніўніна Антон (Пуцкевіч А). Ардынскі, як гэта ж Лекцыі з беларускае літаратуры. Кніжка 1. Вільня, 1929. С.57.

арыентавацца, што трапіла ў прыжыццёвыя паэтавы зборнікі, а што — дзеля цэнзурных ды іншых меркаванняў — засталося паза імі, падаецца змест „Жалейкі“, “Гусляра“, „Шляхам жыцця“ і „Спадчыны“. Першая публікацыя кожнага з вершаў паказваецца ў каментарах да іх. Аналізуючы гэтыя нататкі, робіш выснову: Купала цярпеў і ад царскае, і ад бальшавіцкае цэнзуры. Можна пры жаданні вывесці адпаведную статыстыку і заключыць, што ў 20-х гадах бальшавіцкая цэнзура была ліберальнейшая за царскую.

1.

Выхад Поўнага збору твораў Янкі Купалы будзе, вядома ж, падзеяй. У літаратуразнаўцаў і эстэтыкаў, гісторыкаў і палітыкаў, студэнтаў і аспірантаў, школьнікаў і настаўнікаў з’явіцца магчымасць чытаць ***усяго Купалу,*** без купюр і падчыстак. Але гэта спародзіць і праблемы. Скажам, маё пакаленне вучыла верш „Хлопчык і лётчык“ без тае страфы, якая мелася ў выданнях да 1956 году: „Ляцеці далёка, высока, // Ды так пабываць і ў Крамлі...“ Калі ёсць Поўны збор, ёсць і канон. І тут пытанне: ці будуць уключаць гэты твор у чытанкі без тае страфы, у якой Хлопчык марыць праляцець над Крамлём ды прывітаць таварыша Сталіна? Мяркую, што ў такім разе складальнікам чытанак давядзецца друкаваць верш са словам „скарочана“ ў зносцы або пад загалоўкам.

Поўныя зборы твораў карысныя тым, што пазбаўляюць класікаў арэолу святасці, і перад намі паўстаюць жывыя людзі з усімі іх вартасцямі і слабасцямі. Поўны збор твораў Янкі Купалы дае магчымасць згадаць словы Антона Луцкевіча, прамоўленыя ў 1929 годзе. Чалавек, які разам з братам Іванам, Уладзімерам Самойлам, Алесем Бурбісам ды Сяргеем Скандраковым спрычыніўся да таго, што польскамоўны паэт-самавук Ян Луцэвіч стаў Янкам Купалам, чалавек, які мог назіраць за творчасцю песняра і зблізку (у рэдакцыі „Нашае Нівы“), і здалёк, у публічнай лекцыі „Напевы ліры Янкі Купалы“ сказаў: “І жыцьцёвы, і пясьнярскі шлях Купалы вызначыўся ўжо хіба даканца. Трудна спадзявацца ад яго нечага нечаканага, што з сучасным духоўным воблікам Купалы магло б аказацца ў супярэчнасьці...“[1] Будучы дыялектыкам, Антон Луцкевіч сваімі „хіба“ ды „трудна“ не выключаў дарэшты таго „нечаканага“, што магло б прыйсці ў супярэчнасць з Купалавым рэнамэ, якое склалася да 1929 году. У гэтым фрагменце чытаецца і тое, пра

што выхаваны Луцкевіч не мог сказаць з кафедры: ён ведаў Купалавы слабасці.

Цытаваныя словы Луцкевіча прагучалі 6 студзеня 1929 году. Да сталінскага артыкулу „Год вялікага пералому“ заставалася роўна 10 месяцаў і 1 дзень, да пастановы ЦК ВКП(б) аб тэмпе калектывізацыі — адзін год без аднаго дня. Луцкевіч быў палітык і не мог не сачыць за тым, што дзеецца ў СССР. Ён атрымліваў лісты ад тых заходніх беларусаў, якія пабывалі ў Савецкім Саюзе, і былых савецкіх грамадзян, якія ўцяклі з краіны „победившего пролетариата“. Луцкевіч добра ведаў, што такое бальшавізм, і ў адрозненне ад іншых сацыял-дэмакратаў (Браніслава Тарашкевіча, напрыклад) не верыў у шчырасць маскоўска-менскіх эмісараў, якія спрабавалі і яго зацягнуць у свае цянёты.
Калі ў асноўных жытніцах СССР пачалася калектывізацыя, калі КП(б)Б па падказцы з Масквы вырашыла не адставаць ад гэтых раёнаў і з ухвалы тае ж Масквы вызначыла „бальшавіцкія тэмпы “ калектывізацыі і ў БССР, быў гатовы спіс тых, хто яўна ці тайна мог выказацца супраць калектывізацыі, асудзіць яе, сабатаваць. Гэта быў цвет беларускае ***сацыялістычнае*** інтэлігенцыі. Правых сярод іх не было (калі не лічыць правых камуністаў), але ўсе (нават камуністы) былі прыхільнікамі ці то дэмакратыі, ці то цярпімасці да іншадумцаў. Патрэбна было нейкае кляймо, агульнае і для сацыял-дэмакрата Аркадзя Смоліча, і для сацыяліста-федэраліста Аляксандра Цвікевіча, і для сацыяліста-рэвалюцыянера Вацлава Ластоўскага, і для камуніста Змітра Прышчэпава. Не назавеш жа іх сацыялістамі-дэмакратамі, а „камуніст-дэмакрат“ і наагул гучыць ненатуральна. Каб заблытаць справу, кампартыя і яе ўзброены атрад — АГПУ — прыдумалі гэтым людзям мянушку „нацыянал-дэмакраты“, бо нацыяналізм і дэмакратыя ў вачах „сапраўдных бальшавікоў“ былі злачынствам. Думку аб злачыннасці нацыяналізму й дэмакратыі ўжо паспелі ўбіць у галовы значнай часткі савецкіх грамадзян. Не надта мудруючы, назву „антысавецкай арганізацыі“ — „Саюз Вызвалення Беларусі “ — прыдумалі па аналогіі з „Саюзам Вызвалення Украіны“. Прыдумалі, ведама ж, не ў Менску. І не ў Харкаве.
У той кампаніі, што нярэдка збіралася ў Купалавым доме, адзін Купала не меў партыйнае мінуўшчыны і цяпершчыны.

Парадокс Купалы ў тым і заключаецца, што ён, дэманструючы сваю партыйную незаангажаванасць (як, напрыклад, у „Тутэйшых“), не мог — у адрозненне, скажам, ад Барыса Пастэрнака — дэманстраваць сваю апалітычнасць. Ён быў моцны ці не ў першую чаргу менавіта як паэт палітычны, майстар грамадзянскае лірыкі. Доктар Станіслаў Станкевіч пісаў пра Купалаву антысацыялістычнасць, антымарксізм. Але ж Купала не стаў і сябрам правае партыі, хрысціянскае дэмакратыі.

Аб прычынах свае беспартыйнасці сам паэт прызнаваўся ў вершаваным лістоў да Лява Клейнбарта: быў, маўляў, я індывідуалістам, не мог падпарадкавацца партыйнай дысцыплінепадтэзбору можна дадаць: з паэзіі XIX ст. ён добра засвоіў, Вяшчун (Адам Міцкевіч). Прарок (Аляксандр Пушкін), Кабзар (Тарас Шаўчэнка). Найбольш блізкі быў Кабзар. Таму Купала і назваў сваю другую кніжку „Гусляр“, але найменне „гусляр“ да яго не прыстала. Гэта пазней, у 1932-ім, Луцкевіч назаве яго прарокам Беларускага Адраджэння, і наступным даследчыкам нічога не застанецца, як згадзіцца з гэтым мяном ды паўтараць яго. (Вось і Ўладзімер Гніламёдаў не змог не ўставіць гэтае слова ў загаловак уступнага артыкулу да Поўнага збору твораў.)

У нашаніўскага Купалы было жаданне самому, непасрэдна „з цэлым народам гутарку весці“; мала таго, ён узяўся сам шукаць для ўсяго народу шлях „К яснаму сонцу з цьмы, беспрасвецця, // К славе з бясслаўя...“* Малады (яшчэ не дасягнуў веку Ісуса), не жанаты паэт абвяшчаў:

За лепшу долю роднага краю,
За сваіх брацціяў ў святой барацьбе —
Гэтакай толькі смерці жадаю,
Памяткі гэткай жадаю сабе.

Такою дэкларацыяй завяршаўся верш „З кутка жаданняў“ (1912).

За Купалавым домам сачылі, на бяседы ў гэты дом прыходзілі людзі з учэпістай памяццю. За тым сталом гаманілі шмат пра што. Нават, наколькі мне вядома, пра „мангалаізацыю“, або ператварэнне Беларусі ў поўнага, але фармальна незалежнага, сатэліта Масквы, якім была Манголія: нікуды не падзенешся,

будзем сатэлітамі Масквы, але няхай у нас будуць свае грошы, сваё войска... Калі пачаліся выклікі ў ГПУ, удзельнікі тых застолляў спачатку спрабавалі аднеквацца, спасылацца на няпамяць, а ім казалі: „Такога і такога чысла праваруч ад вас сядзеў той і той, леваруч — той і той, а насупраць вас... Успомнілі? Вы яму сказалі...“ Зрэшты, доктар гісторыі Ўладзімер Міхнюк можа распавесці пра гэта цікавей за мяне. Купалава спроба самагубства... Самы цяжкі для раскрыцця перыяд жыцця паэта.

Ранейшае, 1912 году, жаданне, як выявілася, было празмернае. Не ў дакор Купалу не магу не згадаць, што мужныя людзі знайшліся сярод беларускіх камуністаў: Усевалад Ігнатоўскі (застрэліўся), Мікалай Галадзед (паводле адной з версій, выкінуўся з трэцяга паверху), Аляксандр Чарвякоў (застрэліўся), Зміцер Жылуновіч (засіліўся), Апанас Кавалёў (прайшоў праз усе кругі пекла, але нікога не здаў у мясарэзку)... Не магу не згадаць і былога сацыял-дэмакрата Сымона Рак-Міхайлоўскага, які перайшоў у камуністычны стан. Апынуўшыся на Салаўках, ён казаў: „Так нам і трэба...“[2]. Згадваючы абставіны таго замаху і з’яўлення сумнавядомага „Адкрытага ліста Янкі Купалы“, Уладзімер Гніламёдаў у прадмове да Поўнага збору твораў піша: “Пасля гэтага Купала быў канчаткова зломлены“. Тут трэба звярнуць увагу на слова „канчаткова“. Што ў Купалы не было трывалага ідэйнага стрыжня, палітычнага стрыжня, што ён хістаўся і спакваля-памалу — — усё гэта можна прасачыць, чытаючы адзін за адным яго вершы і паэмы 1915–1929 гадоў.

Надлом, думаецца, пачаўся ў часе першае сусветнае вайны. Загадкаю (прынамсі не да канца высветленым пытаннем) з’яўляецца Купалаў ад’езд з Вільні перад прыходам нямецкага войска. Луцкевічы, Ластоўскі, іншыя туляюцца па прывіленскіх лясах, каб іх не эвакуавалі сілком, у перыяд міжуладдзя ў дружынах падтрымліваюць парадак у месце, а Купала ідзе на службу да цара... Мажліва, частковы адказ на гэтае пытанне дае верш „На суд“ (1915) і наступныя радкі ў ім: „Мінаў я вашу фарысейскую сям’ю, // Мяне не збэсціў вашым ідалам паклон...“ Каментатары адзначаюць, што пад фарысейскаю сям’ёю маюцца на ўвазе „браты Луцкевічы і В.Ластоўскі, з якімі ў Я.Купалы былі складаныя адносіны“. Дый верш „Таварыш

[2] Беларускія ідэалагічныя плыні ХХ стагоддзя. Энцыклапедычны даведнік. Мінск: Беларускі інстытут навукі і мастацтва) — Нью-Ёрк, 1999. С.125.

мой“ (1915) таксама пра нешта кажа: „О, чэсць табе, маё ты Адзіноцтва, чэсць!..“

З адраджэнцаў не адзін Купала паехаў з Вільні. Вацлаў Іваноўскі, дакладна вядома, пакінуў родныя мясціны дзеля таго, каб весці працу сярод уцекачоў ці сілком выпхнутых на Ўсход беларусаў. Тым часам ліецца кроў, сотні тысяч беларусаў туляюцца па чужыне, Беларусь разарваная на кавалкі, адбываюцца дзве рэвалюцыі, а Купала тры гады (восень 1915 — восень 1918) маўчыць. Камусьці магла прымроіцца ягоная постаць на Ўсебеларускім з’ездзе, але факт застаецца фактам: Купала маўчаў і калі ствараўся Беларускі Нацыянальны Камітэт, і калі пачалі гуртавацца хрысціянскія дэмакраты, і калі паўстала Беларуская Рада, і калі разагналі Ўсебеларускі з’езд, і калі бальшавікі падзялілі Беларусь з кайзераўскай Германіяй, і калі была абвешчана БНР. Хто разгадае гэтую загадку песняра? Яўхім Кіпель, які ў канцы 1918 году жыў у Смаленску, згадвае, што сустракаў Купалу на палітычнай сходцы, якую ладзілі беларускія эсэры ды камуністы, у тым ліку Ўсевалад Фальскі, актор, а неўзабаве і народны камісар замежных спраўаў у першым урадзе БССР. „Янка Купала, — піша Кіпель, — трымаўся асьцярожна, і ў мяне стварылася ўражаньне, што Купала не бярэ ўдзелу ў тагачасным палітычным жыцьці“[3].

Паэт узяў у рукі асадку ў кастрычніку 1918 году.

І пачынаю
йграць з
трывогай
нейкай,
Хоць песня як і
з даўных б’е
часоў, —
Звініць, як
вецер паміж
верасоў,
І ўперагонкі
рвецца з
салавейкай. А
ўсё ж, як тамка
сваякі-суседзі

[3] Кіпель Яўхім. Эпізоды. Нью-Ёрк, 1998. С.67.

Яе паймуць,
хацелася бы
знаць, —
Ці бласлявяць,
ці ўтопчуць
гідка ў гаць?
Адно, снуючы з
сумам па
праследдзі,
Я голасна
йграць буду ў
тайным брэдзе,
Для
Бацькаўшчыны-
маці буду
йграць!

Я зноў заснуўшую было жалейку
Бяру і пробую ў ёй галасоў:
Ці хопіць светлых, звонкіх думак-слоў,
Ці гладка пойдзе песня-дабрадзейка?
У вершах 1918 году прафетызм („Свайму народу“, „На сход!“, „Час!“, „Матцы“) чаргуецца з паняверкаю, роспаччу („У дарозе“, „У вырай“, „Як цені“, „Паязджане“). І завяршаецца 1918 год у найвышэйшай меры парадаксальным і адначасна паказальным вершам „Мая вера“. „У народ і край свой толькі веру“, — дэкларуе пясняр. Але ж у гэтым народзе ёсць людзі, якія ўмеюць „выракацца Беларусі“ („У вырай“), але ж гэты народ супрацьпастаўлены іншым і ўжо паказаны як самы няўцямны ў вершы „Як цені“: „Ідуць народы з лета ў лета // К жыццю, к святлу з бяды, з жуды, // А мы, як цені з таго свету, // Ідзём, не знаючы куды“. Пасля гэткіх радкоў словы пра веру ў народ і свой край гучаць парадаксальна. Парадокс і ў самім вершы: як суаднесці
„Ў народ і край свой толькі веру“ з
„І веру ў самаго сябе“? Ісціна, насмелюся сцвярджаць, у апошнім радку: паэт верыць толькі ў свае высновы, пачуцці й прадчуванні. Яго „лірычны герой“ і „брата маладога“ павучае: „...О, ніколі не йдзі да людзей, // Бо не могуць яны тваіх слёз зразумець; // Ад халодных каменняў іх сэрцы цвярдзей, — //

Ні слязой, ні журбой іх табе не сагрэць!“ („***Калі часам табе сэрца ные, баліць...“, 1919).
Пераменлівасць настрояў уласцівая і лірыцы 1919 году. Сярод нешматлікіх вершаў, як на маю думку, паказальныя два: „Паўстань...“ і „Мая навука“. У першым з іх паэт не бачыць у сваім народзе ані прарока, ані песняра, ані ваяра, ані Ўладара, здольных сабраць усю Беларусь у адну сям’ю, распаліць пажар у сэрцах, павесці народ у бой і „адбудаваць свой збураны пасад“. Не бачыць ані прарока, ані песняра, ані ваяра, ані Ўладара ні з бээнэраўскага, ні з бээсэсэраўскага боку. Дарма пазней бальшавікі нарабілі вакол гэтага верша столькі гвалту. „Мая навука“ сваім загалоўкам і сутнасцю перагукаецца з „Маёю вераю“.

Мне мудрасці кніжнай не даў Бог пазнаці,
Мой бацька не мог даць раскошаў такіх —
Наўчыўся я слоў беларускіх ад маці
І дум беларускіх без школы і кніг.

Тры першыя радкі як для Купалы цалкам аўтабіяграфічныя, чацвёрты ж правакуе тых, хто ведае біяграфію паэта, на роздум. Дзесяць наступных катрэнаў — гэта гімн прыродзе й рэчам („Каса, і сякера, і цэп малацьбітны...“) як настаўнікам песняра. Іншых настаўнікаў, апроч маці, прыроды й рэчаў, у яго не было:

Так іншай не знаўшы навукі і школы,
Ў пацёмках шукаў і знайшоў Божы дар;
Цяпер маймі скарбамі — думы-саколы,
Цяпер беларускай я песні ўладар.

Супаставім заключныя радкі „Мае веры“ і „Мае навукі“. Атрымліваецца: 1) „...веру ў самаго сябе“; 2) „...беларускай я песні ўладар“. З гэтае прычыны паэт не можа прыстаць да нейкае партыі, групы.
Паэт вярнуўся ў Менск разам з бальшавікамі. Ён ужо служыў у іх. Абставіны не далі яму магчымасці выехаць перад прыходам палякаў. Ён друкаваўся у газеце „Звон“ і яе пераемніцы „Беларусі “, на чале якіх стаяў Язэп Лёсік. Ён супрацоўнічаў з Беларускаю вайсковаю камісіяй (БВК), у якой працавалі Сымон Рак-Міхайлоўскі, Алесь Гарун ды іншыя. Ён першы і апошні раз атрымаў магчымасць выдаваць свой часопіс („Рунь“). З БВК у

песняра звязана была нейкая надзея, і ў сваім часопісе ён надрукаваў цыкл „На вайсковыя матывы (Песні на ваяцкі лад)“. Але ў той жа перыяд ён напісаў і поўную смутку ды роспачы „Гадаўшчыну-памінкі“, прысвечаную другім угодкам БНР, і верш „Пяць сенатараў“, да якога я яшчэ вярнуся. Але вось зноў прыйшлі бальшавікі. Калі ў канцы 1919 г. Купала апублікаваў у „Беларусі“ свой пераклад „Слова аб палку Ігаравым“, дык у 1921-ым перакладае „Інтэрнацыянал“, калі ў першай палавіне 1920 г. з’явіліся „Песні на ваяцкі лад“, дык пасля прыходу бальшавікоў — новыя песні: „Беларусы не будуць рабамі“, „Ну, таварышы, ў паход!“, „Шаг у шаг...“ з прыпевам, які пачынаецца словамі „Узніміся, Сцяг Чырвоны!“, проста песню „Узніміся, Сцяг Чырвоны!“ і „На штыхі!“. Парадокс відавочны, але ёсць і пытанне: чаму Купала не надрукаваў гэтых песень тады ж, у першай палавіне 20-х?
„Неспакойная душа паэта“. Іншых слоў не знаходжу. 1921 г. — „На смерць Сцяпана Булата“ („Забуяе ў славе буйнай, // Зазвініць залатаструнне // Родны Край адной Камунай...“). 1922 г. — „Перад будучыняй“ („Там чутна: Беларусь! Там — Незалежнасць! // А там — „Паўстань праклаццем“... Ну, а мы?“ Да каго звернута пытанне? Паэт усё яшчэ спрабуе гаварыць за ўвесь народ, пра ўвесь народ, як быццам не заўважае, што народ, інтэлігенцыя падзеленыя. Беларусь, незалежнасць для песняра — абстракцыя, нешта высненае („маладая мая“?). І ў тым жа 1922-ім пясняр піша тэкст для менскіх дзяцей, каб тым вершам дзеці пацешылі дэлегатаў Усебеларускага з’езду Саветаў. Калі нехта, карыстаючыся словам Якуба Коласа, кажа, што Купала сам называў свае калгасна-савецка-юбілейныя вершы *дрындушкамі*, дык дрындушкі пачаліся ўжо ў 1922 г. А потым былі „Арлянятам“ (1923), „Сей, вольны сейбіт!“ і „Піянерскае“ (1926)... І гэтак аж да „Аб Сталіне-сейбіту“ (1939). Верш „Піянерскае“ цікавы адной „дыверсіяй“:

Беларусь спадзяецца з цябе
Мець свайго абаронцу,
Будзь жа ім, і ў жыцця барацьбе,
Ужо даросшы гадкоў,
Яе весці да сонца —
Будзь гатоў!
Што ж адказваюць піянеры на гэты патрыятычны заклік?

Хоць бабулі мне бурчаць, не маўчаць,
Што з багамі ніяк не міруся...
Чым папала я гаціць буду гаць;
Я не толькі ваяваць проць багоў, —
Нават чорта ганяць з Беларусі
Заўсёды гатоў!

Ці ёсць падтэкст у гэтым адказе? Пра тое, што дзіцяці цяжка прачытаць гэты верш, не кажу.

І паміж вершаў такога кшталту або шмастслоўных, дыдактычных, як „Гутарка аб кепскім гаспадару“, „Праз гультайства...“, „Гутарка аб кепскай гаспадыні“ (таксама 1926), вырываюца раптам „...О так! Я — пралетар!..“, „Акоў паломаных жандар...“, „І прыйдзе“. Два апошнія вершы (1926) можна лічыць апошняю праяваю купалаўскага вальнадумства. 1927-мы будзе годам без вершаў, затое паэт надрукуе паэму „З угодкавых настрояў. Да дзесяцігоддзя Кастрычніцкай рэвалюцыі “. А потым з’явяцца савецка-юбілейныя „Летапіснае“ ды „Ці хто думаў...“ (увесь паэтычны даробак 1928-га). І нарэшце 1929 год: безумоўныя шэдэўры савецкай паэзіі „Дыктатура працы“ й „Сыходзіш, вёска, з яснай явы...“

Сярод гэтых твораў другое паловы 20-х быў адзін — як прызнанне, што паэт не можа быць правадыром. Я маю на ўвазе верш „За ўсё...“ (1926). Ён выдатна сведчыць аб прымірэнні Купалы з уладаю, якая надала яму ў 1925-ым годнасць народнага паэта (нібыта дэкрэтам вырашаецца, хто народны, а хто — не), спачатку дала пажыццёвую рэнту, пасля нават легкавік. Гэтая ўлада, даўшы песняру льготы, ужо выкарыстала яго дзеля развалу беларускае палітычнае эміграцыі. Увосень 1925 г. яна паслала Купалу з Цішкам Гартным ды Міхасём Чаротам „у камандзіроўку“ (гл. Энцыклапедычны даведнік „Янка Купала“) у Чэхаславаччыну і Нямеччыну. Дзейнічаў Гартны разам з намеснікам савецкага паўнамоцнага прадстаўніка ў Польшчы, агентам АГПУ Аляксандрам Ульянавым, а Купала з Чаротам прыкрывалі тылы. Кульмінацыя камандзіроўкі — Берлінская канферэнцыя, на якой нібыта адбылося складанне паўнамоцтваў ураду БНР на карысць ураду БССР. У вершы „За ўсё...“ паэт абвяшчае: „За кут у родным краю, // За хлеб-соль без клапот, — // Я адплаціў народу, // Чым моц мая магла...“ Рахунак падведзены, баланс гатовы. Адплаціў паэт і ўладзе, калі разглядаць тэкст у

кантэксце рэальных падзей. Але ўчэпістая ўлада яшчэ не раз прымусіць адрабляць крэдыт.

Такім чынам, 1925–1926 гады — пераломныя ў творчасці Купалы. Ён ужо савецкі паэт. Ім ужо можна кіраваць. Георгій Колас у сваёй кнізе „Карані міфаў (Жыццё і творчасць Янкі Купалы)“ цытуе адзін з дакументаў ГПУ. У лістападзе 1926 г. Купала, як цытуе яго (відавочна перакладаючы на расійскую мову, агент), сказаў: „Мы живем в Сов. Белоруссии потому, что нет другого места, нет где прислониться...“[4] У 1929 г. А.Ульянаў натхніў напісаць верш „Сыходзіш, вёска, з яснай явы...“ У вялікім каментары да гэтага твору можна вывучыць шмат чаго, але вось даведацца, як, пры якіх абставінах першапачатковы варыянт першага і шэсцьдзесят другога радкоў („Як сон і смутны і жаданы“) загучаў зусім іншасць („Як сон маркотны, нежаданы“), даведацца немагчыма. А „паправачка“ надала твору зусім іншае гучанне. Неўжо, каментатарам невядомыя былі матэрыялы ГПУ і паказанні наконт гэтага верша Змітра Прышчэпава, Аркадзя Смоліча ды іншых? Чытачам, якіх зацікавіў гэты сюжэт, раю прачытаць адпаведны раздзел (с. 238–270) у цытаванай тут кнізе Георгія Коласа.

У 1930 г. сакратар ЦК КП(б)Б Канстанцін Гей, паведамляючы ў Маскву пра Купалаву спробу самагубства, пісаў: „Мы решили не требовать от Я.Купалы признания участия в союзе вызволения Белоруссии и сосредоточить свои силы на требовании выступить с открытым осуждением контрреволюционной деятельности группы белорусских интеллигентов, арестованных по делу СВБ. Думаю, что нам это удастся“[5]. Удалося ж у 1929-ым прымусіць Купалу перарабіць верш „Сыходзіш, вёска, з яснай явы...“, удалося ж выцягнуць з яго паказанні супраць Алеся Дудара. Таварыша Гея прадчуванні не падвялі: „Адкрыты ліст Я.Купалы“ неўзабаве чытала ўся Беларусь — і Савецкая, і Заходняя.

Малады Купала, які ў 1912 г. выказваў жаданне памерці „За лепшу долю роднага краю, // За сваіх брацця ў святой барацьбе “, у тым жа годзе уклаў у вусны свайго героя вядомыя, запамінальныя словы: „Гуслям, княжа, не пішуць законаў“. Яшчэ не стары (48-гадовы) Купала ў 1929 г. не знайшоў сілы запярэчыць агенту ГПУ і зайграў на сваіх гуслях

[4] Колас Георгій. Карані міфаў (Жыццё і творчасць Янкі Купалы). Менск, 1998. С. 66.

гэтак, як ад яго запатрабавалі.
Да 1930 г. пяснярскі шлях Купалы, кажучы словамі А.Луцкевіча, „вызначыўся ўжо даканца“. Далей паталосяла, што прыйшло ў супярэчнасць з ранейшым духоўным воблікам Купалы. Праўда, гэтае новае аблічча было ўжо не такое нечаканае. Але гэта мы цяпер можам зразумець і сказаць. Тады ж, калі Луцкевіч чытаў сваю лекцыю, усё было яшчэ не вельмі пэўнае.

2.
Вернемся да пытання пра публікацыю двух вершаў: „25.III.1918 — 25.III.1920. Гадаўшчына-памінкі“ і „Пяць сенатараў“.
Вершы напісаны ў 1920 годзе. І Найвышэйшая Рада (сядзела ў Менску), і Народная Рада (у Коўне) высільваліся, каб дамагчыся прызнання БНР міжнароднаю супольнасцю і ў першую чаргу суседзямі — Польшчаю ды Расіяю. Паэт меў рацыю, калі пісаў: „У гэту нашу гадаўшчыну // Звініць ланцуг, як і звінеў, // І там, і тутка без упыну // Шалее катні здзек і гнеў“. „Там“ — на тэрыторыі пад уладаю РСФСР (БССР і Літбел ціха сканалі яшчэ ў 1919-ым); „тутка“ — на тэрыторыі пад уладаю Польшчы. „Народ спраўляць памінкі будзе — // Не свята светлае вясны, — // За стол жалобны сядуць людзі // Там, дзе крыжы, дзе курганы!“
Паэт мае права на выказванне сваіх поглядаў і думак, і грэх яму ў гэтым адмаўляць, але чаму Купала палічыў магчымым надрукаваць гэты верш у 1930 годзе? З гістарычнае перспектывы ўжо зразумела было: абвяшчэнне БНР і яе незалежнасці — не марны акт, гэта акт смелых, адважных людзей. Хоць Беларусь не заняла „свайго пачэснага пасаду між народамі“, але не ўлічваць беларускага чынніка стала немагчыма ані Маскве, ані Варшаве. Няўжо Купалу так рупіла выдрукаваць усё, што калісьці напісаў? А тым часам гэты верш выкарыстаў супраць паэта сумнавядомы Лукаш Бэндэ...
Яшчэ больш бянтэжыць публікацыя верша „Пяць сенатараў“: чаму толькі ў 1933 годзе? Ужо пракацілася хваля арыштаў па „справе“ „Саюзу Вызвалення Беларусі“. У маі 1931 г. забралі Гаўрылу Гарэцкага, Радзівона Бонч-Асмалоўскага (сына славутага эсэра) ды дзесяткі іншых па „справе“ „Беларускага філіялу Працоўнае Сялянскае Партыі“, у ліпені — дзесяткі людзей па „справе“ „Беларускага Філіялу Меншавікоў“. Амаль

адначасова з „меншавікамі“ хапалі „членаў“ „Беларускага Філіялу Прампартыі“. У лютым 1933 г. пачалі браць „сяброў“ „Беларускай Народнай Грамады“ (сярод іх Змітрок Астапенка, Лукаш Калюга, Максім Лужанін, Юлі Таўбін). Увосень 1932 г. пасля абмену палітзняволенымі паміж СССР і Польшаю з Заходняе Беларусі прыехалі былыя паслы на сойм (грамадаўцы і змаганцы) Максім Бурсевіч, Павел Валошын, Флягонт Валынец, Ігнат Дварчанін, Пётр Мятла, Сымон Рак-Міхайлоўскі... На іх адразу ж (у верасні 1932 г.) пачалі рыхтаваць „справу“ „Беларускага Нацыянальнага Цэнтру“ (кодавая назва „Закардоннікі“). Машына „чырвонага тэрору“ працавала нястомна... І вось у гэты час Купала друкуе ў часопісе „Полымя рэвалюцыі“ верш „Пяць сенатараў“ са сваім каментаром: „Верш напісаны ў часы існавання „Беларускай Рады“, калі там адбыўся раскол і ў выніку арганізавалася так званая „Найвышэйшая Рада“ (правае крыло)“.

Мне ўжо даводзілася характарызаваць гэты твор. Гл. зам. 6. Тамсама. С. 270.
А цяпер, паколькі гэтага не зрабілі каментатары, назавем тых сенатараў — сяброў Прэзідыуму Найвышэйшае Рады БНР, якіх Купала вінаваціць у своекарыслівасці: Язэп Лёсік (старшыня), Сымон Рак-Міхайлоўскі, Аляксандр Ўласаў, Янка Серада і Кузьма Цярэшчанка. Якую ролю адыгралі ў творчай біяграфіі Купалы рэдактар-выдавец „Нашае Нівы“ Ўласаў, у якога Купала быў наступнікам, фактычны кіраўнік „Звону“ і „Беларусі“ Лёсік, рэдактар „Беларусі“ Цярэшчанка, казаць не трэба. Дзякуючы намаганням „своекарыслівых“ сенатараў і БВК Купала атрымаў магчымасць выдаваць з мая 1920 г. свой часопіс.
У 1930 годзе Купала ўжо звальваў на Лёсіка „віну“ за публікацыю верша „Паўстань...“ Маўляў, Лёсік справакаваў гэты верш. Як жа было на самой справе? Рэдактар жа проста змясціў яго, як і не адзін іншы Купалаў твор, на першай паласе, выказаўшы гэткім чынам павагу да песняра. Атрымалася так, што верш апынуўся побач з інфармацыяй аб галоўнай палітычнай падзеі — прыездзе Пілсудскага. Праз дзесяць год бальшавікі вытлумачылі, што Купала бачыў у асобе начальніка Польскае дзяржавы й прарока, і песняра, і ваяка, і Ўладара. Паэт жа не прыдумаў нічога лепшага, як скласці „віну“ на Лёсіка. Зрэшты, калі Аляксандр Ульянаў (той самы, што штурхаў Тарашкевіча, Рак-Міхайлоўскага ды іншых да

стварэння Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады, якая б стала прыкрыццём для падрыўной камуністычнай дзейнасці ў Заходняй Беларусі, і развальваў беларускую палітычную эміграцыю) папракнуў Купалу за тое, што той напісаў антысавецкі верш „Пасеклі край наш папалам“, паэт „сразу же назвал автора — А.Дударя...“[6].

Тэма нязломнасці творцы, тэма класіка й калабарацыі яшчэ чакае свайго даследавання.

Дзе апынуліся Лёсік і Серада, вядома. Цярэшчанка пазбег такое долі таму, што памёр у 1923 г. Уласаў не паддаўся на бальшавіцкія правакацыі і датрываў да 1939 г. Ды вось Рак-Міхайлоўскі прыехаў у БССР. Добры ж „падарунак“ падрыхтаваў яму Купала!..

Што ці хто прымусіў паэта друкаваць той даўні твор? Чаму менавіта ў 1933 годзе? І яшчэ пытанне: а ці сапраўды верш напісаны ў 1920 г.? Даць станоўчы ці адмоўны адказ немагчыма: рукапісу няма. Зрэшты, верш мог існаваць і на пачатку красавіка 1920 г.: Купала, яшчэ не атрымаўшы грошай на выданне часопіса, мог вінаваціць Лёсіка ды ягоных калегаў. Можна дапусціць, што Купала й не насіў таго верша ў 1933 г. у рэдакцыю „Полымя рэвалюцыі“, бо, прыкладам, у „ЛіМ“, як згадвае Ян Скрыган, паэт амаль ніколі не прыносіў сваіх твораў: гэта звычайна рабіла ягоная жонка. Яна й ганарар атрымлівала[7]. Дык вось, ці не занесла „Пяць сенатараў“ у рэдакцыю „Полымя рэвалюцыі“ Купаліха? Яна ж, паводле сведчання Паўліны Мядзёлкі, трымала ў сябе ключы ад шуфлядаў, у якіх захоўваліся рукапісы паэта. Мы трохі ведаем пра яе ўплыў на мужа[8]. Дастаткова згадаць, што „Інтэрнацыянал“ пясняр перакладаў з дапамогай жонкі (а дакладней — цешчы, Эміліі Манэ, якая паходзіла з сям'і французскага мастака-імпрэсіяніста Клёдам Манэ. Ці не праз Купаліху ў 1933 г. Купаліха свайго мужа ад магчымых непрыемнасцяў (сувязь з „польскім шпіёнам“, „луцкевічаўцам“ Рак-Міхайлоўскім)?

Перыяд маўчання і ваганняў у Купалы цягнуўся тры гады, але шэсць тамоў Поўнага збору твораў пра гэта сведчаць нічога. Найлепш. Чытаць пяты том (вершы 1930—1942 гадоў) вельмі цяжка. Так, ад Купалы патрабавалі песняў „сацыялістычнаму будаўніцтву“, і адпаведную цытату з Лукаша Бэндэ

7 Скрыган Ян. Вяршыні і далягляды. Кн. 2-я. Мінск, 1985. С.172.

8 Кудасевіч І. Купала і Янка Купала. С.269.

каментатары падаюць. Не мог паэт, хоць і піў, удаць з сябе горкага прапойцу ды пайсці ў дворнікі, як Андрэй Платонаў; не магла ўлада запраторыць яго, як Восіпа Мандэльштама, у лагер на Далёкім Усходзе: у Расіі быў не адзін лірык маштабу Мандэльштама, а Купала ў Беларусі — адзін. (Эпік Якуб Колас мог і ў прозу адысці, і ў Акадэміі знайсці сабе занятак).

3.

Кожны поўны збор твораў каштоўны не толькі варыянтамі і рэдакцыямі твораў, але й каментарамі, якія даюць магчымасць паглыбіцца ў атмасферу часу, калі жыў і працаваў творца.

Мы не кажам пра тое, што само па сабе зразумелае: у каментарах не павінна быць памылак, а калі яны ёсць, назавем іх карэктарскімі. Бо калі ў каментары да верша „Брату-беларусу“ з'яўляецца прозвішча нейкага А.Чорнага, а не тлумачыцца, хто такі гэты Чорны, дык чытач можа разгубіцца: мо ўжо Сашу Чорнага Аляксандрам празвалі? Я, напрыклад, ведаю, што гаворка ідзе пра чэшскага прыяцеля нашае літаратуры Адольфа Чэрнага, але ці кожны чытач ведае пра тое? Такі прыкры недагляд у Зборы не адзіны. Хто такі П.Любецкі? Між тым гэты псеўданім рэцэнзента Купалавага зборніка „Спадчына“ згадваецца не адзін раз. Вось бы й патлумачыць, што П.Любецкі — гэта Павал Каравайчык, лекар паводле адукацыі, цікавы публіцыст, які стаў ахвяраю сталінскага тэрору.

Наагул, каментарная частка кожнага тому мяне турбавала найбольш. Калі браў у рукі першы том, пытаўся: ці здолелі каментатары пераадолець філалагічную абмежаванасць (маю на ўвазе ганебна нізкі ўзровень паліталагічных, рэлігіязнаўчых, філасофскіх ды гістарычных ведаў у выпускнікоў беларускіх філфакаў), ці здолелі яны пераадолець стэрэатыпы, выпрацаваныя пры камуністычным рэжыме?

Аб'ектыўны, акадэмічна вытрыманы каментар не патрабуе тлумачэння словаў, сэнс якіх вынікае з кантэксту. У Поўным зборы Купалавых твораў выклікае неўразуменне наяўнасць лішніц, часта смешных ці абсурдных. Прыкладам, у каментары да верша „А як мы з хаткі выходзім...“ чытачу тлумачаць, што бадылі — гэта быллё. Міжволі згадваецца класічнае „Вяроўка ёсць вервіем звычайным“. А вось слова „гуголле“. Нібыта зразумела й трэ было б, калі на тое пайшло, і ў каментары запісаць, што гэта дыялектная назва куколю (Agrostemma).

Запісана ж яшчэ прасцей: травяністая расліна, пустазелле. А вось што такое лёхі? Калі верыць каментару да паэмы „Курган“, лёхі — гэта норы.

У вершы „Песня званара“ трапляецца слова „сцежары“. Каментатары тлумачаць яго як кастры, але не дроваў, а ў сэнсе вогнішча. Аднак слова „сцежар“ (дыялектнае) мае іншае значэнне: гэта асаблівым чынам выкладзеная аснова, спод стажка сена на балоце або лузе. Робяць сцежары (у слоўніках літаратурнай беларускай мовы — стажар’е) дзеля таго, каб сена не ўсырэла, не змокла знізу. Мо яны й гарэлі?
Або вось яшчэ каментар. Да верша „Тканне намёткі“. Слова „цэўка“ тлумачыцца так: прыстасаванне ў выглядзе трубкі, на якое навіваюцца ніткі і якое ўстаўляецца ў чаўнок пры тканні. Акурат як у Тлумачальным слоўніку беларускае мовы. Але тут недарэчы слова „навіваюцца“, бо ніткі на цэўку насукваюць, а дзеля гэтага ёсць сукала (гл. у тым самым слоўніку).
Праблема і з храналогіяй.
У каментары да верша „На Купалле“ пішацца, што твор упершыню апублікаваны ў „Нашай Ніве“ 24 чэрвеня 1910 году, № 26. А далей ідзе такое тлумачэнне: „Верш апублікаваны 24 чэрвеня — па старому стылю 7 ліпеня. Як вядома, у ноч з 6 на 7 ліпеня адзначаецца старажытнае язычніцкае свята — Купалле. Можна меркаваць, што гэты твор напісаны менавіта да свята. У згаданым нумары газеты змешчаны таксама верш А.Паўловіча „Ноч на Івана Купалу...“, прысвечаны паэту-сябру, чый псеўданім звязаны са святам нашых продкаў“.
Што Купалле мае паганскія карані, рэч вядомая, але 24 чэрвеня каталікі святкуюць дзень святога Яна Хрысціцеля. Таму сыну каталікоў Дамініка і Бянігны Луцэвічаў, які нарадзіўся 25 чэрвеня, было дадзена ў святым хросце імя Ян. Адзначым, што каталік Ян Луцэвіч нарадзіўся 25 чэрвеня паводле новага стылю, бо Каталіцкая Царква жыве паводле яго з 1583 г., пра што і Баркулабаўскі летапіс сведчыць. 24 чэрвеня паводле новага стылю каталікі адзначаюць Купалле і цяпер. Трэба ж памятаць, што Расійская Праваслаўная Царква не перайшла на новы каляндар, а таму й атрымліваецца, што праваслаўна-царкоўнае 24 чэрвеня ў грамадзянскім календары сталася 7 ліпеня паводле новага стылю. Калі б Праваслаўная Царква ў 1918 г. прызнала новы — еўрапейскі — каляндар, яна й сёння

святкавала б дзень св. Яна 24 чэрвеня.
З рэлігійнымі святамі праблем у каментатараў шмат. У каментары да верша „Сёмуха“ паведамляецца, што апублікаваны ён напярэдадні рэлігійнага свята Сёмухі, якое адзначалася на 7-ы тыдзень пасля Вялікадня. Тут адна недакладнасць: не на сёмы тыдзень, а праз сем тыдняў пасля Пасхі Хрыстовай, а таму па-царкоўнаму называецца Пяцідзесятніцай. Але чаму Сёмуха *адзначалася*? Хіба ўжо не святкуюць яе добрыя хрысціяне? І, вядома ж, абавязкова дата падаецца толькі паводле старога стылю. Для католікаў гэта дата новага стылю, а праваслаўным, каб перавесці на новы стыль, трэба лічыць на пальцах: на якую ж гэта дату прыпадае свята?

Слова „адзначалася“ ў дачыненні да рэлігійных святаў паўтараецца да начэпнасці шматкроць. А Поўны збор твораў чытаюць, мусібыць, і вернікі. Гэта тым болей трэба мець на ўвазе, калі каментуеш падзеі святое гісторыі Старога ці Новага Запаветаў. Аніяк нельга назваць акадэмічным наступны каментар да верша „Жыды“:
„…*мудрага Ісуса*… — Паводле евангельскай міфалогіі, Хрыстос нарадзіўся ад „святога духа“ ў Віфлееме (Палесціна) у Марыі, жонкі Іосіфа; міфічны заснавальнік хрысціянства, „богачалавек“. Прапаведаваў новае рэлігійнае вучэнне ў Іудзеі, Галілеі, Самарыі і інш.; зрабіў шмат цудаў“.
Першая частка каментару абражае пачуцці вернікаў. Можна было напісаць па-акадэмічнаму стрымана, ды не робячы лішніх памылак. Бо калі Ісус — міфічная асоба, дык як ён мог прапаведаваць новае вучэнне?
Або вось яшчэ адзін каментар — да верша „Усяночная“:
„Прэтэкстам верша з’яўляецца культавая ноч перад міфічным уваскрасеннем Хрыста…“
Ці трэба каментар да гэтага каментару?
Дарэчы, наконт Вялікадня. Да верша „Вялікдзень“ такі каментар: „Напісаны напярэдадні хрысціянскага свята, якое па ст.ст. прыпадала на 29 сакавіка“. Вось і думай: рухомае свята Пасха ці не? Мо на 29 сакавіка яно прыпадала ў год публікацыі верша?
Застаецца толькі пашкадаваць, што каментатары не паклікалі на дапамогу спецыяліста ў галіне рэлігіязнаўства, а хоць бы й

святара. Ён бы растлумачыў, што сакраменты (сакраманты) — не „нешта свяшчэннае, рытуальнае“, а тайны, таемствы, таінствы. Растлумачыў бы, колькі ўсяго тайнаў і ў Заходняй, і ўва Ўсходняй Царкве. (Калі ўжо размова пайшла пра каментар да верша „А ў Вісле плавае тапелец...“, дык адцемім, што Бэльвэдэр — рэзідэнцыя не польскага ўраду, а кіраўніка дзяржавы).

Учарашнім днём патыхае, калі чытаеш звесткі аб перакладах Купалавых твораў на мовы іншых народаў. На першым месцы, вядома ж, расійская, потым ідуць мовы народаў былога СССР, за імі — астатнія. Памятаю, як у 1982 г. перад урачыстаю вечарынаю, прысвечанай 100-годдзю Купалы, у Тэатры оперы і балету прадавалі том з вершам „А хто там ідзе?“ на мовах народаў свету. Пераклады былі размешчаныя ў дэмакратычным алфавітным парадку. Нехта з пільных таварышаў згледзеў ерась, і больш гэтага тому не прадавалі. Друкарня вырабіла наклад па-новаму, і на першае месца стала расійская мова. (А „няправільны “ асобнік у мяне захаваўся!)

Здаецца, усе мовы ў Бога роўныя, але адна з іх раўнейшая з пункту гледжання пэўных асоб ды інстытуцыяў. У тым „няправільным“ зборніку былі, праўда, свае вады. Напрыклад, было напісана: „Яўрэйская мова“. Якая яўрэйская — іўрыт, ідыш?..

Мне здаецца, што ўлік перакладаў — пэўная правінцыялізму (глядзі-тка, і нас заўважылі!). Апрача таго, наўрад ці мажліва ўлічыць усе пераклады. Так, у каментары да паэмы „На Куццю“ (у Поўным зборы напісана „На куццю“) пазначана, што яе пераклаў на расійскую В. (Валянцін?) Тарас. Аднак жа ёсць пераклад гэтага шэдэўру і на ўкраінскую мову, дыхтоўна зроблены Паўлом Гірныкам (гл.: Сузір’я: Літературно-художній збірник. К., Дніпро, 1990. С.42–47). Падкажу каментатарам, што ў тым самым зборніку надрукавана й п’еса „Тутэйшыя“ (перакладчык Васіль Сідарэнка).

Каментар да паэмы „На Куццю“ прымушае мяне задумацца й над такім пытаннем: а ці сапраўды ў Поўным зборы твораў дадзена аб’ектыўная інфармацыя пра публікацыі паасобных Купалавых твораў? Вось жа каментатар катэгарычна сцвярджае, што гэтая паэма ў пасмяротных выданнях паэта не

9 Калі перыяд каментару, і гэта вадно не каб яўрэйскай пасмяротных выданнях.

друкавалася. Мне ж вядомыя прынамсі тры публікацыі: 1) На Куццю: Паэма. Міхельсдорф, 1946; 2) Спадчына: Выбар паэзіі Янкі Купалы. — (Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва) — Нью-Ёрк — Мюнхен, 1955; 3) Выйдзі з сэрцам, як з паходняй!.. — (Укладальнік Алесь Разанаў) — Мн., 1982.
Сцвярджаецца таксама, што верш „Паўстань...“ у пасмяротныя выданні твораў Янкі Купалы ўключаецца толькі з 1993 году. Зноў няпраўда. У зборніку „Спадчына“ (1955) можна прачытаць не адзін твор, забаронены на той час у БССР, у тым ліку й „Паўстань...“ (праўда, там трохі іншы загаловак: „Паўстань з народу нашага...“).
Закрадваецца думка: мо каментатары не лічаць Купалавы кнігі, надрукаваныя беларускімі эмігрантамі пасля другое сусветнае вайны, пасмяротнымі выданнямі? І наагул выданнямі? Між тым і рэдактарам, і каментатарам карысна было б зазірнуць у „выбар паэзіі Янкі Купалы“ хоць бы дзеля таго, каб лепш прадумаць укладанне тамоў Поўнага збору. У нью-ёркска-мюнхенскай „Спадчыне“ да жанру паэмы аднесены пяць твораў, якія ў Поўным зборы пададзены як вершы. Гэта — „Грабар“, „Паляўнічы і пара галубкоў“, „Забытая скрыпка“, „Чараўнік (Забытая казка)“[9] і „Ў Купальскую ноч“. Можна здзіўляцца, чаму „Грабар“ аднесены да паэм, можна растлумачыць, чаму „Яна і я“ змешчана сярод вершаў, але што датычыць чатырох твораў („Паляўнічы і пара галубкоў“, „Забытая скрыпка“, „Чараўнік (Забытая казка)“ і „Ў Купальскую ноч“), дык тут ёсць пра што падумаць і паспрачацца. Ва ўсякім разе адзначыць у каментары, што той і той твор кваліфікаваны складальнікамі зборніка „Спадчына“ як паэма, трэ было б. І абгрунтаваць, чаму ў Поўным зборы твораў ён падаецца як верш. Гэтага вымагае элементарная навуковая карэктнасць.

Навуковая карэктнасць патрабуе таксама, каб пра пэўных асоб падавалася аб’ектыўная інфармацыя: нарадзіўся, вучыўся, скончыў, займаў тую ці іншую пасаду, браў удзел у той ці іншай грамадска-палітычнай арганізацыі, напісаў тое і тое. На жаль, пры каментаванні пэўных палітычных падзей або падачы звестак пра палітычных дзеячаў не абышлося без „дасягненняў“ учарашняга дня — ацэнак з пазіцый „самага перадавога вучэння “.
Ёсць у Купалы, як я лічу, ганебны верш „Мала іх павесіць...“.

Ганебны і таму, што паэт зліўся ў ім з охласам, і таму, што паэт, як я мяркую, не можа патрабаваць смерці для чалавека. „Мала іх павесіць...“ — гэта пра вядомых бальшавікоў, якіх разам з Рыгорам Зіноўевым ды Лявом Каменевым Сталін вырашыў прыбраць з гэтага свету. Каментар да верша просценькі: „Рытарычны водгук на выкрыццё здрадніцкай дзейнасці трацкістаў“. Нішто сабе рыторыка! І пра якую здраду гаворка? На той час, калі выйшаў 5-ы том Поўнага збору (1998), і Пятакоў, і Муралаў, і Радэк, і іншыя ўжо дзесяць гадоў як былі рэабілітаваныя юстыцыяй той краіны, што іх асудзіла. А вось звесткі пра ўкраінскіх палітыкаў (каментар да верша „З’езду Саветаў“). Пятлюра *Сімон* Васілевіч — адзін з кіраўнікоў украінскай буржуазна-нацыяналістычнай контррэвалюцыі... Махно Нестар Іванавіч — адзін з кіраўнікоў контррэвалюцыйнага анарха-кулацкага руху ў перыяд грамадзянскай вайны на Украіне. Дасталося ж сацыялісту *Сэмэну* Пятлюру! Буржуем назвалі. Дый бацьку Махно перапала. А ён на чале сялянскае арміі і супраць белых (у саюзе з чырвонымі), і супраць чырвоных ваяваў. Цікава, з якое бальшавіцкае энцыклапедыі перапісаныя гэтыя даведкі? Маглі б каментатары схадзіць у Беларускую Энцыклапедыю (недалёка ж) і параіцца, як складаюцца навуковыя даведкі без ідэалагічных клішэ.

Не пашанцавала і дзеячам больш далёкае мінуўшчыны. Цікава было чытаць у каментары да верша „Суд ідзе“, што Адам Міцкевіч быў *славянскім* паэтам, які „паклаў пачатак польскай нацыянальнай ідэі“. Цікава даведацца, што ў Польшчы быў кароль *Сыгізмунд* III Ваза. Тлумачачы значэнне Купалавых слоў „Хаўтурныя вашы званы зыгмунтовы“, каментатары пішуць: „Можна меркаваць, што гэта намёк на польскага караля Сігізмунда III Ваза (не Вазу. — **Аўт.**)...“ Меркаваць можна ўсё што заўгодна, але ў Яна Матэйкі ёсць карціна „Zygmunt Stary słucha dzwonu Zygmunta“, што на беларускую перакладаецца “Жыгімонт Стары слухае звон „Зыгмунта“”. А „Зыгмунт“ — гэта звон, выліты з столку за часоў караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта I Старога і названы ў гонар гэтага манарха. Знаходзіцца ён у Кракаве на Вавэлі. У XIX — пачатку XX ст. палякі лічылі яго сімвалам дзяржаўнага адраджэння, вяртання „залатога часу“ (і ў нас час панавання Жыгімонта Старога сёй-той называў і называе залатым). Вось Матэйка й

напісаў карціну, якая ў палякаў выклікала пэўныя эмоцыі й памкненні. Для Купалы ж, які выхоўваўся ў польскай культурнай традыцыі й пра Зыгмунтаў (Жыгімонтаў) звон ведаў, ён чамусьці загучаў як хаўтурны.

Цяжка растлумачыць, чаму пасля імені вялікага князя Альгерда ў дужках напісана *Альгірдас*, а пасля імені Кейстута — *Кестуціс* (дарэчы, па-літоўску гучыць *Кястуціс*). Каб падкрэсліць іх балцкае паходжанне? Няхай так, але для нас важней, наколькі аб'ектыўная інфармацыя пра Альгерда і Кейстута (каментар да Купалавага пераклады „Трох Будрысаў"). Не раю давяраць ёй. Лепш зазірнуць у адпаведныя артыкулы Энцыклапедыі гісторыі Беларусі. Там можна прачытаць, што Альгерд хадзіў на Маскву не два, а тры разы.
...Уладзімер Гніламёдаў піша ў прадмове: „Купала, як і ўсе (ці пераважная большасць), трапіў у сталінскі палон і заставаўся бездапаможным вязнем вялікага — на ўсю краіну! — ГУЛАГу". Вязнем можна стаць і добраахвотна, і па наіўнасці. Купала, вагаючыся, сам абраў камуністычны стан, бо спадзяваўся ці то верыў, што нацыянальны ідэал можна ажыццявіць і ў БССР. (Зрэшты, не ён адзін такі. Нават Аляксандр Цвікевіч і Вацлаў Ластоўскі, якія ўзначальвалі ўрад БНР, пераехалі ў Менск.) Апынуўшыся ў вязніцы, Купала клікаў у яе і іншыя народы. Адна справа верасень 1939 г., калі паводле пакту Рыбентропа—Молатава амаль усе беларускія землі апынуліся ў складзе аднае рэспублікі. Тут нельга не згадаць словы Леніна пра тое, што рэакцыйныя сілы часам, самі таго не жадаючы, робяць прагрэсіўныя справы. Іншая рэч — канец 1939 г., калі пачалася савецка-фінляндская вайна (у Еўропе яе называюць Зімоваю). Купала падтрымаў дзеянні сталінскага ўраду (верш „Фінляндыі "). Мала таго, Купала, які ратаваў сваіх маці й сясцёр ад высылкі ды на сабе спазнаў жорсткасць рэжыму, у гэтым творы прарочыў фінскаму народу шчаслівую долю ў еднасці „з вялікім усходнім суседам". Пры гэтым паэт звяраў свой радок з кожнымі новымі тэндэнцыямі ў замежнай палітыцы бальшавікоў. Ён не мог не ведаць, што ў Фінляндыі моцныя прагерманскія настроі й пазіцыі нямецкага капіталу, аднак пасля 23 жніўня 1939 г. згадваць Гітлера ў адмоўным плане (як гэта паэт рабіў у вершы „Мала іх павесіць...") ужо нельга было. Таму, праракуючы шчаслівую долю Фінляндыі,

Купала пісаў:

Горды народ твой не будзе згібацца
У ёрмах прыгонных, у здрадніцкіх лапах,
Болей не будзе ён з торбай жабрацкай
Жыць, як прыкажа з-над Тэмзы сатрапа.
А Брытанія была ўжо ў стане вайны з Германіяй, субмарыны адмірала Дзёніца тапілі брытанскія караблі... (Я ўпэўнены: калі б раптам памянялася савецкая замежная палітыка, Купала лёгка памяняў бы ў гэтым вершы слова „Тэмзы“ на слова „Шпрэе“.)

Марна шукаць каментару да верша „Фінляндыі“ ў 5-м томе Поўнага збору твораў. Нават не сказана, з якое такое прычыны ён напісаны. Цяжка вытлумачыць такую пазіцыю рэдактараў Поўнага збору твораў.
Верш „Фінляндыі“ разам з наступным — „Аб Сталіне-сейбіту“ — давалі Купалу падставу спадзявацца на Сталінскую прэмію (у Поўным зборы яна называецца Дзяржаўнаю). Хоць у 1940 г. паэт не напісаў ніводнага верша, у 1941-ым прэмію яму далі.
…Купала-паэт, Купала-драматург, Купала-публіцыст, Купала-перакладчык... Творца Купала — гэта больш, чым паэт, драматург, публіцыст, перакладчык. Поўны збор твораў песняра дае мажлівасць адно пазначыць вешкі на ягоным творчым шляху. Купала-нашанівец, Купала перыяду БНР і ранняе БССР і Купала пасля ўмацавання бальшавіцкае сістэмы. Свет Купалы — гэта не толькі тэксты. Свет Купалы, які спрабаваў даследаваць Рыгор Бярозкін, яшчэ не спазнаны ў дастатковым набліжэнні. Дзеля гэтага патрабуюцца высілкі спецыялістаў у галіне кампаратывістыкі, лінгвістыкі, псіхалогіі, гісторыі культуры. Мо тады й атрымаецца не толькі поўны, але й акадэмічны збор твораў. Знаёмства ж з першымі шасцю тамамі (наперадзе — яшчэ тры) дае падставу казаць: панамарэнкаўская пастанова пра акадэмічнае выданне твораў Янкі Купалы не выканана ні праз пяць, ні праз пяцьдзесят пяць гадоў пасля паэтавай смерці. Яшчэ не даспела наша навука да такіх выданняў.

[image]
[image]

№ 6 (11) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Максім Маскалёў
Апошняе абнаўленьне: 23-03-2001
[image]

Тацяна Снітко

Як я не сустрэлася з Асланам Масхадавым

ТАЦЯНА СНІТКО журналістка, уласная карэспандэнтка газэты „Україна молода“ ў Беларусі, сталая аўтарка газэтаў „Наша Ніва“ і „Наша Свабода“

Я ехала на Каўказ з Кіева. Гэтым разам мэтай маёй каўказскай камандзіроўкі меў быць не толькі збор інфармацыі для „Нашай Свабоды“, але і выкананьне гуманітарнай місіі. Разам з украінскімі журналістамі і праваабаронцамі мы планавалі пераправіць канвой лекаў і харчу, нарыхтаваных у Беларусі і Ўкраіне, для чачэнскіх уцекачоў у Грузіі ды Інгушэціі. Паколькі ў Горадні і Менску, дзе дапамогу ўцекачам паўгоду збіралі БНФ і Малады Фронт, не знайшлося добраахвотнікаў, каб суправаджаць сабранае ў Кіеў, вызвалася я.
Гуманітарны груз, сабраны ўкраінскімі праваабаронцамі і каталіцкай царквой, адрозніваўся ад сціплага беларускага вагой і коштам. Усе, хто суправаджаў караван, не хавалі сваіх сімпатый да чачэнцаў. Кантраст з стаўленнем беларусаў да гэтай вайны, з якім я сутыкалася ў Менску, быў надта выразны. Я выйшла на Хрышчацік і зрабіла міні-апытанне людзей на вуліцы: як яны ацэньваюць падзеі на Каўказе? Адказы былі надзіва аднолькавыя — усе людзі выказвалі сімпатыі да чачэнскай незалежнасці. Хоць менавіта ў тыя дні ў

расійскамоўнай кіеўскай прэсе з'явіўся шэраг публікацый пра „чачэнскую мафію". Публікацыі сцвярджалі, што чачэнскія ўцекачы часоў мінулай вайны, аселыя ва Ўкраіне, б'юцца за сферы ўплыву з украінскімі бандытамі. „А ці не робіць наш урад памылкі? Ці трэба даваць уцекачам нейкія правы?" — пыталася жоўтая прэса.

Аднак кіеўцы, відаць, лічаць: мафія не мае нацыі.

Чачэнскім уцекачам ва Ўкраіне дапамагае не тая частка каўказскай дыяспары, што ездзіць на шасцісотых „мэрсах". Гэта часцяком робяць людзі, што не валодаюць ні вялікімі грашыма, ні чачэнскай мовай. А мафія... Яна скрозь аднолькавая ў сваёй маргінальнасці.

У першую расійска-чачэнскую вайну ўкраінскія журналісты схітраліся вазіць гуманітарку на Каўказ на ўрадавым самалёце. Цяпер жа ўлады Ўкраіны імкнуцца стрымліваць сваіх грамадзянаў у іх спробах паўдзельнічаць у вырашэнні праблемаў Каўказу. Таму праходжанне гуманітарнага грузу праз украінскую мытню расцягнулася на доўгія тыдні. Беларуска-ўкраінская „гуманітарка" дасягне свайго месца прызначэння і адрасата, толькі калі гэты тэкст будзе ўжо завярстаны.

У Кіеве кажуць, што неафіцыйная падтрымка з Украіны чачэнцам ідзе. Але ніякіх „украінскіх наёмнікаў" у Чачэніі на баку чачэнцаў цяпер быццам няма. Хіба што пара чалавек, якія засталіся там з мінулай вайны. Самі чачэнцы кажуць, што яны не настолькі дурныя, каб выкарыстоўваць наёмнікаў. У адрозненне ад добраахвотнікаў, яны — патэнцыйныя здраднікі і адна з разнавіднасцяў „бяссмяротна-маргінальнай мафіі". Адзіны жывы кавалер ордэну „Гонар Ічкерыі" — украінец, Аляксандр Музычко, больш вядомы як Сашко Білы, — праз пару месяцаў пасля пачатку цяперашняй вайны ў Чачэніі, па дзіўным супадзенні, апынуўся ў турме. Нібыта з некім пабіўся ў родным горадзе. Там жа, у Роўне, і сядзіць. Суду дагэтуль не было.

Перспектыва тырчання на ўкраінскай мытні з канвоем мяне цешыць мала — усё ж я болей журналістка, чым гуманітарная актывістка. Груз мае дабірацца да месца прызначэння марскім шляхам. Гэта танней, чым самалётам, і надзейней, чым цягніком праз Расію. А я пры першай магчымасці сядаю на „Боінг-737" і лячу з Кіева ў Тбілісі, каб пабачыць тыя мясціны,

куды наш канвой мае прыбыць праз пару тыдняў.
Нібы назло, у дарогу мяне праводзяць грозныя паведамленні расійскіх медыяў: „У Панкіскай цясніне, на мяжы Грузіі і Чачэніі, канцэнтруюцца баевікі для прарыву мяжы. Паводле звестак расійскай выведкі, каля трох тысяч маджахедаў узброеныя пісталетамі, аўтаматамі, „Стынгерамі“, бранятэхнікай… Масква не выключае прэвентыўных удараў па згуртаваннях баевікоў“.
Гэта ж там, куды я лячу! Адрэналіну мне бракаваць, здаецца, не будзе. На мапу Беларусі, што на маніторы ў „Боінгу“ зелянее вышэй чырвонай траекторыі нашага палёту, з усіх сілаў імкнуся не глядзець.

Чачэнскія дыпляматы

— Лукашэнка не дасць за мяне і капейкі выкупу…
Мае спадарожнікі ў машыне маўчаць, але, як відаць у люстэрку, яны злёгку пакрыўджаныя жартам. Я пазнала тых, хто мусіў мяне сустракаць у стракатым грузінскім натоўпе, адразу — па спакойнай цвёрдасці поглядаў і асаблівай, такое ўражанне, толькі чачэнцам уласцівай годнай паставе. Гэтак знаёмыя мне з папярэдніх паездак суворасць, стрыманасць рухаў і адначасна спакой — флегматычнасць на мяжы з фаталізмам!
— Ну дык куды вы падзелі вашага Завадскага? — пытаюцца чачэнцы.
— Куды-куды… Куды і вы — усіх закладнікаў.
Сапраўды, вельмі падобны стыль. У Чачэніі гэта рабілася, каб запалохаць замежнікаў, дыскрэдытаваць краіну, маніпуляваць сітуацыяй. У Беларусі — каб спарадзіць недавер, страх, разгубленасць, сеяць нестабільнасць. Застаецца пралічыць, каму выгадная нестабільнасць.
Калі ідзе вайна, шпіёнаманія — рэч нармальная і часам неабходная. На месцы чачэнцаў я падумала б, што да іх прыляцела або вар’ятка, або дужа хітрая і смелая шпіёнка. Я не ведаю Грузіі, не ведаю Тбілісі, ніводнай вуліцы, ніводнага чалавека. Па-грузінску (а па-грузінску — 99% шыльдаў і надпісаў) ведаю толькі назву віна „Цынандалі“. І ніводнай літары… Я нават не ведаю, як выглядаюць грузінскія лары і які іхні курс!
— Між іншым, з вашымі сябрамі… я знаёмы выключна праз

тэлефон, — карэктна ўшчувае мяне мой спадарожнік з прадстаўніцтва Ічкерыі ў Грузіі.
Называю імёны чачэнскіх журналістаў, знаёмых мне з мінулых камандзіровак у Чачэнію. Нікога з іх у Грузіі, на жаль, няма. У пакоі прыватнага грузінскага гатэльчыка мы частуемся вадой з ільдом (вада ў Грузіі ў кранах, на шчасце, ёсць у любы час сутак, і прытым крынічная, а тэмпература паветра ўначы +26ºС). Тэлефаную ў Кіеў. Чачэнцы прыслухоўваюцца да маёй беларускай гаворкі. Паэт-рамантык напісаў бы, што гэта ад яе мілагучнасці памякчэлі іхнія погляды…

Грузінскі амонавец-апазіцыянер
Званкі сваіх чачэнскіх апекуноў зранку я праспала: ахоўваючы мой сон, гаспадары гатэлю адключылі тэлефон у пакоі. Выхад на міжгорад, натуральна, вырублены. (Увогуле, у Тбілісі вялікія праблемы з тэлефонамі ўсіх відаў і нават інтэрнэтам — фірмы-правайдэры, як і кампаніі, што забяспечваюць мабільную сувязь, час ад часу перажываюць фінансавы крызіс, Грузія — бедная пасляваенная краіна і г.д. І колькі б вы ні тыкалі пальцам у мабільнік, ветлівы жаночы голас будзе вам на ўсіх мовах тлумачыць, што ў сувязі з… мабільная сувязь адновіцца толькі з…)
Арыенцірам у маіх пошуках служыць будынак грузінскага МУС. Усе вакол ведаюць МУС і не ведаюць вулачкі, якая мне патрэбная. Пытаюся дарогу ў нейкіх маладзёнаў у камуфляжных штанах і вайсковых ботах.
— А што вам трэба ў міліцыі? — цікавяцца яны.
Я называюся ўкраінкай, бо для грузінаў пасля вайны ў Абхазіі гэта лепш, чым што іншае. Сімпатыі да ўкраінцаў тут дужа вялікія. Яны матэрыялізуюцца ў белую „Волгу“, на якой мяне ўжо прапануюць падвезці. Звілістыя вуліцы грузінскае сталіцы мільгаюць за вакном аўто з хуткасцю няйначай 200 км на гадзіну.
— Кучма не дасць за мяне ні капейкі выкупу! — перакрыкваючы роў матору, папярэджваю я.
— Абіжаеш! У гэтым горадзе ты цяпер пад маёй аховай. Мы знойдзем тваю вуліцу. Але спачатку трэба забраць грошы ў людзей, якія мне вінаватыя.
Пад „дахам“ майго новага знаёмца Мамукі працуе

аўтарамонтная майстэрня і прыдарожная кавярня па шляху ў аэрапорт… На сёння ўсё. Але тут у „Волгі“ сканчаецца бензін! Іду да фантана і п’ю з яго ваду (так у Тбілісі робяць усе — спёка ўжо +38ºС!). Зноў сядаю. „Волгу“ штурхаюць з горкі. Праз два павароты я пачынаю разумець, што мой лёс — загінуць зусім не на вайне, а на адным з гэтых жахлівых віражоў, такіх нязвыклых жыхару раўніны. Калі мы ляцім ад запраўкі з ранейшай хуткасцю, нарэшце, „Волгу“ спыняе ДАІ. Але Мамука крычыць на даішнікаў па-грузінску, тыя аддаюць чэсць і перапрашаюць. Аказваецца, у Мамукавым пасведчанні кіроўцы стаіць запіс „Войскі МУС спецыяльнага прызначэння“…
Пакуль мы знаходзім „маю“ вуліцу, я шчэ паспяваю даведацца ад спецназаўца, што ў краіне — бардак, улада карумпаваная, Шэварднадзэ — незразумелая асоба, народ зарабляе па 5–10 даляраў у месяц з затрымкамі на год. Што краіне не мінуць паўстання, у турмах — 70 палітвязняў, у гарах — звіядысты…
— А паслязаўтра я еду ў Зугдыды — у кардоне буду стаяць на мітынгу, — дадае Мамука. — Там забілі аднаго апазіцыянера… Не, двух…
Загадкавая краіна! Кагэбісты тутака кіруюць паўстаннямі, а ў кардонах стаяць амонаўцы-апазіцыянеры.

„Амбасада“ Ічкерыі

У жыцці чачэнскага прадстаўніцтва ў Тбілісі ўражвае зацятае імкненне да „нармальнасці“: тут не плачуць, не праяўляюць ваеннай істэрыі, спрабуюць жартаваць і намагаюцца ўнікаць і панікі, і эйфарыі.
Вымушана стрыманае стаўленне грузінскіх уладаў да чачэнскіх прадстаўнікоў успрымаецца тутака як нармальнае. Пры мне намеснік афіцыйнага прадстаўніка Ічкерыі ў Тбілісі Ваха Ібрагімаў супакойвае расійскіх чачэнцаў з Самары, што прыехалі ў Грузію па справах і мелі некаторыя праблемы з-за графы „нацыянальнасць“ у пашпартах (нашыя беларускія пашпарты — самыя „несавецкія“ ў былым Саюзе, калі ацэньваць па адсутнасці „пятай графы“ і ператварэнні агульнаграмадзянскага пашпарта ў замежны праз адну пячатку „…ва ўсе краіны свету“). Чачэнцы з Самары хваляць свайго губернатара, які стварыў нармальныя ўмовы жыцця для

ўцекачоў. А тут, маўляў…
— Ну дык і я маю праблемы з паездкамі! — усклікае спадар Ібрагімаў. — Калі б Чачэнія была прызнаная міжнароднай супольнасцю, а Грузія не баялася Пуціна, я меў бы дыпламатычны статус…
Я, як і іншыя замежныя журналісты, хачу ўзяць інтэрв'ю ў Аслана Масхадава. Расійскае TV кажа, што месцазнаходжанне Масхадава невядомае. У прадстаўніцтве мне адразу кажуць: „Ён там, дзе і мае быць лідэр". У гарах. Існуюць, кажуць мне, два спосабы пагутарыць з чачэнскім прэзідэнтам асабіста. Першы — чакаць, калі ён сам выйдзе на сувязь у зручны для яго момант. Другі — перакрочыць грузіна-чачэнскую мяжу і знайсці яго ў гарах. Першае цяжка, другое — немагчыма, кажуць мне… Або наадварот: першае немагчыма, другое — цяжка.
У прэс-цэнтры прадстаўніцтва супольную мову з калегамі знаходзім адразу.
— Разбіраешся ў Інтэрнэце? Зірні, што ў нас тут здарылася?..
А ўжо праз хвіліну:
— Глядзеце, яна ўлезла ў наш сакрэтны файл! Та-ак, замыкаем дзверы! Куды будзем спускаць труп?
Адарваўшыся ад чытання інфармацыі пра пасяджэнне масхадаўскага ўраду ў горным сяле, я рагачу.
— А што ты смяешся? Хіба ты не глядзела ОРТ, што мы тут людзей жыўцом ямо?! — усклікае адна з чачэнак.
Мы знаёмімся. Бялявую гаранку завуць зусім па-наску — Марына. Яна працуе тут жа, у прадстаўніцтве.
Якое дзіва, што гэтыя людзі, чачэнскія журналісты, яшчэ ўвогуле ў стане смяяцца і жартаваць!
Яны таксама ірвуцца на поўнач, праз памежны перавал, але не столькі па здымкі і інфармацыю, як я, колькі каб даведацца пра лёсы сваіх родных. Вось калега з тэлебачання, Раіса, вясёлая, прыгожая маладая жанчына, з моднай стрыжкай, відаць, па характары гарэза… Яна згубіла сваіх маці і 6-гадовую дачку. Ведае толькі, што іх няма ў лагерах у Інгушэціі і што ў Чачэніі ніхто са знаёмых іх не бачыў. Вось і ўсё. Але працягвае працаваць. Мы з Раісай аднагодкі. Мне робіцца сорамна, што „кісну" ад трохтыднёвага расстання з дачкой. Чачэнцы гордыя, ніколі на свае цяжкасці незнаёмаму чалавеку, хоць сабе і журналісту, не скардзяцца. Проста канстатуюць факт.

Падобных да Раісінай гісторыяў у розных варыянтах я пазней пачула шмат. Толькі калі сыдзешся з імі бліжэй, можна адчуць таксама нейкія эмоцыі.
— Фактычна шанцаў выжыць у нас няма, — кажа Раіса ці то пра журналістаў, якія маюць хутка ехаць здымаць фільм пра вязняў расійскіх канцлагераў, ці то пра ўвесь свой народ.

Вяселле ў часе вайны
У суботу ўсіх чачэнцаў запрашаюць у Ахмецкі раён, сяло Амала — на вяселле. Гэта памежныя тэрыторыі, тут жывуць, акрамя грузінаў, кісцінцы (грузінскае карэннае насельніцтва чачэнскай нацыянальнасці). Мы праязджаем таксама армянскае і габрэйскае сёлы. Дзе жывуць людзі мусульманскай веры, вызначыць проста: там вакол вёскі пасвяцца не кабанчыкі, а авечкі. Часам сустракаюцца маленькія мячэты са срэбнымі купаламі.
У Панкіскай цясніне знайшлі прытулак не менш за 6500 уцекачоў з Чачэніі — іх ці не больш, як саміх кісцінцаў. Прычым гэта толькі лічба тых, хто атрымаў пасведчанне ўцекача, паводле неафіцыйных звестак эмігрантаў удвая болей. Агульнай жа колькасці ўцекачоў ува ўсёй Грузіі ніхто не можа даць: многія знаходзяцца тутака транзітам, кіруючыся пасля ў ісламскія ці заходнія краіны. Калі ў канцы мінулага году праз перавал сюды хлынулі ўцекачы, мясцовае насельніцтва разбірала іх жыць у хаты па некалькі сем'яў на падворак і раздавала ўсе нарыхтаваныя на зіму запасы. Потым у Панкіскай цясніне з'явіліся заходнія медыкі з арганізацыі „Лекары без межаў". Яны і цяпер працуюць у шпіталях (адзін з іх мы бачылі ў ваколіцах Амала), а таксама ў Тбілісі. Замежныя дабрачынныя арганізацыі прывезлі для ўцекачоў лёгкія пераносныя дамкі, якія збіраюцца з фанеры й дошак. Мы бачылі цэлы квартал такіх хатак у сяле Дуісі. Трэба сказаць, што ад самага пачатку чачэнцы арганізавалі ахову замежных лекараў. Некаторыя з іх нават кажуць, што кроку без ахоўніка не ступіш, і хочуць больш смастойнасці ў перамяшчэннях. Начальнік аховы лекараў, Беслан, гэтага не дазваляе. „Перад самай вайной у Дагестане бандыты ўзялі ў закладнікі майго стрыечнага брата, — кажа ён. — Адрэзаныя пальцы і здзёртыя

пазногці, што паказвала тэлевізія — усё гэта было з ім. Патрабавалі за брата 200 тысяч даляраў, і каб мы не назбіралі, дзе маглі, большую частку — яго закатавалі б!“ Беслан яшчэ раз паўтарае, што гэта было яшчэ перад вайной, а ўжо што можна чакаць зараз?! Таму лекары мусяць слухацца аховы. Платы з аблезлай фарбай, перасохлыя ад спёкі рэчышчы, дарогі, на якіх машыны ездзяць зігзагамі, мінаючы яміны… Але беднасць краіны — а Грузія сапраўды глядзіцца як вельмі бедная краіна — у кісцінскіх сёлах чамусьці не так моцна кідаецца ў вочы. Людзі тутака вядуць амаль натуральную гаспадарку. Абсалютна ўсё, чым нас частавалі на вяселлі ў Амала, ад хлеба й рыбы да віна ды традыцыйнае алычовае падлівы, вырашчана, выгадавана, злоўлена, выраблена самымі гаспадарамі тутсама, ля вытокаў ракі Алазані.

Кісцінцы аднолькава лёгка гавораць як на грузінскай, так і на чачэнскай мовах. Тут, у цясніне, стагоддзямі перапляталіся дзве культуры, спаконвеку жывуць людзі розных вераў. Тосты на вяселлі, доўгія і красамоўныя, прамаўляліся пераважна па-чачэнску. Паводле каўказскіх традыцый, мужчыны выслухоўваюць тост, стоячы, насупраць жанчын. Апошнія ж не мусяць уставаць, нават калі тост — за Бацькаўшчыну, інакш будзе закрануты мужчынскі гонар.

Грузіны ў цэлым, а пагатоў на чачэнскім памежжы, настроеныя да чачэнцаў вельмі прыхільна. На вяселле дачкі сям’я вывесіла нацыянальны чачэнскі сцяг, машыны гасцей былі аздобленыя партрэтамі палявых камандзіраў чачэнскага супраціву, а самы эмацыйны тост вясельны маршалак прамовіў не за здароўе маладых, а за Вольную Ічкерыю. Менавіта ў гэты момант перастала плакаць 15-гадовая нявеста. Маладому было 18 гадоў, ён прывёз абранніцы белую сукенку і, згодна з традыцыяй, паехаў чакаць яе ўдома, у суседнім сяле Джакола. Чачэнцы кажуць, што цяпер такі ранні шлюб — рэдкасць, хоць маці маладой пад традыцыйнай хусткай выглядала на гады 32. Зрэшты, нават у ваеннай Чачэніі я не бачыла жанчыны, якая б не выглядала маладзейшай за свой век.

Бялявая чачэнка Марына аказалася родам менавіта з Джакола. Тут нярэдка сустракаюцца славянскія жаночыя імёны.

Не ўсе жанчыны-мусульманкі былі на вяселлі ў хустачках. Незамужнія і разведзеныя галоваў не спавіваюць. Астатнім часам некаторыя чачэнкі завіваюць хусты вельмі мудрагеліста,

як у часопісах моды. (Пры гэтым, хітра падміргнуўшы, адна з кісцінак цішком весела пытаецца ў мяне: „Як табе мая новая паранджа?“)
Адзін раз у Амала я чула стрэлы. Гэта быў салют. Чачэнскае вяселле без салюту немагчымае. У першую вайну пасля падзеяў у Будзёнаўску, калі баевікі дамагаліся перамоваў з расійскімі войскамі, Масхадаў строга забараніў салюты — абстаноўка была вельмі напружаная, нягледзячы на кароткае замірэнне. У сяле Гермянчук у маладога на вяселлі душа не вытрымала. У адказ на салют пачаўся артылерыйскі абстрэл. Нявеста была параненая ў нагу.
У Амала салютуюць з аўтамата хлапчукі гадоў адзінаццаці. Яны паляць у неба з надзвычайным захапленнем, пакуль аўтамат не адбіраюць і не хаваюць дарослыя. Я гутару з малымі, і яны ўсе, як адзін, кажуць, што, калі вырастуць, будуць героямі Ічкерыі…
Адзіныя людзі ў вайсковай форме ў Панкіскай цясніне — грузінскія паліцыянты. Летась пад восень тут збудавалі пару блок-пастоў і пастарункаў. Аднак нас у дарозе ў Амала ніхто ні разу не спыніў. Кантроль паліцыі над памежжам быў узмоцнены летась пасля візіту ў Грузію кіраўніка расійскага МУС Рушайлы на ягонае запатрабаванне. Але кантроль гэты досыць фармальны, бо грузінскія сілавікі, і асабліва памежнікі, самі скрайне незадаволеныя дзеяннямі Расіі. Маладыя грузінскія сілы бяспекі з вялікаю рэўнасцю й недаверам пазіраюць на войскі чатырох расійскіх ваенных базаў у Грузіі; пачуццё крыўды ўзмацнілася й тым, што ўзімку памежныя грузінскія сёлы (Шацілі і іншыя) бамбіла расійская авіяцыя. Існуе й тэрытарыяльная спрэчка: над Курой лічаць, што Расія незаконна адхапіла два грузінскія паселішчы, перанёсшы памежную лінію сама менш на два кіламетры ў нутро грузінскай тэрыторыі. Матывацыя Расіі — гэтак граніцу праводзілі на мапах часоў СССР.
Грузінскія палітычныя эліты пры маўклівай згодзе прэзідэнта Шэварднадзэ дазваляюць сабе перыядычныя антырасейскія выпады. Напрыклад, калі на Шэварднадзэ быў зроблены замах, старшыня парламенту Зураб Жванія адразу звярнуў увагу на тое, што напярэдадні замаху дзіўны самалёт прылятаў на расійскую вайсковую базу ў Вазіані, што пад Тбілісі…
Грузінскія ўлады не маюць дастатковай вайсковай сілы, каб

перашкодзіць бамбаванням Ахмецкага раёну расійскай авіяцыяй. Усё ж, нягледзячы на гэта, жыхары Панкіскай цясніны весяляцца. У сяле Джакола мы пабачылі народнае свята са старажытным чачэнскім цыркам. На вышыні 4—5 метраў нацягнута вяроўка для спаборніцтваў эквілібрыстаў-добраахвотнікаў. Вяртлявы „чорт“ у масцы пужае народ, сцябаючы па нагах бічом. Усе смяюцца, некаторыя дзеці плачуць, але іх ніхто не суцяшае — няхай самі разбіраюцца, дзе страшна і хто насамрэч злы.

Іса і Магамет

Мой праваслаўны абразок (дарэчы, талісман з мінулай расійска-чачэнскай вайны) і каталіцкі малітоўнік (выдадзены беларускай лацінкай у Вільні) ляжаць побач з Каранам і ружанцам... Каран падарылі сябры. Адзін з іх — кісцінец з памежжа, другі — студэнт Грузінскага ўніверсітэту родам з Грознага, трэці служыў у ахове Масхадава (і, здаецца, нават вёз нас некалі да кіраўніка Ічкерыі на інтэрвію — прынамсі, мы недзе бачыліся). Каран выдадзены ў Мэдыне, вельмі прыгожа аздоблены.

Сябры час ад часу моляцца у суседнім пакоі.

Ісус, альбо Іса, у мусульманаў лічыцца вялікім прарокам. „Гэта перадапошні пасланец Бога. Людзі не сталі жыць па Божых запаветах, і тады Ён паслаў ім Магамета. Больш нікога не будзе…“

Ісусава жыццё мусульмане ведаюць лепш, чым некаторыя з хрысціянаў. Каран прыпісвае прароку Ісу словы, якія тлумачаць запавет „Не забі“. Сэнс такі: нельга праліваць на зямлі кроў, бо яна змываецца з зямлі толькі крывёю тых, хто яе праліў. Нельга рабіць зло, інакш яму не будзе канца…

Пераважная большасць чачэнцаў вызнае суфізм — найбольш містычную і фаталістычную плынь у ісламе. Містыцызм суфізму мяжуе з паганствам, перажыткі якога, нягледзячы на семсот гадоў ісламізацыі (монатэістычная рэлігія прыйшла ў Чачэнію прыкладна ў адзін час, як і ў Беларусь), усё яшчэ жывыя на поўнач ад Каўказу.

— Прапаведаваць іслам — святы абавязак кожнага мусульманіна, — паведамляюць мне хлопцы, і частка іх спяшаецца на лекцыю арабскай мовы.

— А прымушаць мяне прыняць іслам — таксама?
— Не, пра гэта ў Каране нічога не напісана!
Мае сябры — не вахабіты, але многія з іх не бяруць у рот спіртнога, нават піва. „Гэта грэх, бо наш народ цяпер пакутуе. Мы разам з ім душой. А таму мы нават тут — воіны Аллага!“
І мне згадаліся менскія кухні і іншадумства беларусаў пад звон чарак…

Баевікі і камікадзэ

— Ну дык і што вы хацелі даведацца ў Масхадава? — пытаецца ў мяне адзін з сапраўдных, як кажа расійскае тэлебачанне, „баевікоў“.
Мы гутарым доўга. Ні ў кога з іх няма ні вахабіцкіх бародаў, ні прыкметаў вайсковага чалавека.
Даведваюся ў іх сёе-тое і пра сваіх знаёмцаў. Аказваецца, мой калега з інфармацыйнага агенцтва „Чачэнпрэс“ Хамід Хатуеў, які шмат дапамог некалі ў папярэдніх паездках у Чачэнію, сядзіць у турме за распаўсюджанне на акупаваных тэрыторыях незалежнай чачэнскай прэсы. Легендарны былы камандзір спецвойскаў дзяржбяспекі Ічкерыі Ваха па мянушцы „Адзінокі Воўк“, хоць мне і распавялі раней мо пяць варыянтаў яго гібелі, на самой справе толькі паранены асколкам. Ваха лечыцца ў адной з краінаў Каўказу. Ваха — гэта чачэнскі Штырліц, пра яго ніхто нічога дакладна ведаць не можа, акрамя яго самога.
Згодна з указам прэзідэнта Масхадава, усё мужчынскае насельніцтва Чачэніі, акрамя параненых, не мае права пакідаць тэрыторыю рэспублікі. Выключэнне — на лячэнне альбо для выканання заданняў ураду Ічкерыі.
У самой Чачэніі працягваюцца масавыя арышты і бамбёжкі мяцежных паселішчаў. Любыя перамяшчэнні ад сяла да сяла, ад гораду да гораду забароненыя. З прадстаўнікоў СМІ права свабодна ездзіць па „вызваленых“ тэрыторыях маюць толькі супрацоўнікі вайсковага прэс-цэнтру. Астатнія — толькі ў суправаджэнні федэралаў.
Пытаюся пра чачэнскіх камікадзэ.
Першымі бамбісткамі-смяротніцамі сталі дзяўчаты. 6 чэрвеня гэта зрабілі ў Алхан-Юрце 22-гадовая Хава Бараева, стрыечная сястра палявога камандзіра Арбі Бараева, і яе 18-гадовая сяброўка Фаціма, накіраваўшы нагружаныя выбухоўкай

грузавікі на казармы расійскіх войскаў. Загінулі 27 вайскоўцаў. Учынак Хавы і Фацімы чачэнцы параўноўваюць з падзеямі ў сяле Дадзі-Юрт у XVIII стагоддзі. Царскія войскі зраўнялі аул з зямлёю, пакінуўшы толькі 46 дзяўчат дзеля сваіх уцехаў. Калі дзяўчат вялі праз вісячы мост пад канвоем салдат, кожная з іх кінулася на канваіра і разам з ім упала ўніз, разбіўшыся насмерць і забіўшы свайго ворага.

А вось гісторыя з вайны, што адбываецца ў 2000 годзе.

У Шалях федэралы месцяцца ў камендатуры, якая моцна ахоўваецца і мае доўгі двор. Будынак стаіць у некалькіх дзесятках метраў за высокім плотам. Але штовечара ў камендатуру сталі залятаць і разрывацца гранаты. Штодня прачэсваліся ваколіцы, але расійцы не маглі знайсці ні баевікоў, ні гранатамётаў.

І толькі праз тыдзень затрымалі 12-гадовага падлетка. Яго злавілі на адным з бліжэйшых дрэваў. У засені лістоты дзеці змайстравалі прыладу накшталт вялізнай рагаткі. Калі цямнела, яны рассоўвалі галіны і выстрэльвалі гранатамі. Хлопчыка быццам бы моцна білі, але не забілі. Ён аказаўся сынам аднаго з мясцовых прарасійскіх актывістаў.

Нажай-Юрцкі, Вядзенскі і Каланчорскі (былы Савецкі) раёны Чачэніі цяпер застаюцца пад уладай Масхадава. У гэтых жа раёнах сабралася нямала ўцекачоў з поўначы краіны, ніхто з якіх не жадае вяртацца дадому. Масхадаву некалькі разоў удавалася выходзіць з паходнага тэлетранслятара ў жывы эфір ОРТ. Прэзідэнт Ічкерыі даў федэральным войскам месяц на роздумы — да восені. „Калі сыдзеце з нашай зямлі самі, будзе менш стратаў і крыві“. Калі гэты нумар часопіса будзе надрукаваны, тэрмін, вызначаны Масхадавым, міне.

„Сакрэт чачэнскага поспеху ў тым, што няма ніякіх сакрэтаў, — смяюцца „баевікі“. — Памятаеш штурм Грознага ў 96-м? Мы ж казалі, што 6 жніўня возьмем горад. Усе смяяліся. 6-га мы пайшлі і ўзялі“.

…У дзень майго ад’езду тэлефон у гатэлі рвецца на часткі. Усе чачэнскія знаёмыя лічаць абавязкам пакарміць мяне на дарогу. Многія зайздросцяць мне: у 97-м я была ў Масхадава дома! Я па-журналісцку зайздрошчу ім: у іх болей шанцаў сустрэцца з кіраўніком чачэнскага супраціву ў 2000-м.

Самалёт пералятае Вялікі Каўказскі хрыбет. На схілах гор бялее снег, Грузію і Ічкерыю падзяляе цёмны лес і скалы з белымі

плямамі снегу. Дзесьці тут вытокі ракі Алазані. Да Масхадава адсюль якая сотня кіламетраў!..
Праз два дні тэлефонны званок у Менск сведчыць: мае новыя знаёмцы перасеклі грузіна-чачэнскую мяжу… „Ты не чачэнка, а значыць — маеш шанец жыць“, — з чорным гумарам жартуюць яны. А мне застаецца яшчэ раз нагадаць ім, што падкантрольныя Масхадаву тэрыторыі жывуць па ўсходнееўрапейскім часе, а значыць — па тым жа самым, што і мой Менск.

Калі тэкст вярстаўся, гуманітарны канвой яшчэ так і не пакінуў тэрыторыі Ўкраіны: Служба Бяспекі краіны не дапусціла „несяброўскага“ акту напярэдадні саміту СНД у Ялце.

Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Максім Маскалёў
Апошняе абнаўленьне: **22-03-2001**
[image]

Жан-Шарль Ляльман

Інтэграцыйная стратэгія Лукашэнкі

ЖАН-ШАРЛЬ ЛЯЛЬМАН палітоляг, супрацоўнік парыскага Інстытуту навуковых дасьледаваньняў. Укладальнік і рэдактар зборніка Les confins de l'OTAN: l'espace mer Baltique - mer Noire / Nouveaux Mondes (Жэнэва - Парыж, 1999), паводле якога перакладзены артыкул у гэтым нумары. Ён публікуецца з ласкавае згоды аўтара і жэнэўскага Цэнтру дасьледаваньняў

Пасьля прыходу Аляксандра Лукашэнкі да ўлады ў Менску загучалі настойлівыя заклікі да яднаньня з Расіяй. Кіраўнікі Расіі й Беларусі пачалі сустракацца ўсё часьцей, і вынікам гэтых спатканьняў сталі розныя пагадненьні й дамовы, якія, меркавалася, павінны паглыбіць інтэграцыю паміж дзьвюма краінамі. Пры гэтым пэрспэктывы поўнага зьліцьця краінаў адсоўваліся на няпэўны тэрмін.

Павелічэньне колькасьці падпісаных дамоваў ня служыць аўтаматычным паказчыкам „геапалітычнай эфэктыўнасьці“. Частыя сустрэчы Лукашэнкі і Ельцына служылі перадусім умацаваньню іхняга іміджу „палымяных інтэгратараў“ на ўнутрыпалітычнай арэне, а парадак дня іхных сустрэчаў не вычэрпваўся толькі беларуска-расійскімі адносінамі. „Карту“ саюзу зь Беларусяй Масква часьцяком выцягвала ў часе перадвыбарчых кампаній у Расіі і ў тыя моманты, калі абвастраліся яе стасункі з NATO.

З пачатку 1999 году меркавалася пашырыць расійска-беларускі саюз за кошт Югаславіі, тым часам як пытаньне пра

паглыбленьне саюзу шляхам поўнага аб'яднаньня ў дзяржаву заставалася далёкім ад вырашэньня. „Сапраўдны“ застаецца інстытуцыяй кульгавай і яшчэ не дасягнуўшай звычайнай канфэдэрацыі. Адзінага вайсковага блёку не існуе. Праекты валютнага саюзу, сыстэмы двайнога грамадзянства або выбараў прэзыдэнта саюзу праз усеагульным галасаваньнем час-часом скаланаюць палітычныя і мэдыйныя колы Менску й Масквы, але іх тут жа хаваюць або адкладаюць *sine die*. Аднак розныя афіцыйныя сустрэчы і цырымоніі, усе элемэнты як расійскага, так і беларускага палітычнага дыскурсу ўрэшце пачынаюць выконваць сваю ролю, у сваім комплексе спрыяючы ўмацаваньню „асаблівых“ стасункаў між дзьвюма краінамі. Якім бы няўстойлівым ні быў саюз, яму ўсё ж удалося стаць бар'ерам на шляху стварэньня моцнае геапалітычнае восі краінаў Балтачарнаморскага рэгіёну, пра якую гаварылі лідэры незалежніцкіх рухаў у гэтых краях на пачатку 90-х. Да таго ж, хоць Масква й неахвотна фінансуе канкрэтныя сумесныя праекты, Менск не бяз посьпеху кампэнсуе гэты прабел прамымі кантактамі з расійскімі рэгіёнамі.

прадпрыемстваў, Сапраўдны саюз, вынайсьці Nouveaux Mondes.

Макраэканамічная няўстойлівасьць саюзу

Несымэтрычнасьць саюзу між дзьвюма настолькі рознакалібарнымі краінамі тлумачыць пэўныя разьбежкі ў падыходах і той факт, што кожны з бакоў трымаецца сваіх пазыцыяў. На Беларусь прыпадае толькі 3% аб'ёму замежнага гандлю Расіі. Затое для Беларусі Расія — бясспрэчна галоўны гандлёвы партнэр, куды ідзе 64,9% беларускага экспарту і адкуль паступае 54,3% імпарту[*]. Расійскі рынак фармуе пад 40% беларускага ВНП.

Вось чаму на замежным гандлі Беларусі гэтак моцна адбіўся расійскі крах лета 1998 году. Агульны аб'ём замежнага гандлю Беларусі ў 1998 годзе склаў 15,5 мільярдаў даляраў, што на 2,9% меней, чым у 1997 годзе, і гэта тлумачыцца найперш крызысам расійскага рубля. Але скарачэньне расійскай долі ў беларускім імпарце ды экспарце адбылося за кошт нарошчваньня грашовых апэрацыяў, тады як аб'ём бартэрных здзелак істотна ўзрос (з 34% ад агульнага аб'ёму экспарту да 42%). Беларускі імпарт з Расіі цяжка скараціць, бо ён складаецца

[*] Тут і ніжэй — паводле афіцыйных дадзеных. Індыкатарыя 1999 году пакуль што

пераважна з энэргарэсурсаў, безь якіх нельга абыйсьціся. У свой час Беларусь адмовілася ад праектаў пабудовы нарыхтовацца, калектару, што злучаў бы тэрміналы Украіны й Латвіі, на таксама паставіла крыж на праекце пабудовы ўласнай літаўскай электрастанцыі. Энэргетычная залежнасьць і запазычанасьць за энэрганосьбіты — гэта той камень, аб які спатыкаецца ў двухбаковыя адносіны з Расіяй, і адначасова галоўная тэма для абмеркаваньня на кожным паседжаньні выканкаму сукаў. Запазычанасьць найбуйнейшых беларускіх дзяржаўных канцэрнаў расійскім дзяржаўным ці прыватным групам — гэта фактычна „нябачнае“ фінансаваньне Беларусі Расіяй. Бо сапраўды, імпарт энэрганосьбітаў мог бы паглынаць 90% усіх валютных паступленьняў Беларусі, калі б ён часткова не пакрываўся за кошт бартэру. Найбольшым цяжарам для Беларусі застаецца закупка газу, хоць Расія і прадае яго Беларусі па цане, удвая ніжэйшай за сярэднеэўрапейскую. Запазычанасьць „Газпрому“ з 1998 году трымаецца на ўзроўні прыкладна 250 мільёнаў даляраў, яшчэ 80 мільёнаў краіна вінная за нафту.

У 1998 годзе „Газпрому“ прыйшлося пагадзіцца з тым, што Беларусь на 74% расплочвалася за газ бартэрам (згодна зь міжурадавымі пагадненьнямі Менск адпраўляе ў Маскву розную тэхніку і абсталяваньне беларускай вытворчасьці, мясныя кансэрвы, а таксама… збожжа й рыс, вытворцам якіх Беларусь не зьяўляецца). Галоўны атрымальнік гэтых тавараў з расійскага боку — Міністэрства абароны, бо „Газпром“ расплочваецца гэтым самым бартэрам за свае запазычанасьці перад фэдэральным бюджэтам, і фэдэральны цэнтар, ня маючы іншага выйсьця, мусіць пагаджацца. Цяжка вызначыць, па якіх цэнах праводзяцца гэтыя ўзаемазалікі; становішча з бартэрам нельга лічыць доўгатэрміновым вырашэньнем.

У сакавіку 1999 году „Газпром“ скараціў свае пастаўкі ў Беларусь з 44 да 32 мільёнаў кубамэтраў газу штодзённа. Беларусь хацела б атрымліваць газ па цане, устаноўленай для расійскіх спажыўцоў. „Газпром“ жа пагаджаецца на такое толькі пры ўмове, што за пастаўкі Беларусь будзе расплочвацца валютай.

Іншы прыклад непаразуменьняў у эканамічнай сфэры між Беларусяй і Расіяй — спрэчкі вакол таго, хто будзе кіраваць беларускай нафтавай і нафтахімічнай галіной. Складаная

гульня вядзецца вакол двух буйных нафтаперапрацоўчых заводаў (Наваполацкага і Мазырскага). А.Лукашэнка, з аднаго боку, хоча захаваць дзяржаўны кантроль над гэтымі прадпрыемствамі ў складзе канцэрну-гіганта „Белнафтахім“, а з другога — выкарыстаць іх у якасьці інструмэнта інтэграцыі з расійскімі нафтавымі кампаніямі, у першых шэрагах якіх — „Лукойл“, „Юкас“ і „Слаўнафта“.

Беларусь — рэгіёны Расіі

Моцным ходам А.Лукашэнкі ў адносінах Беларусі й Расіі ў апошнія гады быў выхад на расійскія рэгіёны. Адным з галоўных шляхоў, якім улады Беларусі разьлічваюць разьвіваць замежны гандаль краіны, зьяўляецца беспасярэдняе супрацоўніцтва з расійскімі рэгіёнамі. У Расіі рэгіянальныя лідэры (губэрнатары вобласьцяў і прэзыдэнты рэспублік) ад 1990 году ўвесь час павышалі свой уплыў. Яны дасягнулі высокай ступені аўтаноміі ад Масквы і паўнаўладна пануюць у сваіх землях. Так, у 1996 годзе прэзыдэнт Ельцын урэшце пагадзіўся на беспасярэднія ўсеагульныя выбары мясцовых кіраўнікоў, тады як з 1991 да 1996 году ён іх прызначаў. А.Лукашэнка выкарыстоўвае цяперашнюю „дзікую“ рэгіяналізацыю Расіі ў сваіх інтарэсах (хоць ніякай самастойнасьці беларускім рэгіянальным кіраўнікам не дае). Стратэгія беспасярэдніх „гарызантальных“ кантактаў з расійскімі рэгіёнамі атрымала бурнае разьвіцьцё пасьля 1997 году. Палітыка актыўнай падтрымкі буйных беларускіх прадпрыемстваў, што пачала рэалізоўвацца з 1996 году, адразу прывяла да рэзкага росту запасаў гатовай прадукцыі на складах — не было пакупнікоў. Рэгіёны Расіі былі вызначаныя як патэнцыйныя рынкі збыту, здольныя паглынаць танныя беларускія тавары, якасьць якіх мо й саступае самым высокім міжнародным стандартам, але ўсё ж пераўзыходзіць сярэднерасійскі ўзровень. За адзін 1997 год гандаль між Беларусяй і расійскімі рэгіёнамі ўзрос больш чым на 30%.

Гандаль Беларусі з расійскімі рэгіёнамі ажыцьцяўляецца найчасьцей праз бартэр (які складае да 60% ад агульнага аб’ёму). Рэч у тым, што эканоміка расійскіх рэгіёнаў за апошнія гады няспынна дэманэтарызавалася. Са свайго боку, беларускі

рубель моцна абясцэніўся з-за інфляцыі і ў выніку расійскага фінансавага краху ўлетку 1998 году. Таму ніводзін з бакоў ня мог расплочвацца цьвёрдай валютай за атрыманую прадукцыю. Дэманэтарызацыя вонкавага гандлю прыводзіць да ўзмацненьня ролі беларускай бюракратыі і бюракратыі расійскіх рэгіёнаў у справе мабілізацыі рэсурсаў гаспадарчых структураў. Уцягваючы беларускія прадпрыемствы ў складаныя ланцужкі натуральнага абмену, што бяруць пачатак на расійскай тэрыторыі, А.Лукашэнку ўдаецца, так бы мовіць, іграць у пасярэдніка між Масквою, губэрнатарамі і буйнымі расійскімі прамысловымі групамі.
Расійскія рэгіёны асабліва ахвотна купляюць беларускія прадукты, угнаеньні і тэхніку: трактары, грузавікі, сельгасмашыны. Варта адзначыць, што трактары МТЗ „Беларус“ практычна замянілі сабой беларускі рубель у замежным гандлі краіны, прычым ня толькі з расійскімі рэгіёнамі, але і з краінамі Бліжняга Ўсходу і Азіі. Гэтак, 60% трактарнага парку Пакістану — беларускага паходжаньня. „Беларусы“ шчыруюць таксама ў Іране, Сырыі, Эгіпце, Кітаі, Індыі.
А.Лукашэнка заўзята праводзіў сярод расійскіх губэрнатараў сапраўдную рэклямную кампанію беларускіх тавараў. Палітыка прыватных візытаў Лукашэнкі выклікала нават дыпляматычны скандал улетку 1997 году, калі Барыс Ельцын забараніў яраслаўскаму й ліпецкаму кіраўнікам прымаць А.Лукашэнку, які не хацеў арганізоўваць свае кантакты з расійскай глыбінкай праз пасярэдніцтва Масквы. Але ўрэшце Барыс Ельцын саступіў і асабіста дазволіў візыт А.Лукашэнкі ў Яраслаўль (дзе знаходзіцца нафтаперапрацоўчы завод, што належыць расійска-беларускай кампаніі „Слаўнафта“). І зь зімы 1997 году А.Лукашэнка без канца сноўдаецца па Расіі, а дэлегацыі расійскіх краёў і вобласьцяў наведваюцца ў Менск. За 1998 год Лукашэнка нанёс 8 такіх візытаў, а ў Менск прыехалі 23 дэлегацыі расійскіх рэгіёнаў. Сярод самых гучных візытаў Лукашэнкі былі паездкі ў Навасібірск і Ўладзівасток у лютым, у Мурманск і на Паўночны флёт у сакавіку, у Кемерава, Омск і Томск у кастрычніку. Так, рэгіён за рэгіёнам, Беларусь усталявала сувязі амаль з усёй Расіяй, падпісваючы двухбаковыя пагадненьні (такіх дамоваў на май 1999 году налічвалася 67). Гандлёвыя сувязі зь Беларусяй падтрымліваюць больш за 80 расійскіх рэгіёнаў. Больш за тое, у

15 рэгіёнах Беларусь адкрыла свае сталыя гандлёвыя прадстаўніцтвы, якімі кіруюць прадстаўнікі найбуйнейшых дзяржаўных канцэрнаў, мэта якіх — разьвіваць бартэрны гандаль.

Галоўны спажывец беларускай прадукцыі ў Расіі — Масква. Расійская сталіца купляе танныя беларускія харчовыя тавары. Вось ужо некалькі гадоў гэтыя сувязі змацоўваюцца асабістым сяброўствам А.Лукашэнкі і маскоўскага мэра Юр'я Лужкова. Гэтыя два палітыкі хваляць адзін аднаго, называюць „моцнымі гаспадарнікамі". Масква і вобласьць спажываюць каля 40% беларускага экспарту ў Расію, але тутака варта ўдакладніць, што да фінансавага краху, які адбыўся летам 1998 году, у Маскве канцэнтравалася 80% расійскага капіталу. Іншыя важныя рэгіёны беларускага экспарту — Цюмень, Татарстан, Інгушэція, Пецярбург. Імпарт паступае ў Беларусь з тых самых Цюмені, Масквы, Пецярбургу, але таксама зь Яраслаўлю ды Сьвярдлоўску.
А.Лукашэнка выкарыстоўвае магчымасьці для ўдзелу ў любых расійскіх структурах, адкрытых для Беларусі. У ліпені 1999 году чатыры беларускія вобласьці (Менская, Віцебская, Магілёўская, Гомельская) далучыліся да міжрэгіянальнай асацыяцыі „Цэнтральная Расія", у якую ўваходзяць 11 расійскіх рэгіёнаў, у тым ліку Масква, з яраслаўскім губэрнатарам, блізкім да Юр'я Лужкова, на чале. Беларускі прэзыдэнт знайшоў сабе таксама ўплывовых партнэраў сярод кіраўнікоў Міжрэгіянальнай асацыяцыі „Паўночны Захад", у якую ўваходзяць 12 рэгіёнаў на чале зь Пецярбургам. Эканамічнае супрацоўніцтва з гэтай асацыяцыяй паглыбілася з 1998 году. Ленінградзкая вобласьць атрымлівае зь Беларусі трактары МТЗ у абмен на пецярбурскія трактары „Кіравец". З Валагодзкай вобласьці Беларусь атрымлівае сталь, выраблену на Чарапавецкім мэталургічным камбінаце ў абмен на менскія, бабруйскія і гомельскія сельгасмашыны. У Волагдзе ж пусьціў карані і канцэрн „Белнафтахім", адкрыўшы там сваё пастаяннае прадстаўніцтва.
З пачатку 1999 году завязаліся таксама паўнакроўныя сувязі Беларусі з кіраўнікамі Валгаградзкай вобласьці й Прыморскага краю.
Цікавую ролю ў гэтых кантактах іграюць аўтаномныя

рэспублікі Расіі, што ўжо даўно самастойна вырашаюць замежнаэканамічныя пытаньні. Гэтак, беларускае кіраўніцтва вельмі часта сустракаецца з кіраўнікамі Ўдмуртыі, але вызначыць накірункі супрацоўніцтва тутака вельмі няпроста. Ня выключана, што гэтыя кантакты зьвязаныя з закупам зброі для беларускага войска.
Неадназначна разьвіваюцца і стасункі Беларусі з Татарстанам. Татарскі прэзыдэнт Мінтымер Шайміеў адзін з галоўных праціўнікаў аб'яднаньня Беларусі й Расіі паводле мадэлі, якую адстойвае А.Лукашэнка (стварэньне двухсуб'ектнае фэдэрацыйнае дзяржавы), бо пры гэтым адносна зьнізіўся б цяперашні прывілеяваны статус Татарстану ў Расійскай Фэдэрацыі. Татарскі прэзыдэнт пабойваецца таксама, што ўтвораная такім чынам дзяржава-гібрыд будзе грунтавацца на ідэалёгіі панславізму на шкоду неславянскім народам Расіі. Аднак, кіраўнікі Беларусі й Татарстану знаходзяць супольную мову ў тым, што датычыць эканамічных стасункаў: абодвума рухае аўтарытарны і індустрыялісцкі дух. Пэўныя кантракты былі падпісаныя між Беларусяй і дзяржаўнай кампаніяй „Татнафта". Менавіта ў гэтым кантэксьце ўлады Беларусі пачалі рабіць знакі ўвагі сваёй татарскай меншасьці і нават далі згоду на адбудову старога мячэту ў Менску.

Мытныя і гандлёвыя непаразуменьні
Згодна з дамоўленасьцю аб стварэньні „адзінай мытнай прасторы" ад 1995 году (пагадненьне пра гэта было падпісанае ў студзені, а ўступіла яно ў сілу ў траўні), што пасьля была замацаваная дамовай аб „мытным саюзе", краіны мусілі адмовіцца ад мытнага кантролю за перамяшчэньнем цераз беларуска-расійскую мяжу любых тавараў, апроч тых, што абкладаюцца акцызамі (алькаголь, тытунь, аўтамабілі). Аднак час ад часу свабоду міждзяржаўнага гандлю ўсё ж парушаюць адміністрацыйныя абмежаваньні. Часта гэта адбываецца з ініцыятывы беларускага боку. Рознагалосьсі ўзьнікаюць з прычыны несупадзеньня эканамічных курсаў дзьвюх краінаў, іхнай фінансавай і бюджэтнай палітыкі.
Расія спрабуе паставіць адміністрацыйныя бар'еры на шляху некаторых гандлёвых патокаў зь Беларусі. Па-першае, расійцы церпяць ад несумленнай канкурэнцыі з боку шэрагу беларускіх

вытворцаў, па-другое, спрэчкі між краінамі выклікае таксама няўзгодненасьць падыходаў да ўніфікацыі падаткавага заканадаўства. Узроўні акцызаў на шэраг тавараў у Расіі былі вышэйшыя, чым у Беларусі. Зьняцьцё мытных і фіскальных бар'ераў ня толькі дазволіла беларускім вытворцам экспартаваць у Расію тавары па цэнах, ніжэйшых за ўнутрырасійскія, але яшчэ й дало магчымасьць рээкспарту прадукцыі трэціх краінаў празь Беларусь. Вось чаму ў 1998 годзе кіраўніцтва расійскай падаткавай службы прыгразіла ўвядзеньнем мытных збораў на ўсе тавары, што паступаюць зь Беларусі. Расійскі бок хоча пакласьці канец пануючай на расійска-беларускай мяжы анархіі і прымусіць Беларусь адмовіцца ад дэмпінгу.
У прынцыпе, краіны ўжо прынялі законы, што ўніфікуюць сыстэму падаткавых збораў, і Беларусь пачала спаганяць мыты з пэўных транзытных грузаў, каб павялічыць цану тавару ў Расіі, на месцы прызначэньня. З 1998 году расійскія ўлады патрабуюць, каб на ўсе тавары, што паступаюць на продаж у Расію зь Беларусі, былі дакумэнты, якія б пацьвярджалі аплату збораў у Беларусі. Выдаткаваная на беларускія зборы сума пасьля вылічваецца з сумы збору, якую трэба плаціць у Расіі. Але пры ажыцьцяўленьні гэтага захаду ўзьнікла іншае канкрэтнае пытаньне. А па якім курсе расійскі бок мае вылічваць валютны эквівалент сумы, заплочанай у Беларусі ў беларускіх рублёх? Фіктыўны курс беларускага рубля, устаноўлены зьверху рашэньнем менскіх уладаў, значна заніжаны проці курсу беларускай валюты на маскоўскай біржы. Гэта дазваляе беларускім уладам і далей працягваць гандаль па дэмпінгавых цэнах, імітуючы спагнанне высокіх збораў. Разблытаць гэты вузел можна было б, спаганяючы мыты і іншыя ўскосныя падаткі на месцы прызначэньня тавару ўва ўсіх краінах СНД. На гэта ўжо аднак не пагаджаецца Расія, якая больш экспартуе ў краіны былога СССР, чым імпартуе зь іх.

У дадатак да гэтых спрэчак 17 студзеня 1999 году расійскае міністэрства транспарту аднабакова ўвяло правілы, паводле якіх беларускія перавозчыкі, калі транспартуюць грузы трэціх краінаў, мусяць атрымліваць спэцыяльны дазвол на перасячэньне беларуска-расійскай мяжы.
У гэтым кантэксьце канчатковай уніфікацыі мытных кодэксаў

дзьвюх краінаў у разьвіцьцё мытнага пагадненьня 1995 году пакуль чакаць не даводзіцца, як і ўвядзеньня адзінай стаўкі ПДВ (20%), што прадугледжвалася зрабіць у 1999 годзе. Паколькі мяжа між Расіяй і Беларусяй празрыстая, дык кантрабандаю ў поўным сэнсе гэтага слова перавозяцца перадусім тавары, якія падлягаюць дадатковаму падаткаабкладаньню, або прадметы, гандаль якімі без спэцыяльнага дазволу забаронены (зброя, наркотыкі, прадметы мастацтва).

Аднак падпольны гандаль, што вядзецца цераз расійска-беларускую мяжу, рэгулярна дае зачэпкі для звадаў, прычым бакі звычайна перакладваюць адказнасьць з аднаго на другі. Гэта азмрочвае пэрспэктывы расійска-беларускага саюзу.

У памежных рэгіёнах Расіі расьцьвіў кантрабандны транзыт па „беларускім калідоры“, дзякуючы шматлікім „дзіркам“ у мытных бар’ерах на заходняй мяжы Расіі, дзе, як і ўва ўсёй адміністрацыі гэтай краіны, буяе карупцыя. Апроч карупцыі, Заходняе ўпраўленьне Мытнага камітэту Расіі вельмі клапоціць тое, што на Браншчыне й Смаленшчыне фіксуецца ўсё больш фактаў перахоўваньня наркотыкаў і іх траспартаваньня з Расіі ў Эўропу. Смаленская вобласьць перайшла пад кантроль „сонцаўскай“ мафіёзнай групоўкі, асяродак якой — пад Масквой. Гэтая групоўка кантралюе транзыт какаіну і гераіну. Бранская вобласьць увогуле мае рэпутацыю „наркарэгіёну“. У склад груповак наркамафіі ў гэтым рэгіёне ўваходзяць каля 700 чалавек (расійцы, беларусы, украінцы, малдаване…). Крайняе пагаршэньне сацыяльна-эканамічнай сытуацыі ў гэтым рэгіёне палягчае ім найманьне наркакур’ераў, якія перавозяць наркотыкі ў Беларусь і Ўкраіну.

На Браншчыне разросься шчэ адзін спэцыфічны тып памежнага гандлю зь Беларусяй, зьвязаны з ільготамі, якія маюць чарнобыльцы. Браншчына — рэгіён Расіі, які найбольш пацярпеў ад Чарнобылю (хоць у цэлым 70% усіх радыёактыўных ападкаў выпала ў Беларусі). Пасьведчаньне „чарнобыльца“ дае ў Расіі права ўвозіць з суседняй Беларусі аўтамабілі, сьпіртное і тытунёвыя вырабы, ня плоцячы за іх акцызаў. Таму тутака назіраецца сапраўдны гандаль чарнобыльскімі пасьведчаньнямі, у які аказаліся ўцягненыя як тутэйшыя, гэтак і маскоўскія мафіёзныя структуры, што наймаюць „чарнобыльскіх кур’ераў“ зь ліку мясцовых

ліквідатараў і пацярпелых.

Моцнае разьвіцьцё атрымала кантрабанда гарэлкі зь Беларусі ў Расію. Беларусь стала апорнай базай вытворчасьці падпольнага алькаголю для многіх расійскіх кампаніяў, у тым ліку й маскоўскіх, растоўскіх і маздоцкіх злачынных групаў. Менавіта пашырэньне гэтага бізнэсу, да якога вельмі цярпіма паставіліся беларускія ўлады, па ўсёй верагоднасьці, стала прычынаю росту колькасьці забойстваў па палітычна-эканамічных матывах у Магілёўскай вобласьці пасьля 1997 году. Смаленскі гарэлачны завод „Бахус“ нясе вялікія страты ад таго, што ягонае кіраўніцтва называе „несумленнай канкурэнцыяй“. Да гэтай карціны застаецца толькі дадаць, што ў Расіі асобныя структуры атрымалі ад дзяржавы права не плаціць падаткаў на імпарт (праваслаўная царква, вэтэранскія і некаторыя спартовыя арганізацыі).
Беларускія ўлады іншы раз бралі чынны ўдзел у падобным гандлі, прычым часам нават адкрыта. Гучная справа „Торгэкспо“ стала тыповым прыкладам дзейнасьці беларускай прэзыдэнтуры. Кіраўніцтва справамі прэзыдэнта (а не сама дзяржава) узяло пад свой кантроль прыбытковыя галіны, сярод якіх турыстычная інфраструктура і гатэлі, запаведнікі і нацыянальныя паркі, лясная гаспадарка, а таксама часткова гандаль зброяй і транзыт аўтамабіляў, гарэлкі і цыгарэтаў у Расію.
Нарэшце, на транспартных шляхах квітнеюць розныя формы рэкету, у тым ліку й паўафіцыйнага, на памежных пунктах пропуску і беларускіх аўтамагістралях.
Смаленская кіраўнічая эліта таксама ўспрымае аўтамагістраль з Эўропы Берасьце—Менск—Масква як аб’ект, зь якога можна стрыгчы купоны. Аднаго смаленскага губэрнатара зьмяніў другі, але пры гэтым сума г.зв. экалягічнага збору, што спаганяецца з кіроўцаў усіх машынаў, якія праяжджаюць праз Смаленшчыну, толькі павялічылася, хоць такі збор не прадугледжваецца ніякімі заканадаўчымі актамі. Цяпер на адміністрацыйных межах Смаленшчыны стаяць міліцэйскія пасты (юрыдычны статус якіх таксама ня вызначаны) і зьбіраюць гэты падатак. Абласная адміністрацыя так ясна і не патлумачыла, куды разыходзяцца сродкі, спаганяныя з кіроўцаў, калі не лічыць некалькіх „дабрачынных акцыяў“,

праведзеных ёю. Беларускія ўлады ў адказ таксама ўвялі збор з расійскіх машынаў, што ўяжджаюць на тэрыторыю Беларусі. У сапраўднасьці беларускія ўлады, як і кіраўніцтва сумежных расійскіх правінцыяў, зацікаўленыя ня так у абмежаваньні гандлёвых патокаў празь мяжу Беларусі й Смаленшчыны, як ува „ўмелым рэгуляваньні“ іх.

Уплыў Беларусі на расійскае памежжа

У эканамічным і палітычным супрацоўніцтве між Беларусяй і памежнымі рэгіёнамі Расіі мае значэньне ня столькі аб’ём, колькі якасьць. Гэта геапалітычнае па сваім характары значэньне, бо ў выніку разьвіцьця стасункаў з расійскім паўзьмежжам вакол беларускае дзяржавы паўстае міні-зона ўплыву, якая дае Беларусі важныя казыры ў яе адносінах з Масквою ў рамках „саюзу дзьвюх“. Таму ў 1998 годзе ў Беларусі было абвешчана, што беларускае дзяржаўнае радыё будзе вяшчаць таксама на значную частку заходняга рэгіёну Расіі.

Смаленскі й бранскі губэрнатары мусяць вучыцца кіраваць сваімі вобласьцямі, не разьлічваючы на рэальную падтрымку з Масквы, і, здаецца, усё больш павяртаюцца тварам да „старэйшага беларускага брата“ (так яны ўспрымаюць суседнюю краіну), у якога больш ладу і толку. Беларусь і саюзная тэматыка, нягледзячы на ўсю іх неадназначнасьць, робяцца ўсё больш важнымі чыньнікамі ў мясцовай палітычнай гульні на Браншчыне і Смаленшчыне. А.Глушанкоў, смаленскі губэрнатар з 1993 да 1998 году, займаў пасаду намесьніка старшыні парлямэнцкай асамблеі саюзу, а ў 1999 годзе яго на гэтым пасту зьмяніў бранскі кіраўнік І.Лодкін. Няхай гэткія пасады і створаныя ў наднацыянальных псэўдаўстановах, што існуюць адно на паперы, усё ж яны маюць ня толькі фармальна-ганаровае значэньне. І Глушанкоў, і Лодкін усяляк падкрэсьлівалі свае пачэсныя функцыі, што давала ім магчымасьць здабыць дадатковую легітымацыю ў вачах выбарцаў, а таксама дадатковую вагу ў Маскве й Менску. Незалежнасьць Беларусі і Ўкраіны моцна ўдарыла па Смаленшчыне і Браншчыне. Апроч псыхалягічных і тоеснасных наступстваў гэтага (тутэйшыя ўлады падтрымлівалі ўяўленьне пра г.зв. „вечную дружбу славянскіх народаў“), гэтыя рэгіёны,

асабліва Браншчына, што мяжуе з Украінай, адчулі на сваёй скуры наступствы разрыву эканамічных сувязяў. Украінскія ўлады, імкненьне якіх да ўмацаваньня незалежнасьці было мацнейшым, чым у беларускіх, увялі вельмі жорсткі мытны кантроль. У 1992–1993 гадох на Ўкраіну прыпадала трэцяя частка аб'ёму замежнага гандлю Браншчыны (збольшага імпарт), а на Беларусь — 12%. У 1999 годзе ўжо Беларусь займала цьвёрдае першае месца (траціна замежнагандлёвага абарачэньня Браншчыны), а Ўкраіна — другое месца з 19%. Пасьля жнівеньскага крызысу 1998 году ў бартэрныя абмены пачалі ўцягвацца вытворцы ўсё новых і новых тавараў. Гэтак, Беларусь цэнтралізавана пастаўляла на Смаленшчыну прадукты, бэнзын, аўтобусы, трактары і іншыя сельгасмашыны на агульную суму 2 мільёны даляраў у абмен на электраэнэргію (з Смаленскай АЭС) і ўгнаеньні з Дарагабускага хімзаводу.

Прамое супрацоўніцтва зь беларускім прэзыдэнтам успрымаецца як адзіны спосаб пераадоленьня крызысу. Цяпер ужо ідзецца ня толькі пра „фальклёрныя сустрэчы" і заклінаньні пра „вечную дружбу славянскіх народаў". Завязваецца сапраўднае супрацоўніцтва, найперш эканамічнае, на ўзроўні ўладаў. Пад гукі няўгасных прамоваў пра пільную неабходнасьць інтэграцыі зь Беларусяй, якія падхопліваюцца і на ўзроўні расійскіх правінцыяў, некаторыя тамтэйшыя прадпрыемствы ўжо ня вытрымалі спаборніцтва зь беларускімі канкурэнтамі, што атрымліваюць датацыі зь менскага дзяржбюджэту: прыкладам могуць быць смаленскія цагельні або бранская мэблевая прамысловасьць.

На Смаленшчыне й на Браншчыне пабольшала сумесных беларуска-расійскіх прадпрыемстваў. Яны займаюцца пераважна продажам тавар аў, што ўвозяцца зь Беларусі напаўзаконным ці незаконным шляхам. На Браншчыне 40% сумесных прадпрыемстваў (з замежным капіталам) — беларуска-расійскія**. А смаленскі губэрнатар, імкнучыся мінімізаваць нэгатыўны ўплыў сучаснай беларуска-расійскай інтэграцыі на эканоміку вобласьці, прыдумаў выраз „смаленска-беларускія прадпрыемствы".

** Гэта зьвесткі 1999 году. За

вобласьці гэтыя адносіны ў пэўнай ступені „закамуфляваныя“: кіраўніцтва аддае перавагу падпісаньню пагаднення з беларускімі вобласьцямі, каб прыхаваць наяўнасьць сувязяў з А.Лукашэнкам. Абласныя ўлады тутака прадпрымаюць меру магчымасьцяў рэгуляваць супрацоўніцтва з раёнаў зь Беларусяй. Насельніцтву гэтых пэрыфэрыйных для самой Браншчыны раёнаў, дзе калгасьнікам заробкаў не плаціл з 1994 году, Лукашэнкава Беларусь уяўляецца сапраўдным узорам парадку і сацыяльнай стабільнасьці. Менавіта таму ўлады Краснагорскага раёну (які на ўсіх выбарах галасуе за камуністаў і ультранацыяналістаў), што на захадзе Браншчыны, расьпісваючыся ўва ўласнай нязьдольнасьці даць рады сытуацыі, у сакавіку 1999 году афіцыйна папрасілі Лукашэнку анэксаваць тэрыторыю раёну.

Зорка — *рэдактара.*

Смаленскае абласное кіраўніцтва менш хвае свой клопат пра разьвіцьцё супрацоўніцтва зь Беларусяй. Гэтак, 24 верасьня 1998 году смаленскія ўлады абнародавалі асноўныя накірункі шырокай праграмы разьвіцьця супрацоўніцтва зь Беларусяй, якая афіцыйна мела на мэце дапамагчы пераадолець наступствы жнівеньскага крызысу і адказаць на адсутнасьць увагі з боку Масквы. 7–8 кастрычніка смаленскі губэрнатар Аляксандар Прохараў сустрэўся зь беларускім прэзыдэнтам у Менску, каб прадоўжыць абмеркаваньне асноўных пунктаў гэтай праграмы. Сярод тых праектаў, пра якія гаварылася, найважнейшым уяўляецца стварэньне смаленска-беларускага канцэрну па вытворчасьці электрычнасьці на базе Смаленскай АЭС (меркавалася неўзабаве ўвесьці ў дзеяньне новы энэргаблёк, а ў пэрспэктыве пабудаваць другую АЭС побач зь першай). Гэтае прадпрыемства мусіла б ня толькі забясьпечваць электраэнэргіяй патрэбы Смаленскай вобласьці (яна спажывае толькі 16% выпрацоўванай цяпер энэргіі), але й Беларусі, а лішкі мерыліся экспартаваць у Польшчу й Нямеччыну. Апроч таго, смаленскія ільногадоўчыя ды ільнаперапрацоўчыя прадпрыемствы зьбіраліся перадаць беларускім уласьнікам, здольным аздаравіць гэтую галіну і спыніць рост колькасьці беспрацоўных у ёй, а смаленскі завод па шліфоўцы алмазаў „Кристалл“ мусіў атрымаць кантроль над аналягічным гомельскім, што сутыкаецца зь вялікімі праблемамі з сыравінай ад часоў распаду СССР.

Плянавалася таксама стварэньне смаленска-беларускай авіякампаніі на базе смаленскага і гомельскага авіязаводаў, а ў галіне адукацыі — зьліцьцё Смаленскага і Віцебскага ўнівэрсытэтаў у адзін „Славянскі ўнівэрсытэт“. Вывучаліся таксама магчымасьці стварэньня свабоднай эканамічнай зоны адначасова ў Віцебскай і Смаленскай абласьцях і выпрацоўкі адзінай палітыкі спагнаньня грошай за праезд па аўтамагістралі Масква—Берасьце. У чэрвені 1999 году большасьць з гэтых праектаў яшчэ заставалася толькі на паперы, а кіраўнічая эліта Смаленску ганарылася адкрыцьцём у горадзе новага беларуска-расійскага сумеснага прадпрыемства, якое мае займацца мадэрнізацыяй мэдычнага і стаматалягічнага абсталяваньня.
Аналягічныя адносіны ткуцца і з памежнай Пскоўскай вобласьцю, і з Калінінградзкім анклявам. Пскоўскі губэрнатар, жырыновец Міхайлаў, падтрымлівае найлепшыя стасункі з А.Лукашэнкам. Была адноўленая і ўступіла ў дзеяньне чыгуначная нітка з Пскова да Віцебску ў абход балтыйскіх краінаў. Чвэрць замежнагандлёвага абароту Пскоўскай вобласьці прыпадае на Беларусь. У Калінінградзкай вобласьці дзейнічаюць больш за 30 прадпрыемстваў зь дзяржаўным беларускім капіталам. Беларусь разьлічвае выкарыстоўваць калінінградзкія парты для пашырэньня сваіх гандлёвых сувязяў і рыбалоўства ў Балтыйскім моры.

Вайсковы саюз

Важнасьць утварэньня геапалітычнае цэласнасьці, у рамках якой расійскія рэгіёны, што суседнічаюць зь Беларусяй, уцягваліся б ва ўсё больш цесныя эканамічныя адносіны зь ёю, трэба разглядаць у зьвязку з праектам стварэньня „адзінай вайсковай групоўкі“ на базе беларускага войска і Маскоўскай ваеннай акругі, рэактуалізаваным увесну 1999 году. Маскоўскія і менскія мэдыі надалі вялікую ўвагу ўдзелу беларускіх частак у маштабных манэўрах расійскага войска ў чэрвені 1999 году, што называліся „Захад 99“ і ў часе якіх адпрацоўвалася якраз адбіцьцё агрэсара, які наносіць галоўны ўдар з эўрапейскага кантынэнту. Адбываюцца сынхранізаваныя манэўры войскаў супрацьпаветранай абароны. Паводле беларуска-расійскага пагадненьня, падпісанага 1 ліпеня 1999 году, большая частка

вайсковых аб'ектаў Беларусі прадастаўляецца ў распараджэньне Крамля.
Сфэра ваеннага супрацоўніцтва — адна з тых, дзе расійска-беларускі саюз рэалізоўваецца найбольш эфэктыўна, асабліва беручы пад увагу адсутнасьць канкрэтных дасягненьняў у гэтай галіне ў рамках СНД, калі не лічыць падпісаньня Дамовы аб калектыўнай бясьпецы ў 1992 годзе ў Ташкенце. Аднак і ў гэтай галіне, як і ўва ўсіх астатніх, цесныя сувязі між Расіяй і Беларусяй упісваюцца перадусім у простую лёгіку двухбаковых адносінаў і існавалі нават да фармальнага падпісаньня дамовы пра стварэньне саюзу. Пры гэтым вайсковыя пытаньні зьяўляюцца той сфэрай, у якой і менскія, і маскоўскія ўлады ўвесь час блефуюць. Паколькі пытаньні эўрапейскай бясьпекі ў 90-х прайшлі пад знакам пашырэньня NATO і ўмяшаньня Атлянтычнага альянсу ў Косаве, беларускія і расійскія кіраўнікі спрабавалі супрацьстаяць гэтым працэсам, ствараючы думку, што яны ўсё яшчэ ўяўляюць сабой магутнасьць, зь якой Захад мусіць лічыцца.
З пачаткам бамбардаваньняў Сэрбіі ў адказ на дзеяньні югаслаўскай арміі ў Косаве беларускія і расійскія прэзыдэнты і міністры абароны сталі сустракацца часьцей. Менавіта ў гэтым кантэксьце мэдыі падхапілі праект стварэньня аб'яднанай расійска-беларускай групоўкі (не даючы ёй больш дакладнага вайсковага азначэньня). Ува ўласьцівым яму стылі, захапляючыся ўласнай рыторыкай, А.Лукашэнка заявіў у часе свайго візыту ў Валгаград 9 траўня 1999 году, што „Беларусь — гэта заходні фарпост Расіі" і што „ад Масквы да Смаленску няма расійскіх войскаў, гэтую прастору фактычна ахоўвае беларускае войска". Насамрэч Смаленская вобласьць далёка не дэмілітарызаваная: якраз тут былі разьмешчаныя часткі, выведзеныя зь Нямеччыны і краінаў Балтыі.
Беларускі сындром, што заключаецца ў зацятым разыгрываньні ролі „шчыту Масквы", узьнік як наступства таго стратэгічнага значэньня, якое мела Беларусь (тады гэта была Беларуская вайсковая акруга) для савецкай ваеннай дактрыны. Якраз тутака пры канцы 80-х стаяла наймацнейшая танкавая групоўка (супэрсучасныя Т-80), якая мелася прарваць абарону NATO аж да Атлянтыкі. У Мазыры й Лідзе несьлі баявое дыжурства стратэгічныя ядзерныя ракеты SS-25. Беларусь была на той момант самай мілітарызаванай тэрыторыяй сьвету

(адзін салдат прыходзіўся на 43 жыхары: 160 тысячаў чалавек было пад ружжом у КБВА і яшчэ 40 тысячаў падпарадкоўваліся камандаваньню стратэгічных сілаў).

Для Масквы стварэньне ў Беларусі нацыянальнай арміі (прычым значна скарочанай) у 1992 годзе азначала страту важнага абароннага эшалёну на эўрапейскім накірунку. Масква з раздражненьнем і неразуменьнем успрыняла падкрэсьліваньне нэўтралітэту Беларусі кіраўніцтвам краіны ў першыя гады незалежнасьці (ваенная дактрына 1992 году).
З прыходам да ўлады А.Лукашэнкі быў падпісаны шэраг выгадных Расіі пагадненьняў у вайсковай сфэры. Міжурадавае пагадненьне ад 6 студзеня 1995 году, дапоўненае ў сьнежні таго ж году, увяло паняцьце „супольнае ваенна-стратэгічнае прасторы“. У адпаведнасьці з гэтым пагадненьнем Расія атрымлівае ў бясплатнае карыстаньне на 25 гадоў дзьве базы стратэгічнага прызначэньня. Будынкі гэтых базаў абвешчаныя ўласнасьцю Беларусі, але ўся рухомая маёмасьць застанецца ў расійскай уласнасьці. Гаворка ідзе пра радыёлякацыйную станцыю раньняга папярэджаньня нападаў у Ганцавічах і Вялейскую радыёстанцыю, што забясьпечвае сувязь паміж расійскімі субмарынамі ў Белым, Чорным і Балтыйскім марах. За гэта Беларусь атрымала некаторыя эканамічныя выгоды: напрыклад, былі зьніжаныя цэны, па якіх Расія прадае ёй энэрганосьбіты, а ў вайсковай галіне ёй дазволілі рыхтаваць афіцэраў супрацьпаветранай абароны ў маскоўскіх вайсковых акадэміях і на расійскіх палігонах.
Адначасова з 1995 году расійская стратэгічная авіяцыя можа бясплатна карыстацца трыма беларускімі аэрадромамі (Бабруйск, Баранавічы й Быхаў). Прысутнасьць расійскага вайсковага пэрсаналу прадугледжваецца таксама пагадненьнем пра ахову беларускіх межаў ад 21 лютага 1995 году. 1 красавіка 1996 году, напярэдадні падпісаньня дамовы пра стварэньне супольнасьці, Расія й Беларусь падпісалі ўгоду пра супрацоўніцтва войскаў СПА. Новае беларуска-расійскае пагадненьне, што яшчэ пашырае сьпіс ваенных аб’ектаў, якія прадстаўляюцца ў супольнае выкарыстаньне, было падпісанае ў ліпені 1999 году, як заўжды, у гарачай атмасфэры магчымага аб’яднаньня дзьвюх дзяржаваў. Яно мелася спрыяць утварэньню „супольнай вайсковай групоўкі“. Тутака, праўда, праект

спатыкаецца на пытаньні пра аб'яднанае камандаваньне. Да таго ж, згодна зь беларускай вайсковай дактрынай, Беларусь ня можа адпраўляць свае войскі за межы краіны. У прыватнасьці, А.Лукашэнка не дапускае магчымасьці, каб беларускія часткі бралі ўдзел у баёх у Чачэніі на расійскім баку.
Расія й Беларусь узаемназалежныя ў сфэры вайсковай прамысловасьці. У Беларусі няма ні сродкаў, ні неабходнай інфраструктуры, каб выпускаць вайсковыя матэрыялы самастойна. Зброю яна закупляе найбольш у Расіі. Але падзел функцыяў у былой савецкай сыстэме рабіў Беларусь манапалістам у некаторых высокатэхналягічных вытворчасьцях, зьвязаных з вайсковай прамысловасьцю, такіх, як оптыка, радыёэлектроніка, мікраінфарматыка, машынабудаваньне (у тым ліку вытворчасьць буйнагабарытных шасі пад стратэгічныя і супрацьпаветраныя ракеты). Таму і атрымліваецца, што менскі завод „Інтэграл", прадукцыя якога выкарыстоўваецца ў сыстэмах ракетнага навядзеньня, вырабляе 90% мікрапрацэсараў усяго былога Савецкага Саюзу. Дарэчы, на сусьветным рынку Беларусь самастойна перапрадае савецкую і расійскую зброю і прапануе свае паслугі ў галіне „вайскова-тэхнічнага супрацоўніцтва". У гэтым сэнсе яна ўсё часьцей канкуруе з Расіяй, хоць, вядома, да расійскага патэнцыялу ў гэтай сфэры ёй яшчэ далёка. Беларускія базы па рамонце і мадэрнізацыі танкаў у Барысаве і самалётаў у Баранавічах ня маюць аналягаў ува ўсім былым СССР і ўжо актыўна працуюць на Кітай.

Югаславія — трэцяя саюзьніца?
У красавіку 1999 году, калі NATO ўмяшалася ў югаслаўскія падзеі, плян ператварэньня „саюзу дзьвюх" у „саюз трох" выношвалі маскоўскія палітыкі (прэзыдэнт Ельцын, мэр Масквы Лужкоў, камуністы і Ўладзімер Жырыноўскі). Праект далучэньня Сэрбіі-Югаславіі быў амаль аднадушна падтрыманы расійскай Думай, беларускай палатай прадстаўнікоў, а таксама югаслаўскімі дэпутатамі ў бамбардаваным Бялградзе.
Цяжка прадказаць будучыню магчымага „славянскага траістага саюзу". Непадобна, каб на сьвет зьявілася нейкая моцная, кшталту новага, падпраўленага варыянту Варшаўскага

дагавору, унія. Ужо й „саюз дзьвюх“, Расіі й Беларусі, сутыкаецца з разнастайнымі праблемамі, зьвязанымі зь непаразуменьнем наконт таго, які канкрэтны палітычны выгляд ён мае набыць. Удзел Югаславіі ў паседжаньнях парлямэнцкае асамблеі саюзу на сёньня мае хутчэй сымбалічнае значэньне, калі ўлічыць „дэкаратыўны“ характар самой установы. А цікавасьць Масквы й Менску да Бялграду ня можа кампэнсаваць часам вельмі нацягнутых адносінаў з Украінай. У свой час насэраўская Аб’яднаная Арабская Рэспубліка доўга не праіснавала. Зь іншага боку, дзяржаўныя хаўрусы такога кшталту дазваляюць іхным удзельнікам захаваць сваю прысутнасьць на міжнароднай арэне, ствараючы вобраз грознай сілы. Вось чаму нельга выключыць таго, што цесныя сувязі і поўная салідарнасьць у асобных сфэрах будуць захоўвацца. У сакавіку 1999 году беларускія ўлады абвесьцілі Югаславію сваім прыярытэтным партнэрам, такім жа важным, як Расія. Нягледзячы на гэта, можна яшчэ задумацца, чаго ў доўгатэрміновым пляне вартыя гэтыя інтэграцыйныя праекты — і „саюз трох“ зь Югаславіяй, і „расійска-беларускі саюз“, асноўны плён якога назіраецца ў сфэры вайсковага супрацоўніцтва. Гэтыя праекты нараджаюцца ў абстаноўцы псыхадрамы кожны раз, калі мусова адказаць на дзеяньні NATO, але зусім не нясуць адказаў на пытаньні эканамічнага разьвіцьця.

Друкуецца ў скарочаным перакладзе з французкай паводле Nouveaux Mondes: Les confins de l’OTAN. — Жэнэва: CRES, 1999, № 9
з ласкавай згоды аўтара і выданьня.

[image]
[image]

№ 6 (11) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Максім Маскалёў
Апошняе абнаўленьне: 22-03-2001
[image]

ГЕНАДЗЬ ЦЫХУН
доктар філялагічных навук, прафэсар, славіст. Працуе ў Інстытуце мовазнаўства НАН Беларусі.

Генадзь Цыхун

Крэалізаваны прадукт Трасянка як аб’ект лінгвістычнага даследавання

Феномен трасянкі не можа не выклікаць цікавасці ў лінгвіста. Сама назва „трасянка“ — гэта тэрміналагічная метафара, створаная ў выніку пераносу зыходнага слова з бытавой сферы ў сферу лінгвістычнай тэрміналогіі. Першапачатковай асновай тэрміну стала, відаць, спалучэнне „моўная трасянка“, падобнае да іншых аказіянальных словазлучэнняў, што выкарыстоўваюцца для азначэння гэтага феномену ў публіцыстыцы: „*моўная жвачка*“ („*Пакажам беларусам іхнюю моўную жвачку — можа, хоць пасмяюцца над сабой*“, Круг, 4.04.96), „*моўны гібрыд*“ (А.Бубала, Наша слова, 9.04.94), „*моўны сурагат*“ (С.Законнікаў, Народная газета, 25.01.95), „*моўная хімера*“ (В.Грыцкевіч, Наша слова, 14.07.99). Першасны сэнс слова „трасянка“ многія забыліся, яно ўжо патрабуе разгорнутых тлумачэнняў, як, напрыклад, у каментары да „Трасянка-беларуска-рускага слоўніка“, што пачала друкаваць у свой час праваабарончая газета „Круг“: „*Тэрмін трасянка*

пайшоў ад назвы корму для буйнай рагатай жывёлы, гэта значыць каровы. Калі ў гаспадара не хапае добрага сена, ён дабаўляе салому, старанна растрасаючы яе. Карова не заўважае падману і з'ядае трасянку. Праўда, малака не прыбаўляе. Так і беларусы: сваёй жудаснай трасянкі не заўважаюць ні ў хаце, ні ў аўтобусе, ні ў Вярхоўным Савеце“ (Круг, 4.04.96). Аб часе ўзнікнення тэрміну-метафары няма дакладных звестак, але вядома, што яшчэ ў 20-я гады Ластоўскі, наведаўшы падчас Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі (1926 г.) Савецкую Беларусь, называў гэты феномен чаўнёй (відаць, з „чаўпня“, што ад дзеяслова „чаўпсці“ — гаварыць лухту, плявузгаць).

Мадэллю для ўтварэння тэрміну „трасянка“, мусіць, стаў адпаведны ўкраінскі тэрмін — „суржик“, які азначае сумесь жыта, пшаніцы, ячменю, аўса або нізкаякасную мешаніну збожжа. Хаця можна дапусціць і цалкам самастойнае ўзнікненне, бо ідэя змяшэння і нізкай якасці прысутная ва ўсіх прыведзеных аналагічных утварэнняў[1]. Яркая эмацыйнасць метафары дазволіла тэрміну „трасянка“ замацавацца ў беларускай лінгвістыцы. Іншыя абазначэнні — „*мешаніна*“ (А.Мірановіч), „*ламаніна*“ (А.Бяляцкі), „*тарабаршчына*“ (А.Казлоўскі) — ўсёй іх экспрэсіўнасці маюць занадта агульны характар і не паддаюцца тэрміналагізацыі.

Некаторыя аўтары ўзмацняюць эмацыйны характар тэрміну, суадносячы яго з канкрэтнай асобай (найбольш часта — з носьбітам трасянкі) ці з асяроддзем, дзе трасянка — „*Двухмоўе па-менску. Яно тут атрымала назву „трасянка“* (С.Струменскі, Наша слова, 6.12.95). У кантэкстуальных семантычнай кандэнсацыі гэта дае аказіянальны тэрмін с „дзямянцееўка“, як у Рыгора Барадуліна: „*А ўсё ж такі ў нас, мабыць, малоцячы, як цяпер кажуць, на дземенцееўцы, думаю, гаворыць па-расійску*“ (Маладосць, 1994, №10). Адмоўны ўтварыў кампазіт — „*мататрасянка*“: „*Сённяшні [...] нашай краіны павінен аднолькава добра ведаць не толькі рускую, але і беларускую мову. На жаль, ён часцей за ўсё [...] ніякай, гаворыць на „трасянцы“, густа перасыпанай матам („мататрасянцы“)*“ (Літаратура і мастацтва, 29.09.95). нарэшце, шмат якія аўтары праз азначэнні спрабуюць выразіць сваё эмацыйнае стаўленне да самой з'явы: „*знакамітая,*

[1] Параўн.: *начасьцюлесь* — *мяшаніна, сумесь*; *мяшаніна* — *мешаніна, сумесь*; *трасяніна* — *трасянка*; *трасяніць* — *трасянкаваць*; *Трасяніна* — *Трасянкавай*; *Трасяніна* — *Трасянкавіцьцё*; *Трасяніна* — *Трасянкавіч*; *Трасяніна* — *Трасянкавіцкі*; *Трасяніна* — *Трасянкавіцкая*; *Трасяніна* — *Трасянкавіцкае*; *Трасяніна* — *Трасянкавіцкія*; *Трасяніна* — *Трасянкавіцкіх*; *Трасяніна* — *Трасянкавіцкім*; *Трасяніна* — *Трасянкавіцкімі*; *Трасяніна* — *Трасянкавіцкіх*; *Трасяніна* — *Трасянкавіцкіх*; *Трасяніна* — *Трасянкавіцкіх

жахлівая сваёй убогасцю „трасянка“ (С.Законнікаў), *„брыдкая трасянка“* (А.Бяляцкі), “*горшая „трасянка“*” (В.Скараход), *„жудасная трасянка“* (А.Казловіч). У сувязі з экспансіяй трасянкі ў адміністрацыйную сферу на самым высокім узроўні для падкрэслівання яе гібрыднага характару гарадзенскі журналіст Сяргей Астраўцоў ужыў выраз “дзяржаўны „навааз“”: “*Рабочая мова сэлектарнай плянёркі — дзяржаўны „навааз“*” (Наша Ніва, 12.08.96).

Мы так падрабязна спыніліся на абазначэннях гэтага феномену, бо яны, на нашу думку, шмат у чым раскрываюць яго існасць.

Што ж уяўляе па сваёй сутнасці трасянка з лінгвістычнага пункту погляду? Гэта моўны прадукт, што ўзнік шляхам механічнага змяшэння ў розных прапорцыях элементаў матэрыі і формы дзвюх моваў — расійскай і беларускай. Трасянка — гэта кантамінацыя. Тыповы прадукт кантамінацыі — крэольскія мовы, аднымі з найбольш яркіх прадстаўнікоў якіх з’яўляюцца піджыны. Аб вонкавых прычынах іх узнікнення расійскі даследчык М.Дзьячкоў у сваёй кнізе „Креольские языки“, што выйшла ў Маскве ў 1987 годзе, пісаў наступнае: „*Мабыць, можна лічыць, што гвалтоўнае паняволенне адных народаў другімі, масавыя міграцыі, нераўнапраўныя адносіны між рознымі этнасамі складаюць той гістарычны фон, на якім фармуюцца піджыны*“. Зразумела, няма падстаў поўнасцю атаясамліваць трасянку з піджынамі ці нават крэольскімі мовамі, найперш таму, што тут ідзе гутарка аб узаемадзеянні блізкароднасных моў, у той час як пры ўтварэнні апошніх узаемадзейнічалі звычайна далёкія ў генетычным і тыпалагічным плане мовы. Яе можна вызначыць хутчэй як *крэалізаваную* мову ці, дакладней, *крэалізаваны варыянт* беларускай мовы. Пытанне аб моўнай базе трасянкі, здаецца, не выклікае пярэчанняў — большасць даследчыкаў лічаць яе аснову беларускай. Адзін з чытачоў газеты „Звязда“ нават сцвярджае: „*Яшчэ трэба дзякаваць Богу, што мы хоць і на „трасянцы“, але ўсё ж размаўляем па-беларуску*“ (13.06.96). Пэўныя разыходжанні ўзнікаюць пры спробах вызначыць яе лінгвістычны характар, напрыклад, пры трактоўцы трасянкі як *мовы* ці *маўлення* ў аднаго і таго ж даследчыка: „*Трасянку составляет множество стихийно и по-разному организованных индивидуальных вариантов белорусской речи*“, — піша мовазнаўца Ніна Мячкоўская[2], — і „*так*

называемые трасянка (в белорусском) и суржик (в украинском) т.е. стихийно и по-разному русифицированные варианты национального языка“[3].

Як і кожны крэалізаваны моўны прадукт трасянка ўзнікла першапачаткова з неабходнасці падтрымання камунікацыі паміж карэнным беларускамоўным насельніцтвам, з аднаго боку, і расійскамоўным адміністрацыйна-партыйным чыноўніцтвам, што мела больш высокі грамадскі статус, з другога. Шматлікія сведчанні пра гэта абагульнена выказаў Рыгор Барадулін: „*Дэкласаванае бальшавікамі сялянства разам з „класавымі“ рысамі страціла і рысы нацыянальныя. У новых умовах жыцця яно лёгка паддалося прыезджым начальнікам, якіх баіцца і ад якіх пакутуе… Так, моўнае асяроддзе разбурана, а тут яшчэ такі фактар, як гарады, якія камплектаваліся за кошт расійскіх чыноўнікаў і грамадзян*“ (Наша слова, 22.02.95). Вельмі каларытна апісаў канкрэтныя ўмовы, што выклікаюць „моўны канфармізм“, чытач газеты „Наша Ніва“ Ўладзіслаў Гарбацкі: „*50-я гады. Савецка-беларуская правінцыя. Ворша. Ужо тады вясковая беларускасьць разьбівалася аб новабэтонную расейскую савецкасьць. Наіўныя беларусы хаваліся на гарадзкіх звалках ці ўцякалі назад ад кожнага выбуху агрэсіі ці проста незадаволенасьці з боку ўсялякага кшталту старшыняў, кіраўнікоў і іншых „адукаваных“ людзей. А незадаволеныя яны былі часьцяком, і асабліва прастатой і вясковай натуральнасьцю. Ці, у залежнасьці ад дрэннага настрою, „вульгарнай інтанацыяй“ беларускай мовы. Ці негарадзкой выпраўкай наведнікаў у мірыядах кабінэтаў у пошуках паперак, даведак, у пошуках паратунку. Вось тады і нарадзілася канчаткова трасянка — савецкая пачвара, якая пачала выскокваць зь беларускіх целаў, парушаных і абваропаных савецкімі экспэрымэнтамі*“ (19.06.2000). Значную ролю ў паскораным фармаванні трасянкі адыгралі рэпрэсіі 20–30-х гадоў, скіраваныя супроць т.зв. нацдэмаў, калі фактычна пад уздзеяннем паноўнай тады атмасферы тэрору адбываўся масавы пераход на расійскую мову беларускамоўнай часткі жыхароў гарадоў і мястэчкаў. Як сведчыць патрыярх беларускай літаратуры Максім Лужанін, „*не было каму гаварыць па-беларуску, а хто ўмеў і любіў, ад страху падстройваўся пад начальства, тое — трымалася ў мовы свае, і клопату свайго. Каб выслужыцца, усе мясцовыя адзін перад*

[2] Мечковская Н.Б. Языковая ситуация в Беларуси: Этнические

адным перасталі ўжываць родную мову“ (Маладосць. 1994. №10). Пэўную лепту ў гэтую справу ўнесла і вайна, якую апісвае моўную сітуацыю ў вызваленым Менску Кастрычніцкі крытык Барыс Бур’ян: „*Парадаксальна, але мне пашанцавала сустрэць сорак чацвёртым, калі мае франтавыя пабрацімы ўваходзілі ў Мінск, беларускае слова на тым жа Сураżскім рынку гучала як нешта натуральнае, звыклае, жывое. Толькі вось (або хто паафіцэрысцей за мяне) — чалавек у вайсковым убранні — абуджаў у суразмоўніка-мінчука, здаралася, недавер, збянтэжаную паўзу. На пэўны момант вінаватая ўсмешка: маўляў, даруйце, я тут па-свойму, як мы ўсе прывыкаць пачалі пры немцах, а вы ж разумееце па-маскоўску… І чалавек лёгка пераходзіў на „правільную“ „благодарю вас“, „держитесь берега Свислочи“… Нават тыя, хто прышэльцаў з Усходу, ды яшчэ вызваліцеляў, нетутэйшасць здзіўляла гатоўнасць мінчука размаўляць не па-свойму, ім, на іхняму… І мне такая манера весці размову падалася выпадковай. Відаць, „яны“ тут падчас акупацыі, адносіны чужынцам-германцам, адракліся ад расійскай сутнасці і перайшлі на беларускую мову*“ (Полымя. 1994. №5.). Вядомы тэзіс аб здрадніцтве ўсіх, хто быў пад акупацыяй, „нераўнапраўныя адносіны між рознымі этнасамі“

Лінгвістычны энцыклапедычны слоўнік. Мінск, 1994. С.312 (падрыхт. Ю.Бірыла, Ю.Лобан, Г.Цыхун, І.Шакун, Т.Шамякіна, І.Шаўчэнка, І.Шыбека)

Вольчик В. Языковой выбор в Беларуси // Вопросы языкознания. 1994. №1. С.118.

Вульхайзер К. Сацыялінгвістычная сітуацыя ў Беларусі: праблемы і перспектывы // Беларуская мова: праблемы і перспектывы. Менск, 1998. С.3–18.

Полымя. 1994. №5.

трасянку К.Вулхайзер, гл.: Woolhiser C. The sociolinguistic study of language contact and bilingualism in the former Soviet Union: The case of Belarus // When East Meet West: Sociolinguistics in the Former

Socialist Bloc. Ed. by Jeffrey Harlig, Csaba Plйh. Berlin, New York, 1995.

[3] Мечковская Н.Б. Социальная лингвистика. Изд. 2-е, исправ. Москва, 1996. С.108. Некаторыя даследчыкі называюць гэты феномен „паўмовай“ („semilanguage“), гл.: Gustavsson S. Belarus: A Multilingual State in Eastern Europe // Language, Minority, Migration: Yearbook 1994/1995 from the Centre for Multiethnic Research. Uppsala, 1995.

У далейшым, у выніку небывалых па маштабах міграцыі, у першую чаргу вяскоўцаў у горад, сфера выкарыстання трасянкі пашырылася, паколькі яна ўжо пачала ўспрымацца як абавязковы элемент гарадской моўнай сітуацыі, на якую арыентаваліся прыезджыя. У выніку, як піша рэдактар часопіса „Маладосць“ Генрых Далідовіч, „*вяскоўцы літаральна запаланілі нашы гарады (кажуць, нас, гэткіх, у адсутнасць болей мільёна), але не абеларусілі іх… У нашых гарадах цяпер дзве мовы: руская і абрушаная трасянка*“ (Літаратура і мастацтва, 31.05.96). Наяўнасць такога „дзвюхмоўнага“ не дала падстаў для замацавання трасянкі ў якасці асноўнага сродку зносін, бо яна нават у вачах яе носьбітаў успрымалася як „некультурная мова“, нягледзячы на тое, што гарантавала высокі ўзровень моўнай інтэграцыі ў гарадскім асяроддзі. Аднак гэты ўзровень дасягаўся за кошт прымітывізацыі зыходных структур беларускай і расійскай моваў пры моўным узаемадзеянні, чым і тлумачылі непаўнавартасць трасянкі людзі, што валодаюць дзвюма (ці хаця б адной) „чыстымі“ мовамі. Нягледзячы на пастаянную карэкцыю з боку гэтых носьбітаў (пераважна — расійскамоўных) шляхам высмейвання і напамінання аб вясковым паходжанні („дзярэўня“), а таксама ўздзеяння расійскага радыё, тэлебачання і школы, трасянка застаецца „*самай папулярнай мовай*“ (Літаратура і мастацтва, 16.02.96). Як прадукт крэалізацыі яна характарызуецца малой прадказальнасцю з’яўлення ў працэсе маўлення тых або іншых элементаў кожнай з моў, якія ўзаемадзейнічаюць у час самога моўнага акту[4]. Яны залежаць ад шмат якіх фактараў, найважнейшыя з якіх — ступень асіміляцыі гаворачых і канкрэтныя ўмовы камунікацыі. Найбольш устойлівымі застаюцца фанетычныя асаблівасці, што і дае падставы большасці назіральнікаў ацэньваць маўленне як беларускае: „*Але цяпер тут* [у так званым прыватным сектары Менску. — **Аўт**.] *пануе трасянка: і ў словах, і, тым больш, у вымаўленні, якое заўсёды заставалася беларускім*“ (А.Асташонак, Полымя. 1994. №11). А вось назіранні журналіста Віталя Цыганкова над мовай дэпутатаў, выхадцаў з вёскі: „*Аграрыі… маюць у сваіх шэрагах аднаго дэпутата, які нармальна гаворыць па-беларуску. Астатнія ж прадстаўнікі гэтай фракцыі, відавочна, зрабілі ўсё магчымае, каб ніхто не называў іх ганебным словам „калхознік“:*

[4] Н.Мячкоўская сцвярджае, што ў трасянкі, у адрозненне ад дыялектаў, цалкам адсутнічае маўленчы рус, тура і Менскага Н.Б. Ясюковая сітуацыя Беларусі.

гавораць яны ўжо нават не трасянкай, а амаль чыстай рускай мовай. Засталіся толькі „аграрныя“ „г“, „ч“ і „р“ у вымаўленні“ (Свабода, 25.01.96). Гэта дало падставы разглядаць у абагульненым выглядзе трасянку як набор „*непісьменных слоў, спалучаючых сабой рускі лексічны і беларускі фанетычны варыянты*“ (Круг, 4.04.96). Такую асаблівасць трасянкі, дарэчы, заўважаюць і карэнныя расійцы, якія канстатуюць, як гэта зрабіў нехта з расійскіх пісьменнікаў, будучы ў Менску: „*Слова-то, вроде, русские, а вот язык…*“ (Літаратура і мастацтва, 5.12.97). Аднак з пункту погляду гаворачых, у тым, што яны гавораць на расійскай мове, — сумнення не можа быць. Найбольш выразнымі сведчаннямі гэтага з’яўляюцца маркіровачныя элементы (звычайна — найбольш частотныя), якія маюць, на іх думку, выключна расійскі характар. Гэта словы тыпу *да*, *вот*, *іменна*, *эта*, *как* і падобныя, якія з’яўляюцца ў трасянцы найбольш прадказальнымі. І наадварот, непрадказальнымі з’яўляюцца спалучэнні слоў, рэпрэзентуючых розныя моўныя сістэмы; пры гэтым адбываюцца некантраляваныя працэсы, вядомыя ў лінгвістыцы пад назвай „змена коду“ („code-switching“). Гэта заўважылі носьбіты незмяшаных формаў маўлення, стварыўшы шэраг анекдотаў. Вось адзін з іх у інтэрпрэтацыі Ўладзімера Содаля: „*З малых гадоў мне запомніўся і жарт пра зайца, які бегаў з бульбы ды ў картошку, з картошкі ды ў бульбу. Хоць і малы быў, але зразумеў, што гэты жарт высмейвае людзей, якія не трымаюцца сваёй мовы*“ (Роднае слова. 1997. №9). Або яшчэ больш паказальны выпадак: „*Чалавек з вёскі паехаў у горад. Сусед пытае: — Ну, як з’ездзіў? — А нішто. Туды ехаў — гляджу: на дарозе ляжыць палена. Назад еду — сматру: ляжыць браўно*“ (Свабода, 18.07.97).

Як з’ява індывідуалізаваная, трасянка ўзнікае ў выніку стыхійнага засваення расійскай мовы непасрэдна ў працэсе моўных зносін з яе носьбітамі, а не ў працэсе паступовага арганізаванага навучання вымовы і правілаў граматыкі людзьмі, выгадаванымі ў беларускамоўным вясковым асяроддзі. Звычайна гэта было звязана з перасяленнем у горад або раптоўным павышэннем грамадскага статусу, г.зн. зноў жа перамяшчэннем, толькі ў сацыяльным плане. Дасканалае авалоданне іншай мовай гэткім **прамым** метадам магчыма

толькі ў вельмі раннім веку, у іншых выпадках дасягнуць яго без пастаноўкі вымаўлення, свядомага вывучэння граматычнай будовы не ўдаецца. Добрай ілюстрацыяй сказанага з'яўляецца фрагмент публікацыі Міхася Тычыны „Старшынёва „рош"": "*Малады, гадоў трыццаць пяць, а можа крыху больш, старшыня калгаса, з якім мы аглядаем палетак, паводзячы рукой, загаварыў:*
— Вот там у нас пасеяна рош, а за пасадкамі грачыха, двадцать гектаров…
Ці даўно ён, ураджэнец вялікай слуцкай вёскі, дзе матчына мова яшчэ пакуль не забыта-закінута, як у горадзе, гаварыў „жыта", „грэчка", „бульба", „гарбуз"? Пакуль не пайшоў у „людзі". Армія, сельскагаспадарчы інстытут, наменклатурнае асяроддзе раённага маштабу, дзе мова беларуская не ў пашане — ёю і сёння пагарджаюць, — зрабілі сваю справу. І на сустрэчы з вучнямі вясковай школы з нагоды пачатку навучальнага года, куды запрасілі і старшыню… папрасіўшы прабачэння, сказаў:
— Я буду говорить по-русску.
А выйшла звыклая „трасянка"" (Наша слова, 15.11.95).
Недастатковаму валоданню другаснай моўнай сістэмай нярэдка спадарожнічае з'ява, якую ў амерыканскай лінгвістыцы называюць „self-hatred", пагарда і нянавісць да роднай мовы; апошнюю пачынаюць лічыць асноўнай прычынай сваёй загнанасці і нягодаў. Пры гэтым можа адбывацца разбурэнне і першаснай моўнай сістэмы, у выніку чаго становіцца немагчымым ці вельмі ўскладненым і маўленне па-беларуску. Фактычна чалавек, незалежна ад яго жадання, прадукуе толькі „трасянкавы тэкст", як гэта добра паказаў у сваім эсэ гарадзенскі пісьменнік Алесь Чобат: „*Сын Мані, загадчык раённага аддзела народнай адукацыі Іван Іванавіч Казяўка, жнівень ненавідзеў. Кожны год у канцы лета да яго цягаліся патрыёты і даставалі за беларускую школу. А следам, ужо ў верасні, урываліся маёршы і падпалкоўнічыхі і пагражалі, што напішуць Руцкому і Хасбулатаву, што ён нацыяналіст! А Казяўка быў проста ні рыба, ні мяса, а чалавек — і хацеў жыць, як усе.*
— Гаварыце ж, как людзі! І ні будзіт нікакіх праблем! — ~~Вы гаворыце~~ ушчуваў ён нацыяналістаў. — Вот я тожа беларускі хачу размаўляць на роднай мове, еслі нада… Калі ласка!
— Ну што вы так сразу?! — адбіваўся ён ад афіцэраў

5 Вы гаворыце Л.Ц. Успаміны і ўспрыняцці: лінгвістычныя аспекты

сагласян, сагласян я: ня нада спяшыць! Но вы жа русскага, гдзе жывёця… Да я сам за саюз! Но ня ўсё жа сразу… (Літаратура і мастацтва, 7.11.94).

Носьбіты т.зв. сумешчанага двухмоўя адчуваюць, што іх стыхійнае валодання кожнай з дзвюх моў не адпавядае патрэбам „раскаваных“ зносін. Таму яны пазбягаюць гаварыць на пэўнай мове ў афіцыйных сферах жыцця, набываюць своеасаблівы комплекс „моўнай непаўнавартасці“[5]. Такім чынам, трасянка як бы паралізуе моўную дзейнасць індывідуума, выштурхоўвае яго за межы актыўнага грамадскага жыцця. Зрэшты, у сітуацыі, калі трасянка становіцца звыклым сродкам зносін, губляючы свой крэалізаваны характар, што можна часта назіраць у нашых умовах, яна ператвараецца ў своеасаблівы сродак ідэнтыфікацыі або групавой салідарнасці яе носьбітаў. Неўнармаванасць трасянкі, яе аморфны і плынны характар, даюць яе носьбітам у некаторых сітуацыях падставу процістаўляць сябе як прыхільнікаў разняволення ці прагматызму ў моўнай сферы карыстальнікам літаратурнай мовы з жорсткай нормай, што патрабуе пэўных намаганняў для яе засваення. Але часцей за ўсё такі аргумент ужываецца толькі ў якасці аднаго з апраўданняў няведання беларускай літаратурнай мовы, бо суб'ектыўна большасць „трасяначнікаў“ імкнецца да таго, каб іх ідэнтыфікавалі з носьбітамі расійскай мовы. Што датычыць апошніх, то іх рэакцыя на т.зв. моўныя памылкі „трасяначнікаў“ у залежнасці ад культурна-гістарычных і сацыяльна-палітычных фактараў можа вагацца ад непрыхільнай варожасці праз дабрадушную іронію да абсалютнай моўнай талерантнасці. У апошнім выпадку ідэнтыфікацыя ці збліжэнне адбываецца на іншай глебе (палітычнай, ідэалагічнай, прагматычнай і г.д.), а не на моўнай (як у прыведзеным вышэй выказванні аднаго з расійскіх пісьменнікаў). Мяркуецца, што гэта — непазбежнае зло на шляху да такой ідэнтыфікацыі, якое з цягам часу будзе пераадолена ў індывідуальным парадку.

Шырокае выкарыстанне трасянкі можа істотным чынам паўплываць як на культуру расійскамоўнага, так і беларускамоўнага маўлення.

Пагрозу трасянка нясе найперш для далейшага лёсу беларускай літаратурнай мовы. Стыхійны ціск на яе ці

свядомае патрабаванне „не адрывацца ад жывой мовы“ вядуць да разбурэння складзеных нормаў, страты свайго „аблічча“ і небяспечнага збліжэння з расійскай мовай, што адразу ставіць пад сумлеў само існаванне асобнай літаратурнай мовы. Гэта добра разумелі тыя, хто ў 30-я гады справакаваў (як паказалі архіўныя матэрыялы, тут дзейнічаў добра падрыхтаваны агент[6]) вядомае выступленне Я.Воўка-Левановіча[7] з прапановамі аб увядзенні некаторых асаблівасцяў у правапіс з мэтай набліжэння іх да нормаў рускай мовы. Гэтыя прапановы, якія ў 1929 г. я ацаніў як „*Про некоторыя важнейшыя недахопы беларускай літаратурнай мовы*“. *Даклад разам з правільнымі палажэннямі мовы і дома памылковых. Напрыклад, аўтар абгрунтаваў неабходнасць перадачы на пісьме ва ўсіх іншамоўных словах змякчэння перад галоснымі пярэдняга раду (ідзеал, інцярэсы, цэнтр, мацер’я, сціль, цеатр, церміналогія) і замены ўжо вядомых беларускай літаратурнай мове слоў рускімі адпаведнікамі (аб’яўленне, апрэль, аўгуст, гасударства, знамя, средства, фяўраль, шчот, январь і г.д.) на той падставе, што гэта, маўляў, мове часткі беларускага насельніцтва, асабліва горадаў, яны ўжываюцца. Менавіта на жывую мову горада, указвае дакладчык, і павінна арыентавацца ў сваім складанні і развіцці беларуская літаратурная мова*“[7]. Неабавязкова тлумачыць, што ў прапановах свядомае імкненне падарваць асновы беларускай літаратурнай мовы, але аб’ектыўна яны працавалі на ўкараненне Сталіным „збліжэнне“ і „зліццё“ моў народаў СССР з рускай мовай[8].

На падобны шлях „выратавання“ беларускай літаратурнай мовы звяртаюць увагу і некаторыя нашы сучаснікі. Так, Міхась Пузіноўскі следам за Юр’ем Хадыкам прапануе даць „*ідэі, якія грамадзянства*“ *звычайнай трасянцы, бо яна, на яго думку, сведчыць, што родная мова яшчэ не забылася, а суседзям не авалодала чалавекам цалкам*” (Наша слова, 3.02.94). Нешта падобнае прапанаваў у сваім выступленні на з’ездзе беларускай мовы 6 кастрычніка 1995 г., а пасля ў публікацыі ў газеце „Беларуская маладзёжная“ (7.01.97) і Андрэй Мельнікаў. Акрамя пэўных правапісных (скасаванне *ў*, паралельнага ўжывання *і* разам з *и*, ужывання мяккіх фанем *р’, ч’, ш’* у запазычаннях і г.д.) аўтар раіць перагледзець такі фактар, як

[6] Так, в октябре 1929 г. я выступіў у Акадэміі навук БССР з дакладам „Пра некаторыя важнейшыя недахопы беларускай літаратурнай мовы“. Даклад разам з правільнымі палажэннямі мовы і дома памылковых. Напрыклад, аўтар абгрунтаваў неабходнасць перадачы на пісьме ва ўсіх іншамоўных словах змякчэння перад галоснымі пярэдняга раду (ідзеал, інцярэсы, цэнтр, мацер’я, сціль, цеатр, церміналогія) і замены ўжо вядомых беларускай літаратурнай мове слоў рускімі адпаведнікамі (аб’яўленне, апрэль, аўгуст, гасударства, знамя, средства, фяўраль, шчот, январь і г.д.) на той падставе, што гэта, маўляў, мове часткі беларускага насельніцтва, асабліва горадаў, яны ўжываюцца. Менавіта на жывую мову горада, указвае дакладчык, і павінна арыентавацца ў сваім складанні і развіцці беларуская літаратурная мова“

[7] В 1929 году я выступил в Академии наук БССР с докладом „О некоторых важнейших недостатках белорусского литературного языка“. Доклад вместе с правильными положениями языка и дома ошибочных. Например, автор обосновал необходимость передачи на письме во всех иностранных словах смягчения перед гласными переднего ряда (идеал, интересы, центр, материя, литература, цирк, церемониал, терминология) и замены уже известных белорусскому литературному языку русскими эквивалентами (объявление, апрель, август, государство, знамя, средство, февраль, чтобы, январь и т.д.) на том основании, что это, якобы, отвечает языку части белорусского населения, особенно городов, где они употребляются. Именно на живой язык города, указывает докладчик, и должен ориентироваться в своем составе и развитии белорусский литературный язык

[8] После доклада В.Левановича я и Тарас Кенька, Михась Чарот, Иван Ермаченок, Петрусь Бровка, Кондрат Крапива, Язэп Дылэнка, Алесь Гурло, Кастусь Цвірка, Янка Скрыган, Алесь Якімовіч и другие белорусские писатели, ученые, общественные деятели выступили с резкой критикой В.-ича, его националистических взглядов, вредительской деятельности. Левановича отстранили от работы, а затем арестовали. Вскоре были арестованы и многие из названных выше писателей, ученых, общественных деятелей. Среди арестованных были и те, кто выступал с критикой В.-ича. Так, Кастусь Цвірка, Янка Скрыган, Алесь Якімовіч были приговорены к 10 годам лишения свободы, Петрусь Бровка, Кондрат Крапива, Язэп Дылэнка, Алесь Гурло — к 8 годам, Тарас Кенька, Михась Чарот, Иван Ермаченок — к 5 годам. Все они были реабилитированы посмертно. Левановича расстреляли в Минске

нарматыўнасць.

У прынцыпе, характару беларускай як параўнальна невялікай славянскай літаратурнай мовы адпавядае гнуткасць і адкрытасць нарматываў, але прыняцце некаторых прапаноў А. Мяцельскага несумненна вядзе да таго ж выніку, пра які гаварыў Р. Параўнайце, напрыклад, такі пасаж: „*Вартае ўвагі і тое, што нарматыўную запазычанай лексікі, калі яна шырока ўжываецца паралельна з ранейшай (напрыклад: „званіць“, „тэлефанаваць“, „атражаць“, „абшчэнне“ і г.д.). Тое, што пераважна запазычанняў будзе з рускай мовы, не павінна палохаць нас: запазычанняў наша мова не зробіцца рускай, бо ў ёй свайго моўнага багацця. Выкідваць з мовы тое, што прыемна вымаўляць, людзі не будуць, а адмаўляцца ад чужога, калі яно дапамагае існаванню — глупства*“.

распускаются
[illegible]
[illegible]
[illegible]

вопыт чэшскай мовы, дзе напаўгерманізаванае гаворкі не перашкодзіла ўсталяванню ў грамадстве чэшскай літаратурнай мовы (хаця і захавалася пэўнае супрацьпастаўленне дзвюх ідыёмаў паводле сфер ужывання). З другога боку, пры неспрыяльных умовах паступова можа адбыцца змена мовы, і трасянка — крок на гэтым шляху. І тут для дабра справы мэтазгодна размежаванне сфер ужывання трасянкі і ўзорнай літаратурнай мовы, бо, як сцвярджаў адзін з удзельнікаў дыскусіі, “*кніжная і „адраджэнская“ трасянкі дапаможа знайсьці паразуменьня з „простым чалавекам“*” (Наша Ніва, 24.07.2000). Але гэта зусім не значыць, што *prosta mova* непатрэбная і не варта дбаць пра яе культуру. Вяртаючыся да вызначэння лінгвістычнай сутнасці трасянкі, трэба прызнаць, што датуль, дакуль у межах гэтай з’явы захоўваецца здольнасць да асіміляцыі чужых моўных структур (фанетычных, марфалагічных і сінтаксічных), можна казаць пра яе беларускі характар. Паводле Барбары Шыдлоўскай-Цэглёвай, знанай даследчыцы „згаслай“ палабскай мовы, прыстасаванне сваіх слоў, перш за ўсё ў марфалагічнай сістэме, да структуры экспансіўнай мовы ёсць сігнал пераходу ад адзіны код (чужамоўны)[9].

Застаюцца нявысветленымі ў тэарэтычным плане і пытанні феномену трасянкі да тыпалагічна падобнай з’явы, якой была беларуска-польскага моўнага ўзаемадзеяння, зафіксаваная ў пісьме ў знаным „Дзённіку“ Ф.Еўлашоўскага або „Дзярэюшы“ М.К.Радзівіла. На думку некаторых даследчыкаў, сюды ж адносіцца і т.зв. *проста мова*, на якой пісалі І.Вышанскі, З.Капысценскі, М.Сматрыцкі, П.Бярында, І.Ужэвіч і іншыя беларуска-ўкраінскія пісьменнікі сярэднявечча[10]. Сцвярджаецца нават, што мова твораў Ф.Скарыны з’яўляецца адным з ранніх выпадкаў фіксацыі беларуска-царкоўнаславянскай трасянкі[11]. Але нам здаецца, што такое пашырэнне тэрміну „трасянка“ на пісьмовую мову не мае падстаў. Усе славянскія літаратурныя мовы, якія развіваліся ў рамках царкоўнаславянскай традыцыі, у сілу сваёй спецыфікі, якая характарызавалася пераемнасцю, спалучалі ў сабе элементы народныя з царкоўнаславянскімі. Але, незалежна ад гэтага, ім была ўласціва больш або менш выразная норма, што зусім не характэрна для трасянкі, якая —з ліку непісьмовых моў. З’яўленне ж у апошні час тэкстаў, стылізаваных пад

---

9 Jerzy Kozłowski. Wstęp // Moser M. Antologia literatury łużyckiej. Warszawa, 1988. S.442.

10 Moser M. Ostatnia *prosta mova* // Slavia. 1995. Roč. 64. Sv. 1.

11 Moser M. Die ukrainische und weißrussische Interferenzschicht im russischen Satzbau des 16. und 17. Jahrhunderts. Frankfurt a. M., 1998.

12 Свяцінскі У. З гісторыі беларуска-ўкраінскіх „дружбаў“ // Наша слова. 1990. №2.

трасянку, трэба разглядаць як мастацкі прыём, накіраваны на дасягненне пэўнага эфекту, часцей за ўсё, адмоўнай або камічнай характарыстыкі персанажа — яе носьбіта.

[image]
[image]

№ 6 (11) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Максім Маскалёў
Апошняе абнаўленьне: **22-03-2001**
[image]

Андрэй Хадановіч

АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ паэт, перакладчык паэзіі і гуманістыкі, выкладае замежную літаратуру ў ВДУ. Апошняя ягоная публікацыя — артыкул „Міхась Баярын: паэт для чытання розумам" у першым нумары „ARCHE-Скарыны"

Паляваньне на клясыкаў
Нататкі на палёх перакладаў Бадлера, Малярмэ, Ейтса

Калі гэты тэкст толькі пісаўся, аўтару вельмі хацелася назваць яго „Бляск ды мізэрнасьць беларускага перакладу". Алюзія на бальзакаўскае „Бляск ды мізэрнасьць куртызанак" падавалася яму слушнаю, бо праца перакладчыка напраўду мае шмат супольнага з найстаражытнейшай у сьвеце прафэсіяй. Па-першае, шмат перакладаў так ці іначай даводзіцца рабіць на замову, і сярод арыгінальных аўтараў, што трапляюцца перакладчыку, далёка ня ўсе могуць быць яму даспадобы. Але ж прафэсійная этыка і кан'юнктура рынку часьцяком не пакідаюць табе выбару. (Пагатоў калі ход пра маладую літаратуру, дзе школа перакладу ня вельмі моцная, і саміх выканаўцаў гэтага ганаровага абавязку ня так шмат: ня зробіш ты — ёсьць рызыка, што ня зробіць ніхто.) Абавязковая ж умова якаснай працы — угляданьне ў арыгінальны тэкст, спроба прапусьціць яго празь сябе, зрабіць чымсьці асабістым і, калі хочаце, — любімым. Цынік назваў бы гэта пэўнай сымуляцыяй

каханьня, прычым эфэктыўнасьць гэтай сымуляцыі — паказчык тваёй прафэсійнасьці. Жаданы ганарар толькі дадае перакладчыкаваму становішчу двухсэнсоўнасьці.
Па-другое, нават працуючы „па любові“, амаль заўсёды рызыкуеш стацца няверным каханкам*: traduttore — traditore*, слушна заўважылі італьянцы, перакладчык — здраднік. Традыцыйны афарызм — пераклад як жанчына: калі прыгожы, дык няверны, а калі верны, дык непрыгожы — маглі прыдумаць самі перакладчыкі, спрабуючы *перакласьці* свой сорам на нейкі там пэрсаніфікаваны пераклад. Згадзецеся, у такім выглядзе думка сфармуляваная хутчэй какетліва, чым зьняважліва, але ж сумнавядомым здраднікам быў, ёсьць і будзе не нейкі абстрактны пераклад, а канкрэтны перакладчык — ты сам.
Па-трэцяе, праца гэтая амаль ніколі не бывае ўдзячнаю. Тут, як у сэксе: калі атрымалася, дык мяркуюць, што ўсё абумовіў адно геніяльны аўтэнтык, а перакладчык проста нічога не сапсаваў; калі ж атрымалася горш ад вашых чаканьняў і тэкст чымсьці не падабаецца, дык лічыцца, што ўва ўсім вінаваты менавіта перакладчык. Апрача таго, да перакладчыкавай прадукцыі спажыўцы краснага пісьменства зьвяртаюцца па новыя ўражаньні — жадаючы „пераключыцца“, адпачыць ад сужэнскага абавязку ў дачыненьні да літаратуры айчыннай. Але, робячы гэтак, нават не падазраюць пра сілу прызвычаенасьці да свайго, засвоенага ў школе ды ўсмактанага „з малаком маці“, да таго, з чым пражыў доўгія гады. І прынцыпова адрознае часам выклікае сьвядомае ці падсьвядомае адпрэчаньне, „пазашлюбнага“ далучэньня да іншай культуры ў перакладзе не адбываецца, і чытач інстынктыўна застаецца „верным мужам“, расчараваўшыся ў няўдалым „адультэры“.

Апошняя заўвага месьціць у сабе ня столькі жарт, колькі сумную праўду. Нацыянальная літаратурная традыцыя мае пэўную сыстэму этычных ды эстэтычных вартасьцяў. І калі чужая культура наважваецца падняць руку хоць на найменшую драбязу з гэтых вартасьцяў, абурэньню шараговага (а падчас і падрыхтаванага) чытача няма межаў. Сам чуў, як людзі з рэпутацыяй першых беларускіх інтэлектуалаў дакаралі, калі гнеўна, а калі з сумам, французскіх „выклятых паэтаў“: у Бадлера, маўляў, замала жыцьцесьцьвярджальнага, і Малярмэ

далёкі ад народу, а сэксуальная арыентацыя Вэрлена з Рэмбо наагул пакідае жадаць лепшага.
А ўсё перакладчыкі! Далі ім на сваю бяду адукацыю, а яны ўзялі ды прасякліся атрутным сокам чужой нам цывілізацыі ды іншых спрабуюць атруціць, густы моладзі псуюць, выхоўваюць багему, якая замест Івана Шамякіна чытае Генры Мілера! А чаму добраму здольны навучыць той Мілер?..
У Стэфана Малярмэ ёсьць твор „Асеньняя скарга“, верш прозаю, які напісаны пад відочным уплывам Бадлера і ў якім, як у люстры, адбілася тагачасная літаратурная палеміка наконт карысьлівасьці й бескарысьлівасьці, маральнасьці альбо амаральнасьці мастацтва. Аўтар вызнае тэорыю „чыстага мастацтва“, што выразна праявілася ў дадзеным тэксьце. Варта працытаваць тут заканчэньне гэтага верша. *„…Ажно ціха й журботна пад акном маім запяяла катрынка. Яна грала ў вялікіх таполевых прысадах, дзе лісьце мне нават увесну здаецца панурым, з таго часу як постаць Марыі праплыла там ізь сьвечкамі — у апошні раз. Інструмэнт для засмучанага. Так, напраўду, бо фартэпіяна іскрыцца, скрыпка дорыць надсаджаным нашым пачуцьцям сьвятло й толькі голас катрынкі нясе безнадзейныя мроі ў сутоньне маіх успамінаў. Яе мармытаньне, вясёлы і зьбіты матыў, струмень чыстае радасьці ў сэрцы прымесьцяў, старызна й тандэт — скуль жа гэтае песьні стае, каб вярэдзіць душу, прымушаючы плакаць, як над рамантычнай балядай. Смакуючы сьпеў, я ня кінуў на двор ані су, каб ня зьнішчыць чароўнасьці, угледзеўшы, што катрынка пяе не сама“.*
Такі бяскрыўдны верш, але шанцаў спадабацца беларускаму аматару паэзіі ў яго няшмат. Дэманстратыўная адмова лірычнага героя даць убожніну, выкліканая жаданьнем расьцягнуць эстэтычнае задавальненьне за кошт няўвагі да этычных абавязкаў (герой баіцца спыніць ігру), адразу насьцярожвае айчыннага чытача. Паводле нашых канонаў, літаратура ўвесь час мусіла ці то даваць станоўчы маральны прыклад, ці то выкрываць прыклад адмоўны, а тут — аніякага асуджэньня апісанага ўчынку. Таму абурацца нават тыя, што самі ані разу ў жыцьці нікому не далі міласьціны! Ня даў — ціхенька маўчы пра свой грэх, і барані Бог зрабіць такі свой учынак тэмаю твору!

Альбо яшчэ адзін прыклад — верш таго самага Малярмэ

„Блакіт “, які таксама можа паставіць беларускага чытача ў тупік дваістым стаўленьнем да ідэалу. Ідэал гэты максымальна поўна ўвасоблены ў вобразе блакіту, нябеснай сіні. Але лірычны герой верша войстра адчувае сваю адлегласьць ад ідэалу як пэўнага роду праклён. Дасканалая краса нябёсаў стаецца праўдзівым насланьнём для лірычнага героя, занадта недасканалага, каб дакрануцца да вечнай прыгажосьці, — і занадта вытанчанага, каб гэтага хараства ня бачыць. Адсюль намаганьні зрынуць з п’едэсталу сінь, сонечнае сьвятло, усялякую натуральную прыгажосьць:

Ратуйся! Сьціснутых павекаў цемру вызнай,
Каб скрухаю душу не сьвідравала сінь!
Бяжы! Але куды? Шмацьцё, рызьзё, старызну
Суворай цемрадзі на сорам дня накінь!
Тумане, загусьцей, сьвятло да рэшты зьнішчы
І шэраю смугой нябёсы зацягні:
Над бледнай вільгацьцю асеньняга гарышча
Зрабі дыхтоўны дах суцэльнай цішыні!
Каханая Нуда, зь ляцейскага ўзьбярэжжа
Ляці, ды прыхапі трысьцё, і твань, і глей:
Прагаліны сінцу, што птаства ў небе рэжа,
Замазкай багнавай, прашу цябе, заклей!
Каб жа шчэ коміны над кожнай камяніцай
Па сонцы попелам стралялі наўздагон!
Каб збыўся ў сопусе вандроўнае вязьніцы
Ліхтарні жоўтае наканаваны скон!

Чытача, знаёмага з творчасьцю Гюісманса альбо Ўайлда, такія інтэнцыі зьдзіўляць не павінны, але ж людзям, звыклым да беларускай літаратурнай клясыкі, спроба аспрэчыць натуральную прыгажосьць як вартасьць здаецца прынамсі недарэчнаю. Адэкватна ўспрыняць патас працытаваных вышэй малярмэанскіх строфаў, асабліва што тычыцца „жоўтай ліхтарні“ — сонца, замінае адна асацыяцыя, якая заканамерна паўстае ў сьвядомасьці „несапсаванага“ замежнай літаратураю беларускага чытача, — асацыяцыя з байкаю Кандрата Крапівы „Сава, Асёл ды Сонца“ і яе немудрагелістай маральлю: „Каб сонца засланіць, вушэй асьліных мала“. І перакладчык — пры ўсім захапленьні паэзіяй Малярмэ й высакародным жаданьні ўключыць яе ў сваю нацыянальную культуру — мусіць

усьвядоміць, што інэрцыя айчыннай традыцыі станавіцьме сабой сур'ёзную перашкоду на шляху французскага творцы да сэрцаў беларускіх аматараў паэзіі.

Паэзія Малярмэ наагул ставіць перад перакладчыкам адну вельмі цяжкую задачу. Кожны твор паэта ў арыгінале вымагае ад французскага чытача гранічных інтэлектуальных высілкаў — абавязковага напружаньня ўсіх разумовых цягліцаў плюс інтуіцыі. Пры жыцьці французскага паэта разумелі толькі адзінкі. Таму ўдалым можна было б лічыць такі беларускі пераклад Малярмэ, які адэкватна зразумела б прыкладна такая сама колькасьць „ідэальных" чытачоў. Задамося пытаньнем, як гэта магчыма. Для французскага чытача цьмянасьць Малярмэ вынікае з расхістанасьці сэнсавых сувязяў паміж словамі, з падмены лягічна арганізаванага выказваньня свабоднаю асацыяцыйнасьцю, з адвольнасьці і суб'ектыўнасьці аўтарскіх асацыяцыяў. Перад тым як перакладаць Малярмэ на іншую мову, трэба, як некалі пажартаваў Жуль Рэнар, перакласьці яго на французскую. Той самай ступені гермэтычнасьці ў вершах Малярмэ можна дасягнуць па-беларуску іншым чынам. Моўная сытуацыя ў нас такая, што кожны перакладчык павінен ня толькі перакладаць, але й дбаць і пра культуру беларускай мовы. Таму часьцяком перакладчык імкнецца ня толькі дабіцца дасканалага перакладу, але і выявіць сваю моўную самабытнасьць. У выпадку з Малярмэ моўны пурызм можа стацца кутнім каменем стратэгіі перакладу. Ёсьць вялізарныя пласты лексыкі, якія ня трапілі ў савецкія слоўнікі беларускай мовы. Гэтыя пласты можна знайсьці ў Ластоўскага, Станкевіча ды Байкова зь Некрашэвічам, чый расійска-беларускі слоўнік не перавыдаваўся ажно з 1928 г. Прычым імі можна скарыстацца напоўніцу, каб кожны вершаваны радок, кожны сказ рыхтаваў сярэднестатыстычнаму чытачу лексічную або сынтаксічную загадку. Спатыкнуўся на слове — мусіш як сьлед пагартаць слоўнікі. Вось табе й абавязковыя інтэлектуальныя высілкі, і магчымасьць сур'ёзна ўзбагаціць свой лексыкон. Натуральна, што пераважная бальшыня чытачоў гартаць слоўнікі палянуецца й ты проста паменшыш колькасьць патэнцыйных прыхільнікаў Малярмэ. У гэтым разе застанецца суцяшацца тым, што ў цябе атрымаўся пераклад, эквівалентны па гермэтычнасьці арыгіналу. Як, да прыкладу, верш „Дар паэмы":

Табе нясу дзіця
эдомскай
ночнай зморы!
Крывавакрылае,
згубіўшы свае
пёры,
Праз поўны
водару і золата
крышталь,
Праз шыльнік
шэрані (на
шыбінах, на
жаль!)
Сьвітаньне ў
парасі
лямпаднага
каджэньня,
О пальмы! падае
на гэта
спараджэньне;
Рот бацькаў
крывіцца
гіморамі агід,
І захлынаецца
самотаю
блакіт.
А ты,
кунежніца,
дачку на ўлонкі
пусьціш,
І, бласлаўляючы
народжаную
вусьціш,
Твой голас
загучыць,
салодкі
чарадзей…
Сібілавай рукой
ці выцісьнеш з

грудзей
Хоць кроплю
белiні, такой
доўгачаканай
Для вуснаў,
што жылі ў
сінечы
беззаганнай?

Складаная праблема паўстае перад перакладчыкам, калі твор адсылае чытача да іншага тэксту, часам створанага ў іншую эпоху й на іншай мове. Не заўважыць і, як вынік, згубіць такія міжтэкставыя сувязі ў перакладзе лягчэй лёгкага. Але, нават заўважыўшы іх, не заўсёды дасі сабе рады іх захаваць сродкамі сваёй мовы й культуры. Так, Эзра Паўнд у першай частцы сваёй паэмы „Х'ю Сэлвін Мобэрлі“ амаль жыўцом выкарыстаў першы радок „Тастамэнту“ Франсуа Віёна. У Віёна: *En l'an de mon trentiesme aage* — „На трыццатым годзе майго жыцьця“. У Паўнда: *L'an trentuniesme de son eage* — „На трыццаць першым годзе свайго жыцьця“. Перакладчыку вельмі хацелася захаваць прысутнасьць Віёна ў беларускім тэксьце, мала таго — надта карцела зрабіць гэтую прысутнасьць заўважнай ня толькі для спэцыялістаў па віёнаўскай творчасьці, але й для ўсіх адукаваных чытачоў. Зь якім вобразам асацыюецца французкі паэт у аматараў краснага пісьменства? Натуральна, з вобразам леташняга сьнегу з слыннай „Баляды пра дам мінулых часоў“. Хацелася захаваць паўндаўскую іронію, бо трыццаціаднагодзьдзе ягонага лірычнага героя не прынесла яму ўвагі з боку Мэльпамэны й дэльфійскага вянка на галаву. Давялося пайсьці на пэўную „адсябеціну“, зьмяшаўшы Віёна з Гарацыем ды наскім „сьмех дый годзе“:

Яго тастамэнт
— трывалейшы
за медзь
наконадні
трыццацігодзьдзя
пііта — за год
пасьпеў
спарахнець,
як леташні

сьнег дый годзе.

Яшчэ цікавейшаю выглядае справа зь міжтэкставымі сувязямі ў выпадку, калі тэкстам, які ты перакладаеш, скарыстаўся нейкі іншы аўтар — і цяпер у сусьветнай літаратуры ёсьць ня толькі твор пісьменьніка Х, але й алюзія на гэтага Х у творы літаратара У. Асабліва цікаваю выглядае задача перакладчыка, калі твор У з патрэбнай алюзіяй быў перакладзены на ягоную мову раней. Трэба ня толькі перакласьці першага аўтара, але й зрабіць гэта так, каб чытачы разумелі яго сувязь з другім пісьменьнікам. Парадокс сытуацыі ў тым, што нешта ранейшае з гледзішча гісторыі літаратуры „падганяецца“ пад тое, што паўстала пазьней. Вось, да прыкладу, вядомы бадлераўскі твор, які пачынае сабою кнігу вершаў прозаю „Парыскі сплін“:

„ — Загадкавы чалавек, скажы, каго ты любіш найбольш? Бацьку, маці, сястру ці, можа, брата?

— Я ня маю ані бацькі, ані маці, ані сястры, ані брата.

— Можа, сяброў?

— Вы ўжываеце слова, якое дагэтуль застаецца для мяне незразумелым.

— Айчыну?

— Я ня ведаю, на якіх шыротах яна знаходзіцца.

— Прыгажосьць?

— Я ахвотна палюбіў бы гэтую несьмяротную багіню.

— Золата?

— Я ненавіджу яго, як вы ненавідзіце Бога.

— Дык што ж ты любіш, дзіўны чужынча?

— Я люблю аблокі… аблокі, што праплываюць там… угары… цудоўныя аблокі!“

Праблема для перакладчыка тут у тым, што назовам гэтага верша — а ён у арыгінале называецца *L’ütranger* — скарыстаўся клясык ХХ стагодзьдзя Альбэр Камю, назваўшы так сваю аповесьць. Аповесьць гэтая сталася больш вядомаю за твор Бадлера, так што цяпер далёка ня кожны чытач Камю ўсьведамляе наяўнасьць бадлераўскай алюзіі. Таму існуе небясьпека, што ў перакладзе на тую ці іншую мову два гэтыя творы могуць страціць аднолькавасьць сваіх назваў. (Так, да прыкладу, здарылася ў расійскай літаратуры: аповесьць Камю была перакладзеная як „Посторонний“, а існыя пераклады бадлераўскага верша называюцца „Чужестранец“ і „Чужак“.) У сытуацыі перакладу на беларускую мову гэтае пытаньне можа

быць вырашанае адно так. Аповесьць Камю ўжо адаптаваная беларускаю культурай і мае свой беларускі назоў — „Чужаніца“. Адсюль вынікае неабходнасьць узгадняць ранейшы паводле напісаньня твор з храналягічна пазьнейшым ад яго. Перакладчык аповесьці Камю, Зьміцер Колас, не пакідае альтэрнатывы — і бадлераўскі верш проста мусіць называцца па-беларуску „Чужаніца“.

Такая самая праблема ўзьнікла пад час перакладаньня верша Ўільяма Батлера Ейтса *Who with Fergus?* („Хто з Фэргусам?“). Рэч у тым, што Дж. Джойс выкарыстаў у сваім „Улісе“ тры радкі з гэтага твору. Ян Максімюк, перакладаючы Джойса, натуральна, пераклаў і іх:

Расхмар чало,
ня думай дум,
Чаму так горкі
сэрца жар,
Вось Фэргус
гоніць свой
рыдван…

Пераклад гэтых радкоў Максімюком здабыў прызнаньне. Таму задачаю пры перакладзе Ейтса было зрабіць усё, каб згаданы кавалак верша па-беларуску адназначна пазнаваўся тымі, што ўжо азнаёміліся з максімюкоўскім перакладам „Уліса“. А бадай што адзіным спосабам захаваць тут бесьперапыннасьць літаратурнай традыцыі было простае ўлучэньне трох максімюкоўскіх радкоў у пераклад верша „Хто з Фэргусам?“:

Хто з Фэргусам
— і наўгалёп
Празь цені лесу
ўсё хутчэй,
І ў скокі ля
самой вады.
Юнак, навошта
хмурыш лоб?
Дзяўчына, не
хавай вачэй,
Забудзь пра
страхі

назаўжды!

Расхмар чало, ня думай дум,
Чаму так горкі сэрца жар,
Вось Фэргус гоніць свой рыдван…
Ён, ценяў лесу валадар,
Яднае акіянскі шум
І зор вандроўных акіян.

Мастацкі пераклад, асабліва пераклад шэдэўру, мае адну сумную заканамернасьць. Пры перакладаньні на сваю мову практычна немагчыма захаваць усе вартасьці, усе асаблівасьці арыгіналу. Станіслаў Бараньчак у сваім „Перакладчыцкім маніфэсьце“ наступным чынам ахарактарызаваў становішча перакладчыка: „Мы сьведкі клясычнай дылемы перакладчыка: як бы ён ні намагаўся, якіх бы ні шукаў эквівалентаў і субстытутаў, ён ня здолее захаваць усяго — ад чагосьці трэ будзе адмовіцца. Ад чаго? Гэта асноўнае, стратэгічнае рашэньне, якое, раз прынятае, стаецца падмуркам інтэрпрэтацыйнай тактыкі перакладу“. Перакладчыка можна параўнаць з дасьведчаным гульцом у брыдж. Ацэньваючы гульнёвы расклад, то бок чытаючы аўтэнтык і мяркуючы пра свае літаратурныя магчымасьці, ён мусіць наперад вызначыць пэўную колькасьць „сваіх“ бітак, тое, што яму належыць з поўным правам. Не атрымаць гэтага было б недаравальнаю памылкай. Акрамя таго, ужо на стадыі папярэдняга аналізу можна сказаць, якія біткі табе відочна не належаць — і зьмірыцца з гэтаю стратай. (Менавіта здольнасьць бяз болю разьвітацца з такімі „біткамі“ й адрозьнівае перакладчыка зь сякім-такім досьведам ад нэафіта, які прагне перакласьці ўсё й таму ў рэшце рэшт не перакладае нават магчымага). Апрача таго, ёсьць некалькі „бітак“ зь нявызначаным лёсам, за якія ў далейшым і варта весьці змаганьне.

Але ў картах ёсьць адназначная й зразумелая ўсім гіерархія. Перакладчык жа сам вызначае для сябе старшынство картаў ды масьцяў. І ўдаласьць выбару шмат у чым вызначае якасьць будучага перакладу. Унівэрсальных правілаў тут быць ня можа, кожны асобны выпадак дыктуе сваю стратэгію й тактыку. Важна вызначыць той (у кожным выпадку — свой) найбольш важны ровень паэтычнай арганізацыі тэксту, які нясе большую

ад іншых сэнсавую й эстэтычную нагрузку. Такі ровень звычайна называюць сэмантычнаю дамінантай твору. Гэта акурат тое, што павінна быць вызначана й перакладзена любою цаной. Без захаваньня гэтага пераклад наўрад ці можна лічыць паўнавартым.

У шэрагу твораў Бадлера мы маем дачыненьне ня зь яўнай, а з прыхаванаю сэмантычнаю дамінантай. Яна — падмурак бадлераўскай „глыбіннай рыторыкі“, паэтычнай камунікацыі за пасярэдніцтвам сугестыі.

У вершы „*Валасы*“, да прыкладу, лірычны герой цягам усяго твору шукае вытанчаных параўнаньняў для кудзераў гераіні. Верш складаецца зь сямі строфаў, і амаль у кожнай — усяго сем разоў — так ці іначай называюцца валасы. Але ж паэт ніводнага разу не паўтараецца, у кожным выпадку шукаючы асобнага слова. Без аналягічнага аднароднага раду словаў з агульным сэнсам ‘валасы’ беларускі пераклад твору бадай што й немагчымы. Мы прапанавалі наступны шэраг: „*О* лёканаў *каскад… О пекнага* руна *найчараўнейшы пах… Ў тваіх духмяных* валасах… *Прываблівыя* косы… Кудзеры… *О* пасмы*, вы шацёр блакітнага сутоньня… Ледзь пухкіх* павіткаў *кранулісяі далоні…*“.

У вершы *Réversibilité*, які быў досыць вольна перакладзены на беларускую як „*Збавеньніца*“, дамінанту становяць сабою паўтор ды супрацьстаўленьне. Радкі, што пачынаюць і, адпаведна, заканчваюць кожную з строфаў, маюць аналягічную пабудову. Амаль усе словы у кожным зь іх паўтараюцца, і толькі два кожнага разу іншыя. Апрача таго, у кожным выпадку ў першым паўрадкоўі месьціцца сьветлы, „анёльскі“ вобраз, якому пасьля цэзуры супрацьстаўляецца змрочная карціна фізычных альбо душэўных пакутаў: *Ange plein de* gaotй*, connaissez-vous l’*angoisse*?.. Ange plein de* bontй *connaissez-vous la* haine*?.. Ange plein de* santй*, connaissez-vous les* fiuvres*?.. Ange plein de* beautй*, connaissez-vous les* rides*?..* Уражаньне ўзмацняецца ўнутранай рымоўкаю: шэраг словаў перад цэзураю рымуецца міжсобку: *gaotй — bontй — santй — beautй*. Захоўваючы паўторы з антытэзамі, мы кампэнсавалі адсутнасьць унутраных рымаў анафарамі: „*Мой* ветраны *анёл, ці зьведала ты* вусьціш*?.. Мой* ветлівы *анёл, ці зьведала ты* злосьці*?.. Мой* велічны *анёл, ці зьведала ты* зморы*? Мой* звабліві *анёл, ці зьведала ты* зморшчак*?..*“

З мэтанакіраванага захоўваньня сэмантычнай дамінанты зусім не вынікае, што ўсе іншыя ўзроўні арганізацыі аўтэнтыка мусяць ігнаравацца — у паэзіі няма другаснага, неістотнага. Зь сьвядома прынесеных ахвяраў яшчэ не вынікае, што пераклад абавязкова мусіць быць нашмат горшы ад арыгіналу — непазьбежныя, наперад вылічаныя страты часам шчасьліва кампэнсуюцца непрадбачанымі, выпадковымі мастацкімі знаходкамі — тым, што дае нам падставы вызначыць такі мастацкі мэтад перакладчыка, як „дадаізм“ (натуральна ж, ад слова „дадаваць“). Нарэшце, з бальзакаўскіх „бляску ды мізэрнасьці“, якія мы ў рэшце рэшт так і ня вынесьлі ў загаловак сваіх развагаў аб працэсе перакладаньня паэзіі на беларускую мову, абсалютна не вынікае ніякага зьняважлівага альбо скептычнага стаўленьня да гэтай мастацкай практыкі. Бо да першай часткі бальзакаўскай дылёгіі — „Страчаных ілюзіяў“ — у нас пакуль не дайшло і, спадзяюся, ня дойдзе.

[image]
[image]

Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Максім Маскалёў
Апошняе абнаўленьне: **23-03-2001**
[image]

АНДРЭЙ СКУРКО
асьпірант філялягічнага факультэту БДУ. Сябар рэдакцыі „ARCHE" ад яе заснаваньня

Андрэй Скурко

Чырвоны казуркаед
Па старонках часопіса „Вожык“

Найгалоўнай татэмнай жывёлінай беларускага сьмехавага дыскурсу, безумоўна, зьяўляецца „Вожык“. Ён у(ва)ліўся ў стройныя шэрагі іншых гэткага ж кшталту „Кракадзілаў“ ды „Пэрцаў“ напрыканцы вайны і, трэба сказаць, дробным драпежнікам атраду казуркаедаў стаўся не адразу. Гэта адбылося ў выніку паступовае дэактуалізацыі адпачатковае назвы — „Раздавім фашысцкую гадзіну“, — якая, калі ўспрымаць яе як Nominativ (кшталту „Піонэр Беларусі“, „Скарына“), нагадвае, хутчэй, поўнае імя („ФІО“) якога-небудзь харызматычнага правадыра аднае з экзатычных народных дэмакратыяў Цэнтральнае Афрыкі.

Я слышу топот быстрых ножек —
То вышел в свет задорный „Вожык“
Тебя приветствовать я рад,
Расти и крепни, мой собрат,

Стахановцам будь верным другом,
Они краса родной земли,
А нерадивых по заслугам
Покрепче иглами коли. —
гэткімі словамі вітаў Вожыкава зьяўленьне на сьвет старэйшы таварыш, расейскі „Крокодил“: гадуйся, маўляў, baby, ды глядзі трымайся ідэалягічнай лініі…
Зьмена назвы, выкліканая зьнікненьнем памянёнай „фашысцкай гадзіны“, ніякім чынам не адбілася на ідэйнай зададзенасьці часопіса: калі баявы лісток заклікаў „давіць“ („мачыць“ па-нашаму), „Вожык“ абавязаўся „калоць“ — „жорстка і бязлітасна — палітычнага слепака ў вока, гультая ў бок, хабарніка ў далонь, балбатуна ў язык… У кожнага абармота я знайду балючае месца, каб укалоць…“.
Перш за ўсё, калі праглядаеш нумары розных гадоў, вока чапляецца за дзьве рэчы: паступовую зьмену габарытаў часопіса (у пэрыяд з 1957 па 1977 гады „Вожык“ зьменшыўся амаль што ў два разы), і тэматычныя мэтамарфозы. Справа ў тым, што першыя колькі год, покуль сувязі з пэрыфэрыяй замінала пасьляваеннае бездарожжа, а патэнцыйныя селькоры перабывалі ў стане пасьляпераможнай эўфарыі, „Вожык“ ня меў той характэрнай для сёньняшняга часопіса агратэхнічна-прамысловай арыентацыі і быў выданьнем нават крыху ўрбаністычным — зьмяшчаў шмат гарадзкіх навінаў, празаічных і паэтычных рэфлексіяў на менскія тэмы (кшталту паэмы пра нядзельнае сьвята ў гарадзкім садзе і футбол у прыцемку, якім яно скончылася) і, па вялікім ліку, характарызаваўся большай канкрэтнасьцю, суаднесенасьцю зь межамі пасьляваеннага Менску. Асабліва гэта тычыцца фэльетаністыкі і карыкатурыстыкі, якія тады яшчэ не ператварыліся ў абстрактна-дыдактычнае шальмаваньне абагулена-тыповых заганаў: на бачынах „Вожыка“ чытач мог убачыць і менскі кінатэатар „Беларусь“, у якім страха цячэ, і кілямэтровую чаргу ў Менскай абласной бібліятэцы (бачыце, у якую даўніну сягае карэньне такіх звыклых для нашае сёньняшняе рэчаіснасьці зьяваў — на добры толк іх даўно ўжо трэ было б абвясьціць нацыянальным набыткам і ўзяць пад ахову дзяржавы).

Літаратурная частка тагачаснага „Вожыка“ каштоўная ўжо тым,

што адкрывае нам пэўныя біяграфічныя і творчыя таямніцы клясыкаў беларускае літаратуры — так, напрыклад, з артыкулу „Запіскі Віктара Татарынчыкава“ (1945, № 2, с.7) можна дазнацца, што паэт, кінадраматург, перакладчык, сябар СП Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, ляўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы, Дзяржаўнай прэміі Беларусі „і прочая“ — Анатоль Вялюгін — не адразу стаўся гэткім шаноўным ды заслужаным, а быў некалі звычайным хлопчыкам Толем, які на самым пачатку шляху ў літаратуру ня грэбаваў „граматным перапісваньнем“ вершаў іншых пісьменьнікаў: „Верш Толі ў „Піонэры Беларусі“ пад назваю „Перамога“… зусім не Толі, а Пятра Глебкі. Толя перапісаў верш з газеты „Літаратура і мастацтва“ зусім граматна, нават не прапусціўшы ніводнае коскі“.

Засьвяціўся ў літаратурнай рубрыцы „Вожыка“ і беларускі завочны Міклуха-Маклай — Янка Маўр. Ад ягоных этнаграфічных зацемак з жыцьця і побыту японскіх мілітарыстых вее лёгкім сумам па далёкіх краінах, куды могуць езьдзіць толькі савецкія дыпляматы, а простаму менскаму настаўніку дарога заказаная. Апісаньне таго, як робіцца харакіры, уражвае сваёй праўдзівасьцю і, безумоўна, укладаецца ў рэчышча мастацкае канцэпцыі натуралізму: „Заядлы самурай, не міргнуўшы вокам, сапраўды распароў сабе трыбух. Блізкія глядзелі, як выплываюць яго кішкі, і захапляліся самурайскім духам“. (Дый дзіцячыя кніжкі Янкі Маўра — што „Палескія рабінзоны“, што „Сын вады“ — не вызначаюцца асаблівым гуманістычным пафасам.)

А вось так рэагавалі зайздросьнікі на посьпехі выдатнага літаратуразнаўца Алеся Кучара на ніве беларускае крытыкі:

Што за дым?
Няўжо гарым?
Гэта, брат, з
газеты „ЛіМ“
Фіміям клубамі
валіць —
Кучар густа
сябе хваліць.
— Мо яму для
гэтай мэты
Даць яшчэ адну

газету?

Як кажуць, насіў воўк, панясуць і ваўка… Хаця гэты, сапраўды адзін з самых характэрных, крытыкаў тае эпохі, калі негатыўная рэцэнзія дароўнівала судоваму выраку, мог, з вышыні свайго п'едэсталу, не зважаць на дробныя падкопы пасрэднасьцяў, якім заўсёды сьвярбіць дробненька напаскудзіць „генію". Бо — як казаў іншы прэтэндэнт на геніяльнасьць (які, дарэчы, доўгія гады быў рэдактарам „Вожыка") — „каб сонца засланіць, вушэй асьліных мала".

Сучасны „Вожык" таксама часам зьвяртаецца да творчасьці вялікіх суайчыньнікаў. Так, у №4 за 2000 год зьмешчаныя фрагмэнты паэмы „Гора ад розуму" ў беларускай інтэрпрэтацыі М.Лужаніна. Перакладчык здолеў спалучыць дакладнасьць у перадачы тэксту арыгіналу з шыкоўным беларускім калярытам. Проста бліскуча Максім Лужанін падкрэсьліў надзвычайную палкасьць, экспрэсіўнасьць беларускіх жанчын, у параўнаньні нават з расейскімі:

Жанкі
канчаліся: ура!
І каптуркі ўгару
шпурлялі!

З часам „Вожык" набываў усё больш выразную этнаграфічна-пабытова-калгасную скіраванасьць. Ужо напрыканцы 50-х на кожнай яго старонцы квітнее і пахне сельская гаспадарка — старшыні, брыгадзіры, сьвінаркі, МТС… Часопіс робіцца больш абстрактным, ляяльным, бесканфліктным (калі б ня подпіс „У некаторых калгасах дрэнна ахоўваюцца маладыя сады" пад адной з тагачасных карыкатураў — ніколі б не здагадаўся, што крытыкуецца ўсё-ткі нядбайліца-вартаўнік, а не выяўленыя на малюнку зайцы, якія прагна абгрызаюць кару з дрэўцаў). Сяргей Харэўскі ў сваіх „Зьвярох-суайчыньніках" адзначае, што нацыянальным сымбалем Беларусі — у намінацыі „свойскія жывёлы" — можна бясспрэчна лічыць сьвіньню. На бачынах „Вожыка" гэтая думка пасьлядоўна праводзілася ў жыцьцё ледзьве ня сорак год. Сьвіньня зьяўлялася там ува ўсіх магчымых гіпастазіях ды інтэрпрэтацыях — можна нават сьцьвярджаць, што гэты вобраз набыў рысы ўнівэрсальнага

сымбалю і мог пазначаць абсалютна любую праяву ў межах беларускага савецкага сьмехавага дыскурсу.
Дзесьці на другую палову 50-х прыпадае і зьяўленьне яшчэ аднаго — ужо наднацыянальнага — архетыпу: грубога (або наадварот, доўгага, худога і насатага) Дзядзькі Сэма, які пасьля трывала абжыўся на апошняй старонцы часопіса і, разам са сваімі дружбакамі з NATO, рабіў там, што хацеў. Адным з найулюбёных ягоных заняткаў былі зьдзекі з мурына ў сінім працоўным камбінэзоне. Дзядзька Сэм неадменна выяўляўся з абавязковымі катэгарыяльнымі адзнакамі: пульхным пачкам даляраў (часам грашовыя адзінкі праклятай Дзядзькасэміі мелі выгляд манэтаў з жоўтага мэталу, якія ён высыпаў зь меху проста ў рукі розных „контрас“, „хунты“, „ізраільскай ваеншчыны“ і іншых „душманаў“) ды атамнай бомбай пад пахай. Сёньняшняя нашая пост(нэа)савецкая рэчаіснасьць — калі пачак даляраў у кішэні Дзядзькі Сэма адназначна ўспрымаецца як грант, а бомба лічыцца не абы-якім прыярытэтам на самым высокім дзяржаўным узроўні — перавяла яго ў шэраг станоўчых герояў і, тым самым, пазбавіла месца на Вожыкавых бачынах.

Зазнала пэўнае трансфармацыі і рубрыка „Ў джунглях капіталістычнага раю“, зь якой цнатлівы чытач сярэдзіны 70-х мог даведацца пра пэўныя асаблівасьці дзікага капіталізму: яна трансфармавалася ў Богу душою вінную лагодна-падкалодную калёнку „Па сакрэту з Інтэрнэту“, якая запрашае пасьмяяцца з кур’ёзаў амэрыканскага заканадаўства (кшталту таго, што ў адным са штатаў забаронена насіць з сабою зброю, даўжыня якой перавышае шэсьць футаў (180 см)… Згадваецца старая показка: „Колькі атрымлівае савецкі інжынэр?“ — „А затое ў вас нэграў лінчуюць!“).
Час ад часу кранаўся „Вожык“ і сьлізкае тэмы беларускага нацыяналізму: звычайна да ўгодкаў кастрычніцкае рэвалюцыі ў ім зьяўляліся малюнкі мастака Волкава з сэрыі „Ворагі народу“, на якіх у фэльетанізаваным выглядзе выяўляліся дзеячы беларускага адраджэньня. Вось, скажам, што было напісана пра нястомнага змагара з бальшавіцкай навалай генэрала С.Булак-Балаховіча:

Здаў экзамен на
бандыта я,

Галава мая
прабітая,
І патрапіў скора
я
На памыйніцу
гісторыі.

А Радаслаў Астроўскі характарызаваўся так:

У яго было
работы —
Ён лізаў
фашыстам
боты.

(На малюнку, пад якім зьмяшчаўся надпіс, быў адлюстраваны вышэйазначаны працэс).
„Вожык“ ад другой паловы 50-х да году так дзесьці 86-88-га істотна не зьмяняўся: харчаваўся сабе, фігуральна кажучы, мышамі ды жабкамі: лаяў на чым сьвет стаіць п’яніцаў-трактарыстаў, нядбайліц-даярак, аднак вышэй зладзея-брыгадзіра рэдка калі ўздымаўся. Будучаму электарату давалася выдатная мажлівасьць пасьмяяцца зь сябе самога, іншая справа, што ніякіх высноваў з гэтага ніхто ніколі не рабіў — проста не патрабавалася. Наадварот, п’янства ды нядбайства пачыналі ўспрымацца як агульная норма, як адзіны магчымы спосаб існаваньня. На тых месцах, дзе высновы рабіць было трэба, ставіўся акцэнт, як, скажам, на рубрыцы „Дзе, як, калі?“, больш прыдатнай назвай для якой былі б словы „Каго, за што, на колькі?“, бо распавядалася там выключна пра тое, хто, дзе, што і як украў і на колькі яго за гэта пасадзілі. Прычым распавядалася грунтоўна — часам нават падаваліся адпаведныя артыкулы крымінальнага кодэксу. (Рубрыка шчасьліва дажыла да нашага часу і, больш за тое, — нават павялічвае „пасяўныя плошчы“ — у „Вожыку“ №4 за 2000 год яна займае аж палову першай старонкі).

У другой палове 50-х, дарэчы, паліграфічная якасьць часопіса дасягнула вяршыні. Мяркуйце самі: у 1957 годзе ён выдаваўся на крайдаванай паперы, у адрозьненьне ад „Вожыка“ сёньняшняга, дый увогуле жаўтавата-шэрай большасьці

сучасных беларускіх часопісаў. Хаця найгоршыя ў гэтым пляне часы для „Вожыка“ ўжо, здаецца, мінулі. Прыпалі яны на першую палову 90-х, калі пад уплывам грамадзка-палітычных мэтамарфозаў часопіс пачаў узмоцнена зьмяняцца. Перш за ўсё адбылася крыху запозьненая, паводле эўрапейскіх стандартаў, сэксуальная рэвалюцыя: аголеная жаночая натура (і часткова аголеная мужчынская) занялі дамінантнае становішча на бачынах „Вожыка“ і маглі нават скласьці канкурэнцыю старой добрай сьвіньні (пра Дзядзьку Сэма і казаць няма чаго — ён на той час ужо знаходзіўся ў стадыі глыбокага заняпаду). Пасьля прыйшла пэўная палітычная свабода — яе кульмінацыя прыпала на 93–94-ы гады. Тады „Вожык“ дазваляў сабе калоць у пэўнае месца нават сьвятая сьвятых — першага прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь: „Пабіліся аб заклад Іван Сусанін з Аляксандрам Лукашэнкам: хто далей, хто глыбей, хто болей... Прайгра-а-аў Іван Сусанін“. Аднак нават гэтыя зьмены былі павярхоўна-касмэтычнымі, што і спрычынілася да сёньняшняга стану „Вожыка“. Як і іншыя дзяржаўныя выданьні, ён працуе з абабітым за дзясяткі год колам сваіх „вечных сюжэтаў“, якія проста крыху трансфармуюцца — часам без усякай суадноснасьці з рэчаіснасьцю — і мяняюцца месцамі з нумару ў нумар. Перавага абстрактна-побытавай тэматыкі ды алькагольныя рэмінісцэнцыі несьвядома падмацоўваюць каляніяльную зададзенасьць часопіса, маючы на мэце звужаць прастору мысьленьня чытача, каб ён страціў мажлівасьць успрымаць як сьмешныя ды абсурдныя зьявы вышэйшага кшталту і, цераз гэта, зрабіць яго бясьпечным для існае палітычнае сыстэмы. Зь іншага боку, „Вожык“ — гэта цэлая эпоха, гэта адбітак беларускага жыцьця — астабрыдлага ўмоўнасьцю і адпачатковай марнасьцю любых зьменаў, безвыходнай цыклічнасьцю. І ўсьведамленьне гэтага стае стымулам для пошукаў выйсьця з замкнёнае прасторы.
Адам Глёбус, выпадкова натрапіўшы ў рэдакцыі „Нашай Нівы“ на сьвежы нумар „Вожыка“, адразу адгарнуў апошнюю старонку: „Колькі ў іх наклад? Сем тысяч? А было сто…“

[image]
[image]

№ 6 (11) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Максім Маскалёў
Апошняе абнаўленьне: **23-03-2001**
[image]

ПАВАЛ АБРАМОВІЧ
асьпірант факультэту журналістыкі БДУ. Сталы аўтар газэты „Рабочы"

Павал Абрамовіч

Дубавец і Ластоўскі Чаму ўдалася першая і не ўдалася апошняя літаратурная дыскусія XX стагоддзя

1.

У 1998 годзе Сяргей Дубавец, рэдактар „Нашай Нівы“ і ідэолаг знакавых незалежных літаратурных і медыйных праектаў 80–90-х, надрукаваў у газеце „ЛіМ“, рупары Саюзу Пісьменнікаў, рэдагаванай у тыя часы будучым палітэмігрантам Уладзімерам Някляевым, свой артыкул „Ружовы туман. Раздзел з гісторыі таталітарызму“, прысвечаны праблеме пераацэнкі беларускай савецкай літаратуры. Дубавец пісаў рэзка і безапеляцыйна: „*Беларуская савецкая культура па сутнасці сваёй не мела нічога агульнага з нашай нацыянальнай культурай, заснаванай на глыбокіх традыцыях, падпарадкаванай нацыянальным інтарэсам і скіраванай да найвялікшае нацыянальнае мары — незалежнасці.*

Гэта быў яе сатанісцкі антыпод, які забіў і заглушыў беларушчыну, заняўшы ейнае пачэснае месца. Ілжывая вартасць уласна савецкіх твораў вытлумачвалася лжываю ідэалогіяй… Падступны амаралізм партыйнае палітыкі выяўляўся ў тым, што сацрэалістычная хлусня падавалася менавіта як беларушчына і менавіта як да беларушчыны да яе выхоўвалася любоў“. Зыходзячы з таго, што беларуская савецкая літаратура ёсць падробкай пад нацыянальнае мастацтва, Дубавец рашуча адпрэчваў яе эстэтычную вартасць. На ягоную думку, усю *„неабдымную“* спадчыну сацрэалізму неабходна аднесці да *„адпаведнага ёй раздзелу іншае дысцыпліны — „Гісторыі таталітарызму ў Беларусі*“. Па перакананні Дубаўца, гэта не толькі правільнае і канчатковае вырашэнне праблемы, але і адзіны магчымы маральны выбар.

Матэрыял Дубаўца выклікаў палкую дыскусію на старонках газеты. Літдэбаты вакол „Ружовага туману“ можна назваць апошняй буйной літаратурнай дыскусіяй XX стагоддзя ў Беларусі. А параўнаць іх хочацца з першай у гэтым стагоддзі беларускай літаратурнай палемікай — вакол крытычнага артыкулу Вацлава Ластоўскага „Сплачвайце доўг“, надрукаванага 5 ліпеня 1913 году ў „Нашай Ніве“. Са старонак газеты дыскусія перакінулася на іншыя выданні („Вечерняя газета“, „Виленский вестник“, „Калядная пісанка“, „Велікодная пісанка“ і іншыя). Удзел у ёй узялі Мечыслаў Бабровіч, Максім Багдановіч, Змітрок Бядуля, Максім Гарэцкі. Асоба ж першага апанента Ластоўскага, які схаваўся пад псеўданімам „Адзін з парнаснікаў“, не выяўлена. Гэта мог быць або Янка Купала, або… сам Ластоўскі.

Аўтар артыкулу „Сплачвайце доўг“ казаў пра неабходнасць выпрацоўкі філасофскай канцэпцыі беларускага мастацтва, нацыянальных культурных арыенціраў. Акрамя таго, ён з усёй адказнасцю нагадаў літаратарам аб іх найсвяцейшым абавязку — быць *„вучыцелямі і прарокамі*“ свайго народу; сцвярджаў, што беларуская інтэлігенцыя мае поўнае права вымяраць творчасць айчынных паэтаў і празаікаў *„меркай эўропэйскай“*.

2.

Прадузятасць некаторых меркаванняў, выказаных Дубаўцом і Ластоўскім у сваіх артыкулах, спярша прыгаломшвае. Напрыклад, Ластоўскі гняўліва дакараў беларускіх паэтаў і

празаікаў за бясконцыя песімістычныя матывы ў іх творах, за аднастайны „перапеў“ адных і тых жа тэмаў і вобразаў, за тое, што яны быццам не „*выпаўняюць свайго пасланніцтва*“, іншымі словамі, марнуюць божы дар і не клапоцяцца пра стварэнне твораў, роўных лепшым узорам еўрапейскай класікі. Для ілюстрацыі сваёй спрэчнай думкі пра агульны „плаксівы“ настрой беларускай літаратуры Ластоўскі выкарыстоўваў, у прыватнасці, радкі з верша Янкі Купалы „З песень аб сваёй старонцы“, датаванага паэтам… 1905–1907 гадамі!

Невясёлая
старонка
Наша Беларусь:
Людзі — Янка
ды Сымонка,
Птушкі — дрозд
ды гусь.

Што гэтым хацеў сказаць Ластоўскі? Ці не правакацыя — ацэньваць сучасны стан развіцця беларускай літаратуры паводле не найлепшых яе ўзораў пяці-сямігадовай даўніны? Быццам сакратар „Нашай Нівы“, літаратар і эрудыт Вацлаў Ластоўскі не сачыў за беларускім літаратурным працэсам і не ўсведамляў, што на час напісання яго артыкулу беларускае краснае пісьменства дасягнула значных поспехаў. Быццам не чытаў Ластоўскі паэмаў Купалы „Сон на кургане“, „Курган“, яго камедыі „Паўлінка“, пейзажнай, інтымнай, філасофскай лірыкі Багдановіча, Гаруна, Буйлы. Канечне, чытаў, больш за тое, высока цаніў! Менш чым праз восем месяцаў пасля напісання артыкулу „Сплачвайце доўг“ Ластоўскі-крытык з пафасам скажа: „*І мы беларусы унясьлі ужо нашу цэннасьць у агульналюдзскую скарбніцу… мы ужо далі плады*“ (артыкул „Па сваім шляху!“ у „Нашай Ніве“).
Сяргей Дубавец у „ЛіМе“ з не меншай катэгарычнасцю заяўляў: „*Нічога не вылушчыш з кніг Броўкі, Глебкі і нават яшчэ блізкіх Мележа, Танка… Там паўсюль ёсць або няпраўда, або метастазы сатанізму, ачалавечвання бесчалавечнасці. …Раю перачытаць іхнія кнігі. Калі вы самі выбраліся з савецкага кантэксту, з ружовага туману, вам гарантаванае суцэльнае расчараванне*“.

Але ж той, хто ўважліва сочыць за творчасцю Дубаўца, ведае ягонае эсэ „Энігма“, напісанае ў 1993 годзе, у якім ён выказаў адваротную думку пра творчасць Максіма Танка: „…*Танк — не ад д'ябла. У ім ня знойдзеш нічога прынцыпова нездаровага*“. І напрыканцы: „*Недалёкі“ — занадта простая разгадка ягонае таямніцы. Паэт узроўню Купалы й Багдановіча — недалёкі чалавек, — гучыць занадта парадаксальна для дэфініцыі. І таму, думаю, яшчэ не адно пакаленьне будзе шукаць сапраўднага Танка ў ягоных дзёньніках, лістох і вершах, тлумачыць яго й зноў не задавальняцца тлумачэньнем*“. Што прымусіла Дубаўца ў артыкуле „Ружовы туман“ значна спрасціць сваё ранейшае ўзважанае меркаванне?

Верагодна, Ластоўскі і Дубавец гэтак хапілі цераз край у сваіх артыкулах з-за свядомага імкнення распаліць палеміку. І не нудную, сухую, разважлівую, а гарачую, напружаную, як мага больш інтэнсіўную. Вобразна-эмацыйная, „прамоўніцкая“ форма артыкулаў, памножаная на катэгарычнасць меркаваннняў, кранула аўдыторыю, прымусіла многіх узяцца за пяро. Ластоўскі і Дубавец віртуозна дасягнулі мэты, якая апраўдала сродкі: артыкулы „Сплачвайце доўг“ і „Ружовы туман“ прыцягнулі ўвагу грамадскасці, а дыскусіі сталі культурнай падзеяй.

3.

У творчай манеры Ластоўскага і Дубаўца, характары іх публіцыстыкі і крытыкі шмат супольнага. Найперш гэта палымянасць у перадачы думак і пачуццяў. У сваёй публіцыстыцы абодва аўтары ў першую чаргу — змагары, якія з пафасам і энэргіяй адстойваюць уласныя перакананні. (Параўнайце поўныя запалу, кідкія назвы артыкулаў Ластоўскага і Дубаўца: „Па сваім шляху!“ і „Час дзейнічаць!“, „Кудой дарога?..“ і „За што?“, „Літаратарам з кальцом у носе“ і „Папытайся ў ветру“, „Да ўбогіх духам“ і „Вінаватыя ў сваім адчаі“, “Гульня ў „беларусы“” і „Гульня шасцёркамі“.) Уладзімер Конан у артыкуле „Валхвец беларускага фундаменталізму“ ў часопісе „Крыніца“ назваў стыль публіцыстыкі Ластоўскага гарачым, прамоўніцкім, мітынговым. На думку Язэпа Янушкевіча, што напісаў прадмову да „кнігазбораўскага“ тому Ластоўскага, крытыка і публіцыстыка пісьменніка выразна пазнавалася „*бескампраміснасцю,*

баявітасцю і разам з тым шчымлівым пачуццём сыноўняй любові, прагі хутчэй пабачыць родны край і люд не ў рабскім ярме. Колькі творцаў і простых чытачоў закранула яна за жывое!“. Тое самае можна сказаць і пра творчасць галоўнага рэдактара адноўленай у 1991 годзе „Нашай Нівы“, вядомага, паводле выразу Уладзімера Конана, „рыцарскай танальнасцю“ сваіх поглядаў.
У артыкулах „Сплачвайце доўг“ і „Ружовы туман“ „байцоўскія“ рысы творчай манеры Ластоўскага і Дубаўца ўвасобіліся найбольш яскрава. У абодвух матэрыялах гаворка ідзе пра асабістую адказнасць літаратараў перад нацыяй.
Гэтыя невялікія па памеры артыкулы лёгка чытаюцца і гэтак жа лёгка ўспрымаюцца на слых, бо напісаны жывой, даходлівай мовай, не ўтрымліваюць навуковай тэрміналогіі, хоць і тычацца гуманітарных пытанняў.
Абодва аўтары выкладаюць свае думкі страсна, з той розніцай, што Ластоўскі робіць гэта голасна, з імпэтам, а Дубавец — прыглушана, але з непрытоеным гневам. І той, і другі дакарае, заклікае, звяртаецца да аўдыторыі. Ластоўскі (папракаючы беларускіх пісьменнікаў): „*…вы … чаму маўчыцё, калі забіваюць у душах — незапісаных картах, красу, чаму ня вучыце нас любіць і разумець гоман бору, плеск вады ў сонцы, задуму змеркоў, яснату ўсходоў, — чаму не распаляецца душ нашых пажарам любові, ня сыпеця чырвонцоў у жар гэты*?“; Дубавец: „*Натуральнае пытанне — а што ж рабіць з тымі сотнямі літаратараў і дзесяткамі класікаў, якія цалкам упісаліся ў савецкі перыяд? Выбіраць з іхнае творчасці тое, дзе не згадваюцца дыктатары? … Пакінуць усё на водкуп чытачу*?“.

Для абодвух характэрная вобразнасць у выкладанні думак. Ластоўскі іранізуе з тых беларускіх паэтаў і празаікаў, „*каторые (цыбуляй хіба крыху паціраючы вочы) плачуць над доляй селяніна*“; Дубавец дазваляе сабе жорстка казаць, што культура сацрэалізму была „*прадметам сатанісцкага культу*“.
А вось вынікі дыскусій аказаліся розныя. Распачатая Ластоўскім палеміка аб сутнасці, форме і метадах мастацтва, шляхах развіцця нацыянальнай літаратуры прайшла ў зычлівай атмасферы, нягледзячы на з’едліва-іранічны тон артыкулу і крытычныя выпады на адрас літаратараў. Напамін Ластоўскага беларускім пісьменнікам і паэтам аб непадзельнасці

мастацкага і грамадзянскага абавязкаў літаратуры і літаратара, адказнасці за лёс нацыі („*… за вамі, калі вы не апраўдаеця паложэных на вас надзей, народ будзе лічыць доўг і доўг гэты будзе чысьліцца за вамі давеку*“) быў успрыняты імі вельмі сур’ёзна. Так, адзін з апанентаў Ластоўскага, празаік, крытык і публіцыст Мечыслаў Бабровіч у артыкуле „Яшчэ аб сплачваньні доўгу“ пісаў, што „*думкі ягомасьця Верэшчакі* (псеўданім Ластоўскага, якім быў падпісаны „Сплачвайце доўг“. — **Аўт.**), *трэба гэта прызнаць, дужа арыгінальныe і калі іх акуратна выразумець, саўсім справядлівы*“. Да словаў Ластоўскага аб „сплачванні доўгу“ далучыўся Максім Гарэцкі: „*Пісьменьнікі беларускіе! …Шукайце брату свайму дарогу да праўды. І памятайця: ня будзеця вы шукаць яе або станеця дрэнна шукаць, Бог вас пакарае*“.

Увогуле дыскусія 1913 году на старонках „Нашай Нівы“ з усёю пераканаўчасцю дэманструе нам разуменне тагачаснай беларускай крытыкай ходу літаратурнага працэсу і яе жаданне разам з літаратурай шукаць адказы на актуальныя пытанні сучаснасці.

Што тычыцца дыскусіі вакол „Ружовага туману“ Дубаўца, то тут склалася адваротная сітуацыя. Удзельнікі палемікі, паводле словаў Уладзімера Конана, „*ухіліліся ад сутнасці праблемы: замест аналізу феноменаў „савецкая“ альбо „таталітарная“ літаратура абмежаваліся самавыяўленнем, публічнай споведдзю, дэманстрацыяй сваёй „profession de foi“, сваіх уласных каштоўнасцяў. Дэмакрат і хрысціянін Сяргей не любіць таталітарызму і „савецкага кантэксту“ ў грамадстве і літаратуры, а ягоны апанент Валянцін Акудовіч з пафасам нападае на ім жа сканструяваны прывід „камуна-хрысціянства “*“. Гэтае ж заўважыў і Сакрат Яновіч: „*… здзіўляюся, як мала гаворкі пра саму, менавіта, літаратуру нашай нацыі. Спрачаюцца вельмі ж па-савецку, г.зн. не пра галоўнае. Сварацца за другараднае, за нейкія ілюзіі ды грамадскія выдаткі*“.

На адрас Дубаўца пасыпаліся абвінавачванні, прозвы „*блазан на дроце*“, „*трукач*“, „*змагар з таталітарызмам*“ і г.д., што пазней дало Леаніду Галубовічу нагоду зазначыць: „*Адзін нават у экстазе роднага бацьку Дубаўцовага ўспомніў да драбніц — да ўсіх яго былых савецкіх рэгалій і чыноў*“. Многія ўдзельнікі

палемікі вакол „Ружовага туману“ зразумелі правакацыйную сутнасць артыкулу. Але дыскусія не пайшла ў кірунку ацэнкі савецкай літаратурнай спадчыны, а засяродзілася на ацэнцы асобы Дубаўца і стылю дыскусіі, пайшла не ў кірунку галоўнага паслання Дубаўцовага тэксту, а ў кірунку формы гэтага тэксту. Адны ўпарта раілі звярнуць увагу на тое, што Дубавец ужо неаднаразова агучваў пастулаты, выкладзеныя ў „Ружовым тумане“, і прапаноўвалі не звяртаць увагі на аўтара і яго артыкул. Другія віталі намер Дубаўца „наэлектрызаваць“ літаратурную атмасферу. „*Нас увогуле трэба добра трасянуць, каб пачалі разважаць і крыху глядзець перад сабою*“, — адзначыла Лідзія Куратава.

За ўсім гэтым галоўнае пытанне палемікі — пераацэнка творчай спадчыны беларускай савецкай літаратуры — так і не было вырашана. Большасці ўдзельнікаў „лімаўскай“ дыскусіі не хапіла настойлівасці, каб развіць тэзіс Дубаўца аб неадпаведнасці беларускай савецкай культуры нацыянальным інтарэсам нашага народу. Тым самым апаненты Дубаўца прадэманстравалі фактычна сваю вернасць думцы аб вялікіх духоўных здабытках беларускай савецкай літаратуры, яе роўнасці з еўрапейскімі літаратурамі. Яны не лічаць нечым жахлівым практыку камуністычных часоў, калі пісьменнік — прадукт савецкай сацыяльнай інжынерыі — ператвараўся ўва ўласнага цэнзара.

Некаторыя з удзельнікаў дыскусіі вакол „Ружовага туману“ нават спрабавалі запэўніць астатніх у тым, напрыклад, што *„паводле таленту Максім Танк — на ўзроўні сучасных лаўрэатаў Нобелеўскай прэміі, калі не вышэй некаторых з іх. Нават Броўка і Шамякін, не кажучы ўжо пра Куляшова і Панчанку — кожны па-свойму выявіў душу беларусаў“* (Уладзімер Конан).

Для таго каб належным чынам ацаніць унёсак беларускай савецкай літаратуры, вызначыць яе месца і ролю ў развіцці нацыянальнага краснага пісьменства, сёння неабходная аб’ектыўная і поўная „Гісторыя беларускай савецкай літаратуры“ (або, паводле Дубаўца, „Гісторыя таталітарызму ў Беларусі“). Заклікі да яе стварэння ў нашай краіне ўпершыню прагучалі ў 1988 годзе. Аднак калі праз дзесяць гадоў Сяргей Дубавец актуалізаваў праблему і прапанаваў свой варыянт яе рашэння, то ад свайго апанента Алеся Аркуша пачуў, быццам

распачатая ім дыскусія *„не вартая выедзенага яйка“,* бо *„ўсё таталітарнае літаратурнае шалупінне асыплецца, як хвоя з навагодніх ёлак*“. Атрымліваецца, усё за нас вырашыць час. Ці гэта не спроба ўхіліцца ад складанае праблемы?
Відавочна, што пераасэнсаванне вартасцяў беларускай савецкай літаратуры — справа не аднаго году. Аднак да сённяшняга часу дзеля гэтага мала што зроблена. З усіх удзельнікаў палемікі адзін пісьменнік Юры Станкевіч заўважыў, што Дубавец толькі падышоў да праблемы, вырашыць якую магчыма выключна ўсёй грамадой. Аднак апаненты аўтара „Ружовага туману“, быццам будаўнікі Вавілонскай вежы, пачалі гаманіць на розных мовах, перабіваючы адзін аднаго, блытаючыся і шалёна жэстыкулюючы.
У 1913 годзе Ластоўскі ўпэўніўся, што беларускія літаратары гатовыя прыслухоўвацца да думкі крытыкаў і ўсведамляюць сваю нацыянальную місію. У 1998 годзе Дубавец пераканаўся найперш у разгубленасці і раз’яднанасці беларускіх літаратараў, чытачоў штотыднёвіка „Літаратура і мастацтва“, іх няўпэўненасці ў заўтрашнім дні і няздольнасці адэкватна рэагаваць на выклікі сённяшняга дня. Ці мо сапраўды было нешта няслушнае ў ягоным спосабе пастаноўкі пытання? Калі б удзельнікі „лімаўскай“ дыскусіі скарысталі плённы вопыт зычлівай, канструктыўнай палемікі 1913 г. на старонках „Нашай Нівы“, забыліся на асабістыя амбіцыі, адмовіліся ад састарэлых міфаў, выказваліся толькі па галоўным пытанні, цалкам магчыма, што дыскусія не засталася б незавершанай, а яе ўдзельнікі — кожны пры сваіх меркаваннях. Згода, якой удалося дасягнуць 75 гадоў таму, напрыканцы XX стагоддзя пакуль не дасягнута. А значыць, мы бярэм дыскутаваную праблему з сабой у новае тысячагоддзе. Нічога добрага нам гэта не абяцае.

Іншыя выданні, цытаваныя ў артыкуле:
„Літаратура і мастацтва“, 1998–1999.
Вацлаў Ластоўскі. Выбраныя творы. — Менск: Беларускі кнігазбор, 1997.
Леанід Галубовіч. Зацемкі з левай кішэні. — Менск: Эўрофорум, 1998.

Сяргей Дубавец. Дзёньнік прыватнага чалавека. — Менск: Эўрофорум, 1998.

[image]
[image]

Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Максім Маскалёў
Апошняе абнаўленьне: **23-03-2001**
[image]

Віктар Мухін

Анталёгія з прыкметамі мафіёзнасьці

Беларускія пісьменнікі Польшчы. Другая палова XX ст./ Укладальнік Я.Чыквін; Прадмова У.Конана. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2000. — 576 с., іл.

Калі я думаю пра Беларусь, дык думаю пра яе, як пра зямлю — ад Вільні да Пінску, ад Беластоку да Смаленску (няхай Дзяржаўны камітэт у справах друку не падкопваецца), калі я думаю пра Рэспубліку Беларусь, дык думаю пра недаразьвітую форму нацыянальнае дзяржаўнасьці, гэткі гот-дог — маскоўскую сасіску ў беларускай булачцы. Беласточчына, як і іншыя часткі краіны, што не ўвайшлі ў склад „рэспублікі“, — гэта часьціна Беларусі, наша зямля, хоць і ў іншай дзяржаве. Гэткія думкі віравалі ў маёй галаве па праглядзе кнігі „Беларускія пісьменнікі Польшчы. Другая палова XX стагоддзя“, выдадзенай сёлета „Беларускім кнігазборам“. Гэта літаратурная анталёгія, што *„дае магчымасць шматлікім айчынным чытачам пазнаёміцца з 18-цю беларускімі паэтамі і празаікамі, якія жывуць па той бок беларуска-польскай мяжы“*. У зборнік увайшлі тэксты самых розных жанраў і аўтараў: Янкі Жамойціна, Георгія Валкавыцкага, Віктара Шведа, Дзьмітрыя Шатыловіча, Васіля Петручука, Алены Анішэўскай, Яшы Бурша, Алеся Барскага, Міколы Гайдука, Юркі Геніюша, Сакрата

Яновіча, Яна Чыквіна, Уладзімера Гайдука, Надзеі Артымовіч, Зосі Сачко, Міхася Шаховіча, Юр'я Баены й Міры Лукшы.
Што кідаецца ў вочы адразу ж — гэта няроўнасьць кніжнае плошчы, аддадзенае пад кожнага з аўтараў: у аднаго — пара дзясяткаў, у іншага — пад сотню старонак. Не заўсёды ясныя прычыны гэткага разьмеркаваньня: чаму, прыкладам, найвядомейшаму зь беларускіх пісьменьнікаў Польшчы Сакрату Яновічу дасталіся толькі 32 старонкі? З 560 старонак зборніку 250 займаюць споведзі былога СБМаўца, удзельніка Другога Ўсебеларускага Кангрэсу і сталінскага вязьня Янкі Жамойціна й рэдактара беластоцкай „Нівы" Георгія Валкавыцкага — успаміны пра маладыя гады ды змагарныя дарогі.
Выдадзена кніга не як сэрыйнае выданьне „Залатое бібліятэкі Беларусі", але ў чырвонай вокладцы, падобнай да сэрыйнае. Як сказаў у прыватнай размове выканаўчы дырэктар „Беларускага кнігазбору" Генадзь Вінярскі: „Яна не дацягвае да сэрыі". Чаму ж? — падумалася мне. — Арэшчыха „дацягнула" да сэрыі, а Яновіч, Чыквін і яшчэ шаснаццаць „беларускіх паэтаў і празаікаў, якія жывуць па той бок беларуска-польскай мяжы", „не дацягнулі"?.. Дапамагае паглыбіцца ў разуменьне гэтага казусу прадмова да кнігі, напісаная доктарам філязафічных навук Уладзімерам Конанам.

Даўно заўважана — павевы „перабудовы", вяртаньне „тарашкевіцы", здабыцьцё незалежнасьці разьняволілі беларускую мову, размываючы савецкія догмы. Але часта несавецкія формы мяшаюцца з савецкімі, блытаючы чытачоў і разбураючы ўсякі закон і лад у мове. На жаль, і гэтае выданьне паважанага „Кнігазбору" зрабіла свой унёсак у „хто как хаціт, той так і гаварыт". „*Раней гарады былі цэнтрамі культуры, але ў іншым сэнсе. Горад (беларускае* мейсца*, польскае* място*, літоўскае* места*) стваraўся на прынцып сельскай абшчыны, яго прыкметай была „агрaда" (адсюль — горад), сцены, што сімвалізавалі аседласць чалавека, яго адзінства з зямлёю, краем*", — пачынае свой уступ Уладзімер Конан. Сказ цьмяны, стылістычна непрычасаны, але самая прыкрая памылка — тое, што аўтар (і рэдактар Міхась Скобла, і карэктарка Ларыса Гедзімін) паблытаў слова *мейсца* (іншы варыянт слова *месца,* па-польску *miejsce*), зь *местам,* сынонімам слова *горад* (па-

польску *miasto*). (У Багушэвіча: „Не люблю я места, па-расейску — горад“). Зрэшты, няясна, навошта шукаць „гораду“ нейкія „нацыяналістычныя“ адпаведнікі, калі побач ужываюцца „абшчына“ (без тлумачэньня, што па-беларуску гэта будзе „грамада“), „ограда“ (па-беларуску „агароджа“), „аседласць“ (у клясычнай беларускай мове „аселасьць“), „сьцены“ (у сэнсе гарадзкіх умацаваньняў звычайна ўжываюць слова „муры“). Далей — балей: *„…Не хацелася б быць нядобрым прарокам, але здаецца, што ў сённяшнім „дынамічным“ і „крызісна эканамічным“ свеце такі род паэтаў вымірае, а калі захаваўся (на жаль, з паніжанай творчай энергіяй), то хіба што ў славянскім свеце (накшталт зуброў і куланаў, якіх мне пашчасціла сустрэць на загонах Белавежскай пушчы)“*. Вось так заўжды. Пачынаецца з моўнае неахайнасьці, а канчаецца апалёгіяй славянскае расы. *„Трэба ўжо сёння пачаць грунтоўнае даследаванне беларускай літаратуры і культуры на Беласточчыне і ў рэгіёнах „беларускага рассеяння““*, але, замест таго каб сваім невялічкім уступным словам „пачаць“, спадар Конан добра апісвае зубра, *„элітнага волата, якога ў натуры раней не бачыў“*, *„унікальную з’яву ў Польшчы — штогадовае выданне двух-трох кніжак Бібліятэчкі Беларускага літаратурнага аб’яднання „Белавежа““* (пакуль слова „кніжка“ яшчэ жаночага роду, афіцыйным правапісам трэба пісаць „дзвюх-трох кніжак“), а пра літаратуру ды літаратараў толькі адпіскі: *„Бясспрэчным прызваннем Міколы Гайдука (ён вучыўся ў 50-я гады на філалагічным факультэце Белдзяржуніверсітэта) з’яўляецца гістарычная проза“*. Або: *„Да цікавай, яшчэ „нашаніўскай“ разнавіднасці навелістыкі звярнулася журналістка з „Нівы“ Міра Лукша. Гэта элегічныя апавяданні пра беларускія народныя тыпы“* — і гэтак далей у тым самым духу. Няўжо гэта кон наш — ведаць пра „беларускіх пісьменнікаў Польшчы“ адно, дзе яны вучыліся й да якое „разнавіднасці“ (а па-беларуску лепш было б — адмены) навэлістыкі належаць?

Трохі болей, як пра іншых, спадар Конан піша пра Яна Чыквіна: ён і „старшыня літаратурнага аб’яднання „Белавежа““, і сябар, і ўкладальнік гэтае кнігі, і „закліканы творчым лёсам аб’яднаць вельмі неадназначны літаратурны рух на Беласточчыне“, і „ўзяў на сябе нялёгкую ношку літаратурнага рэдактара „Бібліятэчкі““. Дарэчы, пра яго Ўладзімер Конан піша ў пару

разоў болей, чым зноў жа пра найслявуцейшага (што нам гэтая мэдыйная шуміха?) літаратара Беласточчыны Сакрата Яновіча — пра апошняга ўсяго шэсьць радкоў. Але чым жа тады адметны гэны Яновіч, што яго ведаюць ня толькі на Беласточчыне, але і на Меншчыне, і на Віленшчыне, і Нью-Ёрччыне?

А можа, гэтае ўзьвелічэньне адных і маўчаньне пра другіх ёсьць праяваю групаўшчыны або, інакш кажучы, літаратурнае мафіёзнасьці? *„Беларуская літаратура ў Польшчы мае сваю паўвекавую гісторыю, склалася свая мастацкая традыцыя. Склаліся тры эстэтычныя плыні: традыцыйная нацыянальна-адраджэнцкая, мадэрнісцкая і постмадэрнісцкая. Урэшце, чытачы самі пераканаюцца ў гэтым“* (с. 10) — заканчвае свае ўводзіны ў творчасьць 18 беларускіх літаратараў Польшчы Ўладзімер Конан. (Ізноў мова: нарматыўныя слоўнікі настойліва раяць пісаць „адраджэнскі“. Няма, зрэшты, нічога дзіўнага, што спсп. Конан, Скобла і Гедзімін паблыталі, бо тыя ж слоўнікі прапануюць напісаньне слова „паўстанцкі“ праз „ц“.) Што ні сказ, то пытаньні. Што такое „паўвекавая гісторыя беларускай літаратуры ў Польшчы“? Летась у Беластоку выйшла кніга „Вяртаньне да сваіх“ — паэтычныя творы трох заходнебеларускіх паэтаў, якія пісалі перад вайной і ў часе нямецкай акупацыі і больш вядомыя ў якасьці палітычных дзеячаў: Станіслава Грынкевіча, Франука Грышкевіча і Ўладзіслава Казлоўшчыка. Творчасьць гэтых ураджэнцаў Беласточчыны нельга, выходзіць, залічыць да літаратуры Польшчы. А калі разглядаць творчасьць Натальлі Арсеньневай, Максіма Танка, Ларысы Геніюш, Хведара Ільляшэвіча, Піліпа Пестрака неадлучна ад беларускіх савецкіх пісьменьнікаў даваеннага часу, дык чаму трэба адмяжоўваць паваенных беластоцкіх літаратараў ад савецкіх паваенных? Карацей, ёсьць над чым падумаць.

Уладзімер Конан сьцьвярджае ў прадмове, што ў беларускай літаратуры Беласточчыны „склаліся тры эстэтычныя плыні: традыцыйная нацыянальна-адраджэнцкая, мадэрнісцкая і постмадэрнісцкая“, але ўкладальнік зборніка Ян Чыквін „падвёў“ свайго калегу: няма абяцаных постмадэрністаў і мадэрністаў. Ці, можа, аўтар прадмовы залічае ў постмадэрністы Зосю Сачко, якая піша дыялектам свае вёскі?

Праўда, спадар Конан паўсловам згадвае, што сярод першых кніжак „Бібліятэчкі „Белавежы““ быў *„постмадэрнісцкі зборнік вершаў Надзеі Артымовіч „Сезон у белых пейзажах““*. Тады неразьвязанаю застаецца праблема, чым ёсьць постмадэрнізм зь ягонага гледзішча, зважаючы на модную цяпер тэндэнцыю называць кожную нетрадыцыйную для беларускае літаратуры форму мастацкага твору постмадэрнісцкаю.
Цікавае іншае сьцьверджаньне Ўладзімера Конана: *„Паэзія і, шырэй, літаратура, мастацтва, філасофія, культура страчваюць сваё духоўнае прызначэнне, сваю прарочую місію, якую яны выконвалі, пачынаючы з біблейскіх часоў і, пазней, у класічную эпоху“*. Літаратура не магла (і ня можа) выконваць сваю „прарочую місію“ ў залежнасьці ад эпохі. Калі эпоха дае прарокаў, дык яны прымаюцца ці не прымаюцца „масамі“, але прарокамі застаюцца незалежна ад стаўленьня да іх. Бальшыня прарокаў заўжды былі выгнанцамі, адрынутымі грамадзтвам. Гэта найлепей пацьвярджае гісторыя беларускае літаратуры. І калі да пэўных прэтэндэнтаў на Прарокаў паўстаюць прэтэнзіі, дык ім застаецца суцяшацца надзеяю на тое, што гісторыя ўсё расставіць па сваіх месцах. Толькі бясконцы плач пра мову й дзяржаву ёсьць не прароцтвам, а сьведчаньнем слабасьці й няздатнасьці зьмяняць сябе й навакольле. А ці ня гэткую „прарочую місію“ мае на ўвазе доктар філязафічных навук Уладзімер Конан у сваіх прасякнутых катастрафізмам радкох?

З гэтага самага шэрагу іншае выказваньне з прадмовы, што, маўляў, *„мастацтва… страчвае быційную повязь з нацыяй, народам, гэта значыць — з вечнасцю“. „Паміж еўрапейскім і славянскім масівамі згубілася ў шматмоўным літаратурным моры зялёная беларуская выспа…“* — піша Ўладзімер Конан пра беластоцкую беларускую літаратуру. Ну, дзякуй Вам: значыцца, Польшча — „еўрапейская“, а Беларусь — „славянская“? Ад гэтых радкоў становіцца нудна: як жа мы ўсе падпалі пад уплыў афіцыйнае прапаганды пра сінявокую Беларусь, заціснутую амаль з усіх бакоў у „брудных натаўскіх лапах“, што імкнуцца ня менш „бруднымі лапамі“ мясцовых „эўрапейцаў“ зацягнуць нашу славянскую Бацькаўшчыну ў пашчу Эўропы, Польшчы, NATO, ну й Амэрыкі. Як пісаў у 1844 годзе чэх Карал Гаўлічак, расейцы любяць называць усё расейскае славянскім, каб пасьля ўсё славянскае назваць

расейскім. Але беларусы, мяшаючыся ў гэтыя славянскія гульні, заўсёды калі не аказваюцца, дык выглядаюць дурнямі. *„Гісторыкі і крытыкі… яе* (беластоцкую беларускую літаратуру — *В.М.*) *чамусьці абміналі“*. Зусім не „чамусьці“. Апроч „жалезнай заслоны“ між сацыялістычным і капіталістычным лягерамі, існавала яшчэ адна заслона між „нутраной імпэрыяй“ і „вонкавай імпэрыяй“, Савецкім Саюзам і „братнімі краінамі“. Прычым як рэальная мяжа між Беларусяй і Польшчай ахоўвалася куды мацней, чымся мяжа між Вугоршчынай і Аўстрыяй, так і нябачная „жалезная заслона“ тутака была куды шчыльнейшая. Бо краіны „сацлягеру“ дапускалі ў сябе зашмат вольнасьцяў, бацылам якіх пільная ідэалягічная варта не магла дазволіць пранікнуць у „здаровы“ савецкі арганізм. Менавіта таму любыя кантакты зь беларусамі Беласточчыны абмяжоўваліся — ня толькі літаратурныя, але і асабістыя. Ведалі, каго баяцца: варта было Сакрату Яновічу пабываць у Менску на мяжы 80-х, як ён адразу вывез айцу Надсану ў Лёндан крамольныя творы беларускіх мастакоў-нацыяналістаў. Нізкая самаацэнка беларусаў, недафармаванасьць нашай нацыі, русіфікацыя з адзінкавымі выпадкамі паўстаньня супраць лінгвацыду й этнацыду ў савецкай Беларусі, прыстасавальніцкая сьведамасьць балышыні беларускіх літаратараў савецкае пары, іх ператварэньне ў пасіўных сьведак злачынстваў рэжыму ў выніку далі тое, што маем. Выняткі былі, але Караткевіч, Быкаў ды яшчэ колькі „бунтароў“ хіба маглі нешта зьмяніць?

„Чытачы, якія не здрадзілі беларускай літаратуры (а такія, здаецца, усё яшчэ ёсць)“ чакаюць нечага большага за бедную моваю й вобразамі беларускую „літаратуру другое паловы XX стагодзьдзя“, прасейваную праз густае сіта літаратурнае мафіі, што і па той, і па гэты бок беларуска-польскае мяжы заўсёды дзейнічае аднолькавым мэтадам. Каб не заўважылі ўласнай лянотнасьці розуму, мяшай у адну кучу ўсіх і ўсё, паэтаў і празаікаў, мэмуары і дыялекты, геніяў і графаманаў. Няхай гэты таленавіты, а гэны — графаман, але ўсё адно атрымаюць пароўну ад агульнага пірага. Уявеце сабе Васіля Быкава й бум-бам-літаўца пад аднэю вокладкаю ў кнізе „Беларускія пісьменнікі Віцебшчыны“. Скуль жа возьмуцца тады Прарокі, калі яны ляжаць пад „трупамі“ няздар?

„З 1956-га года выдаецца штотыднёвік „Ніва“. З-за нейкіх бюракратычных зачэпак газета часта не даходзіць да нашага чытача“, — піша з падтэкстам Уладзімер Конан, а сам, напэўна, думае пра іншае. А „іншага“ хіба не стае сьмеласьці выказаць, бо „бюракратычныя зачэпкі“ — ня што іншае, як адмысловая дзяржаўная палітыка. „Часта“ (а калі быць дакладным, дык усе апошнія восем гадоў) падпісацца можна толькі на расейскія ды казахскія газэты й часапісы, але не на польскія, латыскія ды іншыя „варожыя“. Рынак адкрыты для расейскае прэсы й закрыты для ўсіх іншых, думаецца, невыпадкова. *„Мабыць, справу гэтую паправяць Міжнароднае аб’яднанне беларусаў „Бацькаўшчына“ і Міжнародная асацыяцыя беларусістаў. Але яны не маюць дастатковай фінансавай базы, могуць вырашыць гэтую праблему толькі пры падтрымцы дзяржаўных устаноў…“*, — сам у сваіх словах сумняецца прафэсар Конан. Ад гэных дзяржаўных устаноў, спадарства, не прыйджэш нічога, апроч якога палкоўніка „для кантролю гаспадарча-фінансавае дзейнасьці“ і пагромнікаў са свастыкамі на рукавох, навучаных на спартовай базе Міністэрства абароны.

Дарэчы, сам назоў уступнага слова — „Белая вежа літаратуры“ — не зусім карэктны. Вядома, што Камянецкую вежу пачалі называць Белаю толькі пасьля таго, як расейскія акупацыйныя ўлады пабялілі яе (хоць гэткаю яна трывала нядоўга — расейская пабелка аблушчылася), а Белавежа — гэта мястэчка ў Польшчы, у пушчы, недалёка ад дзяржаўнае мяжы Польшчы й Беларусі. Таму, нават каб усе „беларускія пісьменьнікі Польшчы“ жылі ў Белавежы, шукаць аналёгіяў з Камянецкаю (ці хай сабе й „Белаю“) вежаю было б не зусім дарэчна.

Гэтак, пачынаючы ад прадмовы, непадрыхтаваны чытач трапляе ў раку плыняў і віроў, сумневаў ды трывог. Дзе ж кантэкст, дзе ж гіерархія, дзе канон? Дзе хоць слова пра гарачыя дыскусіі, што неаднойчы разгараліся, прыкладам, вакол польскамоўнай кнігі Сакрата Яновіча „Беларусь, Беларусь…“ і працягваюць бушаваць на Беласточчыне?

Дый зноў пра мову. Зося Сачко піша вершы на дыялекце роднае вёскі Волька Бельскага павету. Мова тэй вёскі не беларуская, але й не ўкраінская — адна зь пераходных гаворак. Творчасьць Зосі Сачко — адметная зьява, чаму ж ёй не аддадзена

адмысловае ўвагі ў прадмове? Дыялектная літаратура, можна падазраваць, — важная тэма для Беласточчыны.
Гэтыя замоўчваньні й недагаворваньні і робяць літаратуру Беласточчыны — „сякой-такой“, „славянскай“ і „здраджанай“ — таму й не ў „залатой сэрыі“. Блізка, але „не дацягвае“. Пісьменьнікі, грамадзкія дзеячы, мастакі Віленшчыны, Беласточчыны беларускімі былі, ёсьць і будуць, калі твораць па-беларуску й дзеля Беларусі працуюць. Але калі яны пачынаюць мысьліць стандартамі нацменшасьці, дык ператвараюцца ў падвойных правінцыялаў.
Адной з пазыцыяў выдавецкага пляну „Беларускага кнігазбору“ быў пункт — выданьне кнігі „Пісьменнікі Беласточчыны“. Ня скора яна выйдзе, але ў гэтым разе — лепш ня скора, але дбайна і грунтоўна: без адхіленьняў у прыродазнаўства й „плач вечны аб старонцы“, затое з экскурсамі пра славутую друкарню ў Заблудаве, „Мужыцкую праўду“, пакуль малавядомых шырокаму колу чытачоў паэтаў міжваеннае й ваеннае пары з-пад Беластоку, Гарадку й Супрасьлю — гэта ўсё Беласточчына, *terra incognita*, адрэзаная мяжою заходняя часьціна Беларусі.

[image]
[image]

№ 6 (11) – 2000
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Вадзім Каранковіч
Апошняе абнаўленьне: **6-11-2000**
[image]